Ба69129

# КРЫМІНАЛЬНА-ПРАЦЭСУАЛЬНЫ КОДЭКС БЕЛАРУСКАЙ ССР

Бл 69129.

*Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!*

# КРЫМІНАЛЬНА-ПРАЦЭСУАЛЬНЫ КОДЭКС БЕЛАРУСКАЙ ССР

(на беларускай і рускай мовах)

Бл 69129
Бел. аддзел
1994 г.

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БССР
Рэдакцыя навукова-тэхнічнай літаратуры
МІНСК 1961

34 С 65
Б 43

25. 11 4. 2009

Б.а 69129

*Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!*

# КРЫМІНАЛЬНА-ПРАЦЭСУАЛЬНЫ КОДЭКС
## БЕЛАРУСКАЙ ССР

БССР імені Леніна

# ЗАКОН
## АБ ЗАЦВЯРДЖЭННІ КРЫМІНАЛЬНА-ПРАЦЭСУАЛЬНАГА КОДЭКСА БЕЛАРУСКАЙ ССР

Вярхоўны Савет Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі **пастанаўляе:**

**Артыкул 1.** Зацвердзіць Крымінальна-працэсуальны кодэкс Беларускай ССР і ўвесці яго ў дзеянне з 1 красавіка 1961 года.

**Артыкул 2.** Даручыць Прэзідыуму Вярхоўнага Савета Беларускай ССР устанавіць парадак увядзення ў дзеянне Крымінальна-працэсуальнага кодэкса Беларускай ССР і зацвердзіць пералік заканадаўчых актаў Беларускай ССР, якія страчваюць сілу ў сувязі з увядзеннем Крымінальна-працэсуальнага кодэкса Беларускай ССР у дзеянне.

**Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР**
**В. КАЗЛОЎ.**

**Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР**
**Д. ЛУКАШЭВІЧ.**

*29 снежня 1960 года, гор. Мінск.*

# КРЫМІНАЛЬНА-ПРАЦЭСУАЛЬНЫ КОДЭКС БЕЛАРУСКАЙ ССР

## РАЗДЗЕЛ ПЕРШЫ

## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

### ГЛАВА 1

### АСНОЎНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

Артыкул 1. **Заканадаўства аб крымінальным судаводстве**

Парадак судаводства па крымінальных справах на тэрыторыі Беларускай ССР вызначаецца Асновамі крымінальнага судаводства Саюза ССР і саюзных рэспублік і выдаваемымі ў адпаведнасці з імі іншымі законамі Саюза ССР і Крымінальна-працэсуальным кодэксам Беларускай ССР.

Пры судаводстве па крымінальнай справе прымяняецца крымінальна-працэсуальны закон, які дзейнічае адпаведна ў час дазнання, папярэдняга следства альбо разгляду справы судом.

Устаноўлены крымінальна-працэсуальнымі законамі парадак судаводства з'яўляецца адзіным і абавязковым па ўсіх крымінальных справах і для ўсіх судоў, органаў пракуратуры, папярэдняга следства і дазнання.

Артыкул 2. **Задачы крымінальнага судаводства**

Задачамі савецкага крымінальнага судаводства з'яўляецца хуткае і поўнае раскрыццё злачынстваў, выкрыццё вінаватых і забеспячэнне правільнага прымянення закону з тым,

каб кожны, хто ўчыніў злачынства, быў падвергнуты справядліваму пакаранню і ні адзін невінаваты не быў прыцягнуты да крымінальнай адказнасці і асуджаны.

Крымінальнае судаводства павінна садзейнічаць умацаванню сацыялістычнай законнасці, папярэджанню і выкараненню злачынстваў, выхаванню грамадзян у духу няўхільнага выканання савецкіх законаў і павагі правіл сацыялістычнага супольнага жыцця.

Артыкул 3. **Абавязак узбуджэння крымінальнай справы і раскрыцця злачынства**

Суд, пракурор, следчы і орган дазнання абавязаны ў межах сваёй кампетэнцыі ўзбудзіць крымінальную справу ў кожным выпадку выяўлення прызнакаў злачынства, прыняць усе прадугледжаныя законам меры да ўстанаўлення падзеі злачынства, асоб, вінаватых ва ўчыненні злачынства, і да іх пакарання.

Артыкул 4. **Недапушчальнасць прыцягнення ў якасці абвінавачваемага інакш як на падставах і ў парадку, устаноўленых законам**

Ніхто не можа быць прыцягнуты ў якасці абвінавачваемага інакш як на падставах і ў парадку, устаноўленых законам.

Артыкул 5. **Акалічнасці, якія выключаюць судаводства па крымінальнай справе**

Крымінальная справа не можа быць узбуджана, а ўзбуджаная справа падлягае спыненню:

1) за адсутнасцю падзеі злачынства;

2) за адсутнасцю ў дзеянні складу злачынства;

3) з прычыны заканчэння тэрмінаў даўнасці;

4) з прычыны акту амністыі, калі ён выключае ўжыванне пакарання за ўчыненае дзеянне, а таксама з прычыны памілавання асобных людзей;

5) у адносінах да асобы, якая не дасягнула да моманту ўчынення грамадска небяспечнага дзеяння ўзросту, пасля дасягнення якога, згодна з законам, магчыма крымінальная адказнасць;

6) за прымірэннем пацярпеўшага з абвінавачваемым па справах, узбуджаемых не інакш як па скарзе пацярпеўшага,

акрамя выпадкаў, прадугледжаных часткамі другой і трэцяй артыкула 106 гэтага Кодэкса;

7) за адсутнасцю скаргі пацярпеўшага, калі справа можа быць узбуджана не інакш як па яго скарзе, акрамя выпадкаў, прадугледжаных часткай трэцяй артыкула 106 гэтага Кодэкса, калі пракурору дадзена права ўзбуджаць справу і пры адсутнасці скаргі пацярпеўшага;

8) у адносінах да памёршага, за выключэннем выпадкаў, калі судаводства па справе неабходна для рэабілітацыі памёршага або аднаўлення справы ў адносінах да іншых асоб па новаадкрытых акалічнасцях;

9) у адносінах да асобы, аб якой ёсць па таму ж абвінавачанню прыгавор суда, што ўвайшоў у законную сілу, альбо вызначэнне ці пастанова суда аб спыненні справы;

10) у адносінах да асобы, аб якой ёсць неадмененая пастанова органа дазнання, следчага, пракурора аб спыненні справы па таму ж абвінавачанню, акрамя выпадкаў, прадугледжаных артыкуламі 255 і 256 гэтага Кодэкса.

Калі акалічнасці, указаныя ў пунктах 1, 2, 3 і 4 гэтага артыкула, выяўляюцца ў стадыі судовага разбору, суд даводзіць разбор справы да канца і пастанаўляе апраўдальны прыгавор — у выпадках, прадугледжаных пунктамі 1 і 2, або абвінаваўчы прыгавор з вызваленнем асуджанага ад пакарання — у выпадках, прадугледжаных пунктамі 3 і 4.

Спыненне справы па падставах, указаных у пунктах 3 і 4 гэтага артыкула, не дапускаецца, калі абвінавачваемы супраць гэтага пярэчыць. У гэтым выпадку вядзенне справы працягваецца ў звычайным парадку.

Артыкул 6. **Накіраванне матэрыялаў без узбуджэння крымінальнай справы для прымянення мер грамадскага ўздзеяння**

У выпадку ўчынення асобай малазначнага злачынства або злачынства, якое не прадстаўляе вялікай грамадскай небяспекі, калі факт злачынства відавочны, а асоба, што яго ўчыніла, можа быць выпраўлена мерамі грамадскага ўздзеяння, суд, пракурор, а таксама следчы і орган дазнання, са згоды пракурора, мае права, не ўзбуджаючы крымінальнай справы, перадаць матэрыялы на разгляд таварыскага суда або Камісіі па справах непаўналетніх альбо перадаць вінаватага на парукі калектыву працоўных ці грамадскай арганізацыі для перавыхавання і выпраўлення, калі яны аб гэтым хадайнічаюць.

Артыкул 7. **Недатыкальнасць асобы**

Ніхто не можа быць падвергнуты арышту інакш як па пастанове суда або з санкцыі пракурора.

Пракурор абавязан неадкладна вызваліць усякага незаконна пазбаўленага волі або ўтрымліваемага пад вартай звыш тэрміну, прадугледжанага законам або судовым прыгаворам.

Артыкул 8. **Ажыццяўленне правасуддзя толькі судом**

Правасуддзе па крымінальных справах ажыццяўляецца толькі судом. Ніхто не можа быць прызнаны вінаватым ва ўчыненні злачынства і падвергнуты крымінальнаму пакаранню інакш як па прыгавору суда.

Артыкул 9. **Ажыццяўленне правасуддзя на асновах роўнасці грамадзян перад законам і судом**

Правасуддзе па крымінальных справах ажыццяўляецца на асновах роўнасці перад законам і судом усіх грамадзян, незалежна ад іх сацыяльнага, маёмаснага і службовага становішча, нацыянальнай і расавай прыналежнасці, веравызнання.

Артыкул 10. **Удзел народных засядацеляў і калегіяльнасць у разглядзе спраў**

Крымінальныя справы ва ўсіх судах разглядаюцца суддзямі і народнымі засядацелямі, выбранымі ва ўстаноўленым законам парадку.

Разгляд крымінальных спраў ва ўсіх судах у першай інстанцыі праводзіцца ў складзе суддзі і двух народных засядацеляў.

Народныя засядацелі карыстаюцца роўнымі правамі са старшынствуючым у судовым пасяджэнні ў вырашэнні ўсіх пытанняў, якія ўзнікаюць пры разглядзе справы і пастанаўленні прыгавору.

Разгляд справы ў касацыйным парадку ажыццяўляецца судамі ў складзе трох членаў суда, а ў парадку судовага нагляду — у складзе не менш трох членаў суда.

Артыкул 11. **Незалежнасць суддзяў і падпарадкаванне іх толькі закону**

Пры ажыццяўленні правасуддзя па крымінальных справах суддзі і народныя засядацелі незалежныя і падпарадкоў-

ваюцца толькі закону. Суддзі і народныя засядацелі вырашаюць крымінальныя справы на аснове закону, у адпаведнасці з сацыялістычнай правасвядомасцю, ва ўмовах, якія выключаюць пабочнае ўздзеянне на суддзяў.

Артыкул 12. **Мова, на якой вядзецца судаводства**

Судаводства ў Беларускай ССР вядзецца на беларускай або рускай мовах.

Асобам, што ўдзельнічаюць у справе, не валодаючым мовай, на якой вядзецца судаводства, забяспечваецца права рабіць заявы, даваць паказанні, выступаць на судзе і заяўляць хадайніцтвы на роднай мове, а таксама карыстацца паслугамі перакладчыка ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

Следчыя і судовыя дакументы, у адпаведнасці з устаноўленым гэтым Кодэксам парадкам, уручаюцца абвінавачваемаму ў перакладзе на яго родную мову або на іншую мову, якой ён валодае.

Артыкул 13. **Публічнасць судовага разбору**

Разбор спраў ва ўсіх судах адкрыты, за выключэннем выпадкаў, калі гэта супярэчыць інтарэсам аховы дзяржаўнай тайны.

Закрыты судовы разбор, акрамя таго, дапускаецца па матываванаму вызначэнню суда па справах аб злачынствах асоб, якія не дасягнулі шаснаццацігадовага ўзросту, па справах аб палавых злачынствах, а таксама па іншых справах з мэтай папярэджання разгалашэння звестак аб інтымных баках жыцця асоб, якія ўдзельнічаюць у справе.

Прыгаворы судоў ва ўсіх выпадках абвяшчаюцца публічна.

Артыкул 14. **Забеспячэнне абвінавачваемаму права на абарону**

Абвінавачваемы мае права на абарону.

Суд, пракурор, следчы і асоба, якая праводзіць дазнанне, абавязаны забяспечыць абвінавачваемаму магчымасць абараняцца ўстаноўленымі законам сродкамі і спосабамі ад прад'яўленага яму абвінавачання і забяспечыць ахову яго асабістых і маёмасных правоў.

Артыкул 15. **Усебаковае, поўнае і аб'ектыўнае даследаванне акалічнасцей справы**

Суд, пракурор, следчы і асоба, якая праводзіць дазнанне, абавязаны прыняць усе прадугледжаныя законам меры для

ўсебаковага, поўнага і аб'ектыўнага даследавання акалічнасцей справы, выявіць як выкрываючыя, так і апраўдваючыя абвінавачваемага, а таксама абцяжваючыя і змякчаючыя яго віну акалічнасці.

Суд, пракурор, следчы і асоба, якая праводзіць дазнанне, не маюць права перакладаць абавязак даказвання на абвінавачваемага.

Забараняецца дамагацца паказанняў абвінавачваемага шляхам насілля, пагроз і іншых незаконных мер.

### Артыкул 16. **Адвод суддзі, пракурора і іншых удзельнікаў працэсу**

Суддзя, народны засядацель, пракурор, следчы, асоба, якая праводзіць дазнанне, сакратар судовага пасяджэння, эксперт і перакладчык не могуць прымаць удзел у судаводстве па крымінальнай справе і падлягаюць адводу, калі яны асабіста, прама або ўскосна, зацікаўлены ў гэтай справе.

### Артыкул 17. **Нагляд вышэйстаячых судоў за судовай дзейнасцю**

У адпаведнасці з артыкулам 19 Асноў крымінальнага судаводства Саюза ССР і саюзных рэспублік нагляд за судовай дзейнасцю судовых органаў Саюза ССР, якія дзейнічаюць на тэрыторыі Беларускай ССР, а таксама судовых органаў Беларускай ССР у межах, устаноўленых законам, ажыццяўляе Вярхоўны Суд СССР.

Вярхоўны Суд Беларускай ССР ажыццяўляе нагляд за судовай дзейнасцю ўсіх судовых органаў Беларускай ССР.

Абласныя суды ажыццяўляюць нагляд за судовай дзейнасцю раённых (гарадскіх) народных судоў данай вобласці, горада.

### Артыкул 18. **Пракурорскі нагляд у крымінальным судаводстве**

У адпаведнасці з артыкулам 20 Асноў крымінальнага судаводства Саюза ССР і саюзных рэспублік:

Нагляд за дакладным выкананнем законаў Саюза ССР і законаў Беларускай ССР у крымінальным судаводстве ажыццяўляецца Генеральным Пракурорам СССР як непасрэдна, так і праз Пракурора Беларускай ССР і іншых падпарадкаваных яму пракурораў.

Пракурор абавязан ва ўсіх стадыях крымінальнага судаводства своечасова прымаць прадугледжаныя законам меры

да ліквідацыі ўсякіх парушэнняў закону, ад каго б гэтыя парушэнні ні зыходзілі.

Свае паўнамоцтвы ў крымінальным судаводстве пракурор ажыццяўляе незалежна ад якіх бы там ні было органаў і службовых асоб, падпарадкоўваючыся толькі закону і кіруючыся ўказаннямі Генеральнага Пракурора СССР.

Пастановы пракурора, вынесеныя ў адпаведнасці з законам, абавязковыя для выканання ўсімі ўстановамі, прадпрыемствамі, арганізацыямі, службовымі асобамі і грамадзянамі.

Артыкул 19. **Парадак зносін судоў, пракурораў, следчых і органаў дазнання з адпаведнымі органамі іншых саюзных рэспублік**

Пры неабходнасці выканання асобных следчых дзеянняў або прыняцця вышукных мер на тэрыторыі іншых саюзных рэспублік пракуроры, следчыя і органы дазнання па справах, якія знаходзяцца ў іх вядзенні, непасрэдна звязваюцца з адпаведнымі органамі іншых саюзных рэспублік.

Пракуроры, следчыя і органы дазнання Беларускай ССР абавязаны ў межах сваёй кампетэнцыі выконваць даручэнні адпаведных органаў іншых саюзных рэспублік.

Пры неабходнасці перадачы крымінальнай справы ў орган папярэдняга следства, дазнання або суд іншай саюзнай рэспублікі справа накіроўваецца адпаведна праз Пракурора Беларускай ССР або Старшыню Вярхоўнага Суда Беларускай ССР.

Артыкул 20. **Парадак зносін судоў, пракурораў, следчых і органаў дазнання з адпаведнымі ўстановамі замежных дзяржаў**

Парадак зносін судоў, пракурораў, следчых і органаў дазнання з адпаведнымі ўстановамі замежных дзяржаў, а таксама парадак выканання даручэнняў апошніх вызначаецца заканадаўствам Саюза ССР і Беларускай ССР і міжнароднымі дагаворамі, заключанымі СССР і Беларускай ССР з адпаведнай дзяржавай.

Артыкул 21. **Дзеянне крымінальна-працэсуальнага закону ў адносінах да грамадзян замежных дзяржаў і асоб без грамадзянства**

Судаводства па справах аб злачынствах, учыненых грамадзянамі замежных дзяржаў і асобамі без грамадзянства, вядзецца на тэрыторыі Беларускай ССР у адпаведнасці з правіламі гэтага Кодэкса.

У адносінах да асоб, якія маюць права дыпламатычнай

недатыкальнасці, працэсуальныя дзеянні, прадугледжаныя гэтым Кодэксам, праводзяцца толькі па іх просьбе або з іх згоды. Згода на правядзенне гэтых дзеянняў атрымліваецца праз Міністэрства замежных спраў.

Артыкул 22. **Растлумачэнне некаторых назваў, якія ўжываюцца ў гэтым Кодэксе**

Назвы, якія ўжываюцца ў гэтым Кодэксе, маюць наступнае значэнне:

1) «Суд» — Вярхоўны Суд СССР, Вярхоўны Суд Беларускай ССР, абласныя суды, раённыя (гарадскія) народныя суды, ваенныя трыбуналы;

2) «Суд першай інстанцыі» — суд, правамоцны пастанавіць прыгавор па справе;

3) «Касацыйная інстанцыя» — суд, які разглядае ў касацыйным парадку справы па скаргах і пратэстах на прыгаворы і вызначэнні суда першай інстанцыі і пастановы суддзі, што не ўвайшлі ў законную сілу;

4) «Наглядная інстанцыя» — суд, які разглядае ў парадку судовага нагляду справы па пратэстах на прыгаворы, вызначэнні і пастановы, якія ўвайшлі ў законную сілу;

5) «Суддзя» — народны суддзя, старшыня, намеснік старшыні, член суда, народны засядацель;

6) «Пракурор» — Генеральны Пракурор СССР, Пракурор Беларускай ССР, пракуроры абласцей, гарадоў, раёнаў, іх намеснікі і памочнікі, пракуроры аддзелаў і ўпраўленняў пракуратур і ваенныя пракуроры;

7) «Следчы» — следчы пракуратуры, следчы органаў дзяржаўнай бяспекі;

8) «Законныя прадстаўнікі» — бацькі, усынавіцелі, апекуны, папячыцелі абвінавачваемага або пацярпеўшага, прадстаўнікі ўстаноў і арганізацый, пад апекай якіх знаходзіцца абвінавачваемы або пацярпеўшы;

9) «Блізкія сваякі» — бацькі, дзеці, усынавіцелі, усыноўленыя, родныя браты і сёстры, дзед, бабка, унукі, а таксама муж, жонка;

10) «Прыгавор» — рашэнне, вынесенае судом у пасяджэнні па пытанню аб вінаватасці або невінаватасці падсуднага і аб ужыванні або неўжыванні да яго пакарання;

11) «Вызначэнне» — усякае, акрамя прыгавору, рашэнне, вынесенае судом першай інстанцыі пры судаводстве па крымінальнай справе; усякае рашэнне касацыйнай інстанцыі; рашэнне, прынятае судовай калегіяй па крымінальных справах

Вярхоўнага Суда Беларускай ССР пры пераглядзе судовых прыгавораў, вызначэнняў і пастаноў, якія ўвайшлі ў законную сілу;

12) «Прыватнае вызначэнне» — вызначэнне, якім суд даводзіць да ведама адпаведных органаў аб устаноўленых пры разглядзе справы недахопах у рабоце той ці іншай установы, прадпрыемства, арганізацыі або асобных службовых асоб;

13) «Пастанова» — рашэнне, прынятае Пленумам Вярхоўнага Суда Беларускай ССР, прэзідыумамі абласных судоў пры пераглядзе судовых прыгавораў, вызначэнняў і пастаноў, якія ўвайшлі ў законную сілу; усякае рашэнне, прынятае суддзёй аднаасобна; рашэнне следчага, асобы, што праводзіць дазнанне, пракурора, прынятае пры правядзенні папярэдняга следства і дазнання;

14) «Пратакол» — дакумент, у якім у парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам, засведчваецца факт вядзення, змест і вынікі следчых і судовых дзеянняў;

15) «Касацыйная скарга» — скарга на прыгавор, які не ўвайшоў у законную сілу;

16) «Прыватная скарга» — скарга на вызначэнне суда першай інстанцыі і пастанову суддзі, якія не ўвайшлі ў законную сілу;

17) «Касацыйны пратэст» — пратэст пракурора аб адмене або змяненні прыгавору, які не ўвайшоў у законную сілу;

18) «Прыватны пратэст» — пратэст пракурора на вызначэнне суда першай інстанцыі і пастанову суддзі, якія не ўвайшлі ў законную сілу;

19) «Пратэст у парадку нагляду» — пратэсты правамоцных законам асоб аб адмене або змяненні прыгавору, вызначэння, пастановы, якія ўвайшлі ў законную сілу.

20) «Начны час» — час ад дваццаці дзвюх да шасці гадзін па мясцоваму часу.

## ГЛАВА 2

## СУД І ПАДСУДНАСЦЬ

### Артыкул 23. **Склад суда**

Раённы (гарадскі) народны суд разглядае крымінальныя справы ў складзе старшынствуючага — старэйшага народнага суддзі, народнага суддзі і двух народных засядацеляў. Усе іншыя суды разглядаюць крымінальныя справы ў складзе старшынствуючага — старшыні, намесніка старшыні суда або члена адпаведнага суда і двух народных засядацеляў.

Судовая калегія па крымінальных справах абласнога суда і Вярхоўнага Суда Беларускай ССР разглядае скаргі і пратэсты на прыгаворы, вызначэнні і пастановы ў складзе трох членаў суда.

Прэзідыум абласнога суда разглядае пратэсты ў парадку судовага нагляду пры наяўнасці большасці членаў прэзідыума.

Пленум Вярхоўнага Суда Беларускай ССР разглядае пратэсты ў парадку судовага нагляду пры наяўнасці не менш чым $^2/_3$ складу Вярхоўнага Суда Беларускай ССР.

Артыкул 24. **Суддзі, якія ўдзельнічаюць у разглядзе крымінальнай справы**

Удзельнічаць у разглядзе крымінальнай справы могуць толькі суддзі і народныя засядацелі, выбраныя ў склад данага суда.

Артыкул 25. **Нязменнасць складу суда пры разборы справы**

Кожная справа павінна быць разгледжана ў адным і тым жа складзе суддзяў. Калі хто-небудзь з суддзяў пазбаўлен магчымасці працягваць удзельнічаць у пасяджэнні, ён замяняецца іншым суддзёй і разгляд справы пачынаецца спачатку, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных артыкулам 26 гэтага Кодэкса.

Артыкул 26. **Запасны народны засядацель**

Па справе, якая патрабуе працяглага часу для яе разбору, можа быць выклікан запасны народны засядацель. Запасны народны засядацель прысутнічае ў зале судовага пасяджэння з пачатку разбору данай справы і ў выпадку выбыцця народнага засядацеля замяняе яго.

Калі запасны народны засядацель, які ўступіў на месца выбыўшага, не патрабуе аднаўлення судовых дзеянняў, разбор справы працягваецца.

Артыкул 27. **Акалічнасці, якія адхіляюць суддзю ад удзелу ў разглядзе крымінальнай справы**

Суддзя не можа ўдзельнічаць у разглядзе справы:

1) калі ён з'яўляецца пацярпеўшым, грамадзянскім істцом, грамадзянскім адказчыкам, сведкай, а таксама калі ён удзельнічаў у данай справе ў якасці эксперта, перакладчыка, асобы, якая праводзіла дазнанне, следчага, пракурора, грамадскага абвінаваўцы, абаронцы, грамадскага абаронцы, за-

коннага прадстаўніка абвінавачваемага, прадстаўніка пацярпеўшага, грамадзянскага істца або грамадзянскага адказчыка;

2) калі ён з'яўляецца сваяком пацярпеўшага, грамадзянскага істца, грамадзянскага адказчыка або іх прадстаўнікоў, сваяком абвінавачваемага або яго законнага прадстаўніка, сваяком пракурора, грамадскага абвінаваўцы, абаронцы, грамадскага абаронцы, следчага або асобы, якая праводзіла дазнанне;

3) калі ёсць іншыя акалічнасці, якія даюць падставу лічыць, што суддзя асабіста, прама або ўскосна, зацікаўлен у гэтай справе.

У склад суда, які разглядае крымінальную справу, не могуць уваходзіць асобы, якія знаходзяцца ў сваяцтве паміж сабой.

Артыкул 28. **Недапушчальнасць паўторнага ўдзелу суддзі ў разглядзе крымінальнай справы**

Суддзя, які прымаў удзел у разглядзе крымінальнай справы ў судзе першай інстанцыі, не можа ўдзельнічаць у разглядзе гэтай справы ў судзе касацыйнай інстанцыі або ў парадку судовага нагляду ў прэзідыуме абласнога суда, або ў судовай калегіі па крымінальных справах Вярхоўнага Суда Беларускай ССР, а таксама ўдзельнічаць у новым разглядзе справы ў судзе першай інстанцыі ў выпадку адмены прыгавору або вызначэння аб спыненні справы, пастаноўленых з яго ўдзелам.

Суддзя, які прымаў удзел у разглядзе справы ў судзе касацыйнай інстанцыі, не можа ўдзельнічаць у разглядзе гэтай справы ў судзе першай інстанцыі або ў парадку судовага нагляду ў прэзідыуме абласнога суда або ў судовай калегіі па крымінальных справах Вярхоўнага Суда Беларускай ССР, а таксама ў новым разглядзе справы ў судзе касацыйнай інстанцыі пасля адмены вызначэння, пастаноўленага з яго ўдзелам.

Суддзя, які прымаў удзел у разглядзе справы ў парадку судовага нагляду ў прэзідыуме абласнога суда або ў судовай калегіі па крымінальных справах Вярхоўнага Суда Беларускай ССР, не можа ўдзельнічаць у разглядзе той жа справы ў судзе першай і касацыйнай інстанцыі.

Артыкул 29. **Адвод суддзі.**

Пры наяўнасці акалічнасцей, указаных у артыкулах 27 і 28 гэтага Кодэкса, суддзя абавязан заявіць самаадвод.

Па тых жа падставах адвод суддзі можа быць заяўлен пракурорам, грамадскім абвінаваўцам, абаронцам, грамадскім абаронцам, падсудным, яго законным прадстаўніком, а таксама пацярпеўшым, грамадзянскім істцом, грамадзянскім адказчыкам або іх прадстаўнікамі.

Артыкул 30. **Парадак вырашэння адводу, заяўленага суддзі.**

Адвод, заяўлены суддзі, вырашаецца астатнімі суддзямі ў адсутнасці адводзімага, які, аднак, мае права папярэдне публічна выкласці астатнім суддзям сваё тлумачэнне адносна заяўленага яму адводу. Пры роўнасці галасоў суддзя лічыцца адведзеным.

Адвод, заяўлены двум суддзям або ўсяму складу суда, вырашаецца судом у поўным складзе простай большасцю галасоў. Пытанне аб адводзе вырашаецца судом у дарадчым пакоі.

Артыкул 31. **Крымінальныя справы, падсудныя раённаму (гарадскому) народнаму суду.**

Раённаму (гарадскому) народнаму суду падсудныя ўсе справы, акрамя спраў, падсудных вышэйстаячым судам або ваенным трыбуналам.

Артыкул 32. **Крымінальныя справы, падсудныя абласному суду**

Абласному суду падсудныя крымінальныя справы аб злачынствах, прадугледжаных артыкуламі 61, 63—74, 76, 78, часткай другой, 81, 82, часткай першай, 83, 84, 86, $86^1$, 100, 149 і 172 — 175 Крымінальнага кодэкса Беларускай ССР (Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР ад 7 сакавіка 1961 г.).

Артыкул 33. **Крымінальныя справы, падсудныя Вярхоўнаму Суду Беларускай ССР**

Вярхоўнаму Суду Беларускай ССР падсудныя крымінальныя справы асаблівай складанасці або асаблівага грамадскага значэння, прымаемыя ім да свайго судаводства па меркаванню Старшыні Вярхоўнага Суда Беларускай ССР або па прадстаўленню Пракурора Беларускай ССР.

Артыкул 34. **Крымінальныя справы, падсудныя ваеннаму трыбуналу**

Падсуднасць крымінальных спраў ваеннаму трыбуналу вызначаецца Палажэннем аб ваенных трыбуналах.

Артыкул 35. **Права вышэйстаячага суда прыняць да свайго судаводства крымінальную справу, падсудную ніжэйстаячаму суду**

Вышэйстаячы суд мае права прыняць да свайго судаводства ў якасці суда першай інстанцыі любую справу, падсудную ніжэйстаячаму суду.

Артыкул 36. **Тэрытарыяльная падсуднасць крымінальнай справы**

Справа падлягае разгляду ў тым судзе, у раёне дзейнасці якога ўчынена злачынства.

Калі вызначыць месца ўчынення злачынства немагчыма, справа падсудная таму суду, у раёне дзейнасці якога закончана папярэдняе следства або дазнанне па справе.

Артыкул 37. **Вызначэнне падсуднасці пры аб'яднанні крымінальных спраў**

Пры абвінавачанні адной асобы або групы асоб ва ўчыненні некалькіх злачынстваў, справы аб якіх падсудныя разнайменным судам, справа аб усіх злачынствах разглядаецца вышэйстаячым з гэтых судоў.

Калі справа па абвінавачанню адной асобы або групы асоб ва ўчыненні некалькіх злачынстваў падсудная ваеннаму трыбуналу ў адносінах хоць бы да адной асобы або да аднаго злачынства, справа аб усіх асобах і злачынствах, у адпаведнасці з артыкулам 12 Палажэння аб ваенных трыбуналах, разглядаецца ваенным трыбуналам.

Справа, якая па тых ці іншых падставах падсудная адначасова некалькім аднайменным судам, разглядаецца тым судом, у раёне дзейнасці якога было закончана папярэдняе следства або дазнанне па справе.

Артыкул 38. **Перадача крымінальнай справы па падсуднасці**

Суддзя або суд у распарадчым пасяджэнні, устанавіўшы, што паступіўшая справа не падсудная данаму суду, накіроўвае справу па падсуднасці.

Суд, устанавіўшы, што справа, якая знаходзіцца ў яго судаводстве, падсудная другому такому ж суду, мае права пакінуць справу ў сваім судаводстве толькі ў выпадку, калі

ён пачаў яе разгляд у судовым пасяджэнні. Аднак, калі справа падсудная вышэйстаячаму суду або ваеннаму трыбуналу, яна ва ўсіх выпадках падлягае накіраванню па падсуднасці.

Перадача ў ніжэйстаячы суд справы, пачатай разглядам у судовым пасяджэнні вышэйстаячага суда, не дапускаецца.

Артыкул 39. **Перадача крымінальнай справы з суда, якому яна падсудная, у іншы суд**

У асобных выпадках, з мэтай найбольш хуткага, поўнага і аб'ектыўнага разгляду справы, а таксама з мэтай найлепшага забеспячэння выхаваўчай ролі судовага разбору справы, яна можа быць перададзена вышэйстаячым судом для разгляду ў другі такі ж суд. Перадача справы па гэтых падставах дапускаецца толькі да пачатку яе разгляду ў судовым пасяджэнні.

Пытанне аб перадачы справы ў гэтых выпадках вырашаецца старшынёй вышэйстаячага суда па прадстаўленню пракурора або суда, якому падсудная справа.

Пытанне аб перадачы справы ў суд іншай вобласці па ўказаных у гэтым артыкуле падставах вырашаецца Старшынёй Вярхоўнага Суда Беларускай ССР.

Артыкул 40. **Недапушчальнасць спрэчак аб падсуднасці**

Спрэчкі аб падсуднасці паміж судамі не дапускаюцца. Усякая справа, накіраваная з аднаго суда ў другі ў парадку, прадугледжаным артыкуламі 38 і 39 гэтага Кодэкса, падлягае безумоўнаму прыняццю да судаводства тым судом, куды яна накіравана.

## ГЛАВА 3

## ПРАКУРОР

Артыкул 41. **Паўнамоцтвы пракурора**

У адпаведнасці з Палажэннем аб пракурорскім наглядзе ў СССР і ў парадку, прадугледжаным гэтым Кодэксам, пракурор ажыццяўляе нагляд за законнасцю ўзбуджэння крымінальнай справы і за выкананнем законаў пры правядзенні дазнання і папярэдняга следства, пры разглядзе справы ў судзе і пры выкананні прыгавору.

Артыкул 42. **Адвод пракурора.**

Пракурор не можа прымаць удзелу ў судаводстве па справе пры наяўнасці падстаў, указаных у артыкуле 27 гэтага Кодэкса.

Удзел пракурора ў правядзенні папярэдняга следства або дазнання, а таксама падтрыманне ім абвінавачання на судзе не з'яўляецца перашкодай для далейшага ўдзелу яго ў справе.

Пры наяўнасці падстаў для адводу пракурор абавязан адхіліцца ад удзелу ў справе. Па гэтых жа падставах пракурору можа быць заяўлен адвод абвінавачваемым, яго законным прадстаўніком і абаронцам, грамадскім абаронцам і грамадскім абвінаваўцам, а таксама пацярпеўшым, грамадзянскім істцом, грамадзянскім адказчыкам або іх прадстаўнікамі.

Пытанне аб адводзе пракурора вырашаецца пры правядзенні дазнання і папярэдняга следства вышэйстаячым пракурорам, а ў судзе — судом, які разглядае справу.

## ГЛАВА 4

## СЛЕДЧЫ І АСОБА, ЯКАЯ ПРАВОДЗІЦЬ ДАЗНАННЕ

Артыкул 43. **Следчы**

Папярэдняе следства па крымінальных справах праводзяць назначаныя ва ўстаноўленым законам парадку следчыя органаў пракуратуры і следчыя органаў дзяржаўнай бяспекі ў межах іх кампетэнцыі.

Артыкул 44. **Паўнамоцтвы следчага.**

Пры правядзенні папярэдняга следства ўсе рашэнні аб напрамку следства і аб правядзенні следчых дзеянняў следчы прымае самастойна, за выключэннем выпадкаў, калі законам прадугледжана атрыманне санкцыі ад пракурора, і нясе поўную адказнасць за іх законнае і своечасовае правядзенне.

У выпадку нязгоды следчага з указаннямі пракурора аб прыцягненні ў якасці абвінавачваемага, аб кваліфікацыі злачынства і аб'ёме абвінавачання, аб накіраванні справы для аддання абвінавачваемага пад суд або аб спыненні справы, следчы мае права прадставіць справу вышэйстаячаму пракурору з пісьмовым вытлумачэннем сваіх пярэчанняў. У гэтым выпадку пракурор або адмяняе ўказанні ніжэйстаячага пракурора, або даручае правядзенне следства па гэтай справе іншаму следчаму.

Па справах, па якіх папярэдняе следства абавязкова, следчы мае права ў любы момант пачаць правядзенне папярэдняга следства, не чакаючы выканання органамі дазнання дзеянняў, прадугледжаных артыкулам 116 гэтага Кодэкса.

Следчы па расследуемых ім справах мае права даваць органам дазнання даручэнні і ўказанні аб правядзенні вышукных і следчых дзеянняў і патрабаваць ад органаў дазнання садзейнічання пры правядзенні асобных следчых дзеянняў. Такія даручэнні і ўказанні следчага даюцца ў пісьмовым выглядзе і з'яўляюцца для органаў дазнання абавязковымі.

Пастановы следчага, вынесеныя ў адпаведнасці з законам па крымінальнай справе, якая знаходзіцца ў яго вядзенні, абавязковыя для выканання ўсімі ўстановамі, прадпрыемствамі, арганізацыямі, службовымі асобамі і грамадзянамі.

Следчы мае права затрымаць і дапытаць асобу, якая падазраецца ва ўчыненні злачынства, у парадку і па падставах, прадугледжаных артыкуламі 119 і 120 гэтага Кодэкса.

### Артыкул 45. **Асоба, якая праводзіць дазнанне**

Дазнанне па крымінальных справах праводзяць службовыя асобы, упаўнаважаныя на тое органамі дазнання, пералічанымі ў артыкуле 115 гэтага Кодэкса.

### Артыкул 46. **Паўнамоцтвы органа дазнання**

На органы дазнання ўскладаецца прыняцце неабходных аператыўна-вышукных і іншых прадугледжаных крымінальна-працэсуальным законам мер з мэтай выяўлення злачынстваў і асоб, якія іх учынілі.

На органы дазнання ўскладаецца таксама абавязак прыняцця ўсіх мер, неабходных для папярэджання і спынення злачынства.

Дзейнасць органаў дазнання адрозніваецца ў залежнасці ад таго, дзейнічаюць яны па справах, па якіх правядзенне папярэдняга следства абавязкова, ці па справах, па якіх правядзенне папярэдняга следства не абавязкова.

### Артыкул 47. **Адвод следчага і асобы, якая праводзіць дазнанне**

Следчы або асоба, якая праводзіць дазнанне, не могуць прымаць удзелу ў расследаванні па справе пры наяўнасці падстаў, прадугледжаных артыкулам 27 гэтага Кодэкса. Іх удзел у дазнанні або папярэднім следстве, якое праводзілася

раней па данай справе, не з'яўляецца падставай для адводу.

Пры наяўнасці падстаў для адводу следчы або асоба, якая праводзіць дазнанне, абавязаны адхіліцца ад удзелу ў справе. Па гэтых жа падставах ім можа быць заяўлен адвод падазраваемым, абвінавачваемым, абаронцам, а таксама пацярпеўшым, грамадзянскім істцом, грамадзянскім адказчыкам або іх прадстаўнікамі.

Заява аб адводзе або самаадводзе следчага або асобы, якая праводзіць дазнанне, падаецца пракурору, які разглядае і вырашае яе на працягу дваццаці чатырох гадзін.

## ГЛАВА 5

## УДЗЕЛЬНІКІ ПРАЦЭСУ, ІХ ПРАВЫ І АБАВЯЗКІ

### Артыкул 48. **Абвінавачваемы**

Абвінавачваемай прызнаецца асоба, у адносінах да якой ва ўстаноўленым гэтым Кодэксам парадку вынесена пастанова аб прыцягненні ў якасці абвінавачваемага. Пасля аддання абвінавачваемага пад суд ён называецца падсудным, а пасля вынясення абвінаваўчага прыгавору — асуджаным.

Абвінавачваемы мае права: ведаць, у чым ён абвінавачваецца, і даваць тлумачэнні па прад'яўленаму яму абвінавачанню; прадстаўляць доказы; заяўляць хадайніцтвы; знаёміцца пасля заканчэння папярэдняга следства або дазнання з усімі матэрыяламі справы; мець абаронцу з моманту, прадугледжанага артыкулам 49 гэтага Кодэкса; удзельнічаць у судовым разборы ў судзе першай інстанцыі; заяўляць адводы; прыносіць скаргі на дзеянні і рашэнні асобы, якая праводзіць дазнанне, следчага, пракурора і суда.

Падсудны мае права на апошняе слова.

### Артыкул 49. **Удзел абаронцы ў крымінальным судаводстве**

Абаронца дапускаецца да ўдзелу ў справе з моманту аб'яўлення абвінавачваемаму аб заканчэнні папярэдняга следства і прад'яўлення абвінавачваемаму для азнаямлення ўсяго судаводства па справе.

Па справах аб злачынствах непаўналетніх, а таксама асоб, якія з прычыны сваіх фізічных або псіхічных недахопаў не могуць самі ажыццяўляць свае права на абарону, абаронца

дапускаецца да ўдзелу ў справе з моманту прад'яўлення абвінавачання.

Па справах, па якіх не праводзілася папярэдняга следства, абаронца дапускаецца з моманту аддання абвінавачваемага пад суд.

У якасці абаронцы дапускаюцца адвакаты, прадстаўнікі прафесіянальных саюзаў і іншых грамадскіх арганізацый.

Па вызначэнню суда або пастанове суддзі ў якасці абаронцы могуць быць дапушчаны блізкія сваякі і законныя прадстаўнікі абвінавачваемага, а таксама іншыя асобы.

Адна і тая ж асоба не можа быць абаронцам двух абвінавачваемых, калі інтарэсы абароны аднаго з іх супярэчаць інтарэсам другога.

Артыкул 50. **Запрашэнне, назначэнне і замена абаронцы**

Абаронца з ліку асоб, указаных у артыкуле 49 гэтага Кодэкса, запрашаецца абвінавачваемым, яго законным прадстаўніком, а таксама іншымі асобамі па даручэнню або са згоды абвінавачваемага.

Па просьбе абвінавачваемага ўдзел абаронцы забяспечваецца следчым і судом.

У тых выпадках, калі ўдзел выбранага абвінавачваемым абаронцы немагчымы на працягу доўгага тэрміну, следчы і суд маюць права прапанаваць абвінавачваемаму запрасіць іншага абаронцу або назначыць абвінавачваемаму абаронцу праз калегію адвакатаў.

Артыкул 51. **Абавязковы ўдзел абаронцы**

Удзел абаронцы пры судовым разборы абавязковы па справах:

1) у якіх удзельнічае пракурор;

2) нямых, сляпых, глухіх і іншых асоб, якія з прычыны сваіх фізічных або псіхічных недахопаў не могуць самі ажыццяўляць сваё права на абарону;

3) непаўналетніх;

4) асоб, якія не валодаюць мовай, на якой вядзецца судаводства;

5) асоб, адданых пад суд за злачынствы, за якія ў якасці меры пакарання можа быць ужыта пакаранне смерцю;

6) асоб, паміж інтарэсамі якіх ёсць супярэчнасці і хоць бы адна з іх мае абаронцу.

Пры наяўнасці адной з акалічнасцей, прадугледжаных пунктамі 2 і 3 гэтага артыкула, удзел абаронцы абавязковы і ў папярэднім следстве.

Калі ў выпадках, прадугледжаных гэтым артыкулам, абаронца не запрошан самім абвінавачваемым, яго законным прадстаўніком або іншымі асобамі па яго даручэнню, суд або адпаведна следчы і пракурор абавязаны забяспечыць удзел абаронцы ў справе.

Артыкул 52. **Адмова ад абаронцы**

Абвінавачваемы мае права ў любы момант судаводства па справе адмовіцца ад абаронцы. Такая адмова дапускаецца толькі па ініцыятыве самога абвінавачваемага і не можа з'яўляцца перашкодай для ўдзелу ў справе пракурора, а таксама абаронцаў іншых падсудных.

Адмова ад абаронцы, заяўленая непаўналетнім або абвінавачваемым, які з прычыны сваіх фізічных або псіхічных недахопаў не можа сам ажыццяўляць сваё права на абарону, не абавязкова для суда або адпаведна для следчага і пракурора.

Артыкул 53. **Абавязкі і правы абаронцы**

Абаронца абавязан выкарыстаць усе ўказаныя ў законе сродкі і спосабы абароны з мэтай высвятлення акалічнасцей, якія апраўдваюць абвінавачваемага або змякчаюць яго адказнасць, і аказваць абвінавачваемаму неабходную юрыдычную дапамогу.

З моманту дапушчэння да ўдзелу ў справе абаронца мае права: мець спатканне з абвінавачваемым; знаёміцца з усімі матэрыяламі справы і выпісваць з яе неабходныя звесткі; прадстаўляць доказы; заяўляць хадайніцтвы; удзельнічаць у судовым разборы; заяўляць адводы; прыносіць скаргі на дзеянні і рашэнні следчага, пракурора і суда. Акрамя таго, з дазволу следчага абаронца можа прысутнічаць пры допытах абвінавачваемага і пры правядзенні іншых следчых дзеянняў, якія выконваюцца па хадайніцтвах абвінавачваемага або яго абаронцы.

Адвакат не мае права адмовіцца ад прынятай на сябе абароны абвінавачваемага.

Артыкул 54. **Пацярпеўшы**

Пацярпеўшай прызнаецца асоба, якой злачынствам прычынена маральная, фізічная або маёмасная шкода.

Грамадзянін, прызнаны пацярпеўшым ад злачынства, або яго прадстаўнік маюць права: даваць паказанні па справе; прадстаўляць доказы; заяўляць хадайніцтвы; знаёміцца з матэрыяламі справы з моманту заканчэння папярэдняга следства, а па справах, па якіх папярэдняе следства не праводзілася, — з моманту аддання пад суд; удзельнічаць у даследаванні доказаў на судовым следстве; заяўляць адводы; скардзіцца на дзеянні асобы, якая праводзіць дазнанне, следчага, пракурора і суда, а таксама скардзіцца на прыгавор або вызначэнні суда і пастановы суддзі.

У выпадках, прадугледжаных часткай першай артыкула 106 гэтага Кодэкса, пацярпеўшы мае права ў судовым разборы асабіста або праз свайго прадстаўніка падтрымліваць абвінавачанне.

Па справах аб злачынствах, вынікам якіх з'явілася смерць пацярпеўшага, правы, прадугледжаныя гэтым артыкулам, маюць яго блізкія сваякі або яго законныя прадстаўнікі.

### Артыкул 55. **Грамадзянскі ісцец**

Грамадзянскім істцом прызнаецца грамадзянін, установа, прадпрыемства або арганізацыя, якія панеслі матэрыяльныя страты ад злачынства і прад'явілі патрабаванне аб іх пакрыцці ў адпаведнасці з артыкулам 56 гэтага Кодэкса.

Грамадзянскі ісцец або яго прадстаўнік маюць права: прадстаўляць доказы; заяўляць хадайніцтвы; удзельнічаць у судовым разборы; прасіць орган дазнання, следчага і суд аб прыняцці мер забеспячэння заяўленага імі іску; падтрымліваць грамадзянскі іск; знаёміцца з матэрыяламі справы з моманту заканчэння папярэдняга следства, а па справах, па якіх папярэдняе следства не праводзілася, — з моманту аддання пад суд; заяўляць адводы; скардзіцца на дзеянні асобы, якая праводзіць дазнанне, следчага, пракурора і суда, а таксама скардзіцца на прыгавор або вызначэнні суда ў частцы, якая датычыць грамадзянскага іску.

Грамадзянскі ісцец абавязан па патрабаванню суда прадстаўляць наяўныя ў яго распараджэнні дакументы, звязаныя з прад'яўленым іскам.

### Артыкул 56. **Грамадзянскі іск у крымінальнай справе**

Асоба, якая панесла матэрыяльныя страты ад злачынства, мае права пры судаводстве па крымінальнай справе прад'яўляць да абвінавачваемага або да асоб, што нясуць матэ-

рыяльную адказнасць за дзеянні абвінавачваемага, грамадзянскі іск, які разглядаецца судом сумесна з крымінальнай справай. Грамадзянскі іск у крымінальнай справе вызваляецца ад дзяржаўнай пошліны.

Грамадзянскі іск можа быць прад'яўлен з моманту ўзбуджэння крымінальнай справы да пачатку судовага следства. Адмова ў іску, пастаноўленая ў парадку грамадзянскага судаводства, пазбаўляе істца права паўторнага прад'яўлення таго ж іску па крымінальнай справе.

Пракурор мае права прад'явіць або падтрымаць прад'яўлены пацярпеўшым грамадзянскі іск, калі гэтага патрабуе ахова дзяржаўных або грамадскіх інтарэсаў або правоў грамадзян.

Калі грамадзянскі іск застаўся непрад'яўленым, суд пры пастанаўленні прыгавору мае права па ўласнай ініцыятыве вырашыць пытанне аб пакрыцці матэрыяльных страт, прычыненых злачынствам.

Даказванне грамадзянскага іску, прад'яўленага па крымінальнай справе, праводзіцца па правілах, устаноўленых гэтым Кодэксам.

Асоба, якая не прад'явіла грамадзянскі іск па крымінальнай справе, а таксама асоба, чый грамадзянскі іск застаўся без разгляду, мае права прад'явіць яго ў парадку грамадзянскага судаводства.

Артыкул 57. **Грамадзянскі адказчык**

У якасці грамадзянскіх адказчыкаў могуць быць прыцягнуты бацькі, апекуны, папячыцелі або іншыя асобы, а таксама ўстановы, прадпрыемствы і арганізацыі, якія згодна закону нясуць матэрыяльную адказнасць за страту, нанесеную злачыннымі дзеяннямі абвінавачваемага.

Грамадзянскі адказчык або яго прадстаўнік маюць права: пярэчыць супраць прад'яўленага іску; даваць тлумачэнні па сутнасці прад'яўленага іску; прадстаўляць доказы; заяўляць хадайніцтвы; знаёміцца з матэрыяламі справы ў частцы, якая датычыць грамадзянскага іску, з моманту заканчэння папярэдняга следства, а па справах, па якіх папярэдняе следства не праводзілася,— з моманту аддання пад суд; удзельнічаць у судовым разборы; заяўляць адводы; скардзіцца на дзеянні асобы, якая праводзіць дазнанне, следчага, пракурора і суда, а таксама скардзіцца на прыгавор і вызначэнні суда ў частцы, якая датычыць грамадзянскага іску.

Артыкул 58. **Прызнанне асобы пацярпеўшым, грамадзянскім істцом або грамадзянскім адказчыкам**

Аб прызнанні асобы пацярпеўшым, грамадзянскім істцом або грамадзянскім адказчыкам асоба, якая праводзіць дазнанне, следчы, пракурор або суддзя выносяць пастанову, а суд — вызначэнне.

Артыкул 59. **Прадстаўнікі пацярпеўшага, грамадзянскага істца і грамадзянскага адказчыка**

У якасці прадстаўнікоў пацярпеўшага, грамадзянскага істца і грамадзянскага адказчыка могуць удзельнічаць у справе блізкія сваякі, законныя прадстаўнікі, адвакаты, прадстаўнікі прафсаюзных і іншых грамадскіх арганізацый, а таксама іншыя асобы, дапушчаныя да ўдзелу ў справе з дазволу асобы, якая праводзіць дазнанне, следчага або суда.

Артыкул 60. **Абавязак растлумачэння і забеспячэння правоў асобам, якія ўдзельнічаюць у справе**

Суд, пракурор, следчы і асоба, якая праводзіць дазнанне, абавязаны растлумачыць асобам, якія ўдзельнічаюць у справе, іх правы і забяспечыць магчымасць ажыццяўлення гэтых правоў.

## ГЛАВА 6

## ДОКАЗЫ

Артыкул 61. **Акалічнасці, якія падлягаюць даказванню па крымінальнай справе**

Пры правядзенні дазнання, папярэдняга следства і разборы крымінальнай справы ў судзе падлягаюць даказванню:

1) падзея злачынства (час, месца, спосаб і іншыя акалічнасці ўчынення злачынства);

2) вінаватасць абвінавачваемага ва ўчыненні злачынства;

3) акалічнасці, якія ўплываюць на ступень і характар адказнасці абвінавачваемага;

4) характар і размер страты, нанесенай злачынствам.

Артыкул 62. **Выяўленне прычын і ўмоў, якія садзейнічалі ўчыненню злачынства**

Пры правядзенні дазнання, папярэдняга следства і судовага разбору крымінальнай справы органы дазнання, следчы, пракурор і суд абавязаны выяўляць прычыны і ўмовы, якія садзейнічалі ўчыненню злачынства, і прымаць меры да іх ліквідацыі.

Артыкул 63. **Доказы**

Доказамі па крымінальнай справе з'яўляюцца любыя фактычныя даныя, на аснове якіх у вызначаным законам парадку органы дазнання, следчы і суд устанаўліваюць наяўнасць або адсутнасць грамадска небяспечнага дзеяння, вінаватасць асобы, якая ўчыніла гэтае дзеянне, і іншыя акалічнасці, якія маюць значэнне для правільнага вырашэння справы.

Гэтыя даныя ўстанаўліваюцца: паказаннямі сведкі, паказаннямі пацярпеўшага, паказаннямі падазраваемага, паказаннямі абвінавачваемага, заключэннем эксперта, рэчавымі доказамі, пратаколамі следчых і судовых дзеянняў і іншымі дакументамі.

Артыкул 64. **Збіранне доказаў**

Асоба, якая праводзіць дазнанне, следчы, пракурор і суд маюць права ў межах сваёй кампетэнцыі, па справах, якія знаходзяцца ў іх вядзенні, выклікаць у парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам, любую асобу для допыту або для дачы заключэння ў якасці эксперта; праводзіць агляды, вобыскі і іншыя прадугледжаныя гэтым Кодэксам следчыя дзеянні; патрабаваць ад устаноў, прадпрыемстваў, арганізацый, службовых асоб і грамадзян прадстаўлення прадметаў і дакументаў, якія могуць устанавіць неабходныя па справе фактычныя даныя; патрабаваць правядзення рэвізій.

Доказы могуць быць прадстаўлены падазраваемым, абвінавачваемым, абаронцам, пракурорам, а таксама пацярпеўшым, грамадзянскім істцом, грамадзянскім адказчыкам і іх прадстаўнікамі і любымі грамадзянамі, установамі, прадпрыемствамі і арганізацыямі.

Усе сабраныя па справе доказы падлягаюць старанннай, усебаковай і аб'ектыўнай праверцы з боку асобы, якая праводзіць дазнанне, следчага, пракурора і суда.

Артыкул 65. **Ацэнка доказаў**

Суд, пракурор, следчы і асоба, якая праводзіць дазнанне, ацэньваюць доказы па свайму ўнутранаму перакананню, за-

снаванаму на ўсебаковым, поўным і аб'ектыўным разглядзе ўсіх акалічнасцей справы ў іх сукупнасці, кіруючыся законам і сацыялістычнай правасвядомасцю.

Ніякія доказы для суда, пракурора, следчага і асобы, якая праводзіць дазнанне, не маюць загадзя ўстаноўленай сілы.

Артыкул 66. **Асобы, выклікаемыя ў якасці сведак**

У якасці сведкі для дачы паказанняў можа быць выклікана любая асоба, якой могуць быць вядомы якія-небудзь акалічнасці, што падлягаюць устанаўленню па данай справе.

Не могуць быць дапытаны ў якасці сведкі:

1) абаронца абвінавачваемага — аб акалічнасцях справы, якія сталі яму вядомы ад падабароннага;

2) асоба, якая з прычыны сваіх фізічных або псіхічных недахопаў не здольна правільна ўспрыймаць акалічнасці, якія маюць значэнне для справы, і даваць аб іх правільныя паказанні. Для вырашэння пытання аб здольнасці асобы правільна ўспрыймаць акалічнасці, якія маюць значэнне для справы, і даваць аб іх правільныя паказанні ў неабходных выпадках запрашаюцца эксперты.

Удзел у справе законных прадстаўнікоў пацярпеўшага, падазраваемага, абвінавачваемага не выключае магчымасці допыту гэтых асоб у якасці сведак.

Артыкул 67. **Абавязкі сведкі**

Сведка абавязан з'явіцца па выкліку асобы, якая праводзіць дазнанне, следчага, пракурора, суда і даць праўдзівыя паказанні: паведаміць усё вядомае яму па справе і адказаць на пастаўленыя пытанні.

Пры няяўцы сведкі без уважлівай прычыны асоба, якая праводзіць дазнанне, следчы, пракурор і суд маюць права падвергнуць яго прыводу.

За адмову або ўхіленне ад дачы паказанняў сведка нясе адказнасць па артыкулу 178 Крымінальнага кодэкса Беларускай ССР, а за дачу заведамаілжывых паказанняў — па артыкулу 177 Крымінальнага кодэкса Беларускай ССР.

Артыкул 68. **Паказанні сведкі**

Сведка можа быць дапытаны аб любых акалічнасцях, якія падлягаюць устанаўленню па данай справе, у тым ліку аб асобе абвінавачваемага, пацярпеўшага і аб сваіх узаемаадносінах з імі. Не могуць служыць доказам даныя, паведамляемыя сведкай, калі ён не можа ўказаць крыніцы сваёй асвядомленасці.

Артыкул 69. **Паказанні пацярпеўшага**

Пацярпеўшы абавязан з'явіцца па выкліку асобы, якая праводзіць дазнанне, следчага, пракурора, суда і даць праўдзівыя паказанні: паведаміць усё вядомае яму па справе і адказаць на пастаўленыя пытанні.

Пацярпеўшы дае паказанні аб вядомых яму акалічнасцях па справе, аб сваіх узаемаадносінах з абвінавачваемым, а таксама аб наяўных у справе доказах.

Пацярпеўшы дапытваецца па правілах, устаноўленых для допыту сведак.

За адмову або ўхіленне ад дачы паказанняў пацярпеўшы нясе адказнасць па артыкулу 178 Крымінальнага кодэкса Беларускай ССР, а за дачу заведамаілжывых паказанняў — па артыкулу 177 Крымінальнага кодэкса Беларускай ССР.

Артыкул 70. **Паказанні падазраваемага**

Падазраваемы дае паказанні адносна акалічнасцей, якія паслужылі падставай для яго затрымання або ўжывання да яго меры стрымання, а таксама адносна іншых вядомых яму акалічнасцей па справе.

Артыкул 71. **Паказанні абвінавачваемага**

Абвінавачваемы мае права даць паказанні па прад'яўленаму яму абвінавачанню, а таксама адносна іншых вядомых яму акалічнасцей па справе і наяўных у справе доказаў.

Артыкул 72. **Экспертыза**

Экспертыза назначаецца ў выпадках, калі пры правядзенні дазнання, папярэдняга следства і пры судовым разборы неабходны спецыяльныя пазнанні ў навуцы, тэхніцы, мастацтве або рамястве. Экспертыза праводзіцца экспертамі адпаведных устаноў або іншымі спецыялістамі, назначанымі асобай, якая праводзіць дазнанне, следчым, пракурорам і судом. У якасці эксперта можа быць выклікана любая асоба, якая мае неабходныя пазнанні для дачы заключэння. Пытанні, пастаўленыя перад экспертам, і яго заключэнне не могуць выходзіць за межы спецыяльных пазнанняў эксперта.

Артыкул 73. **Абавязкі і правы эксперта**

Эксперт абавязан з'явіцца па выкліку асобы, якая праводзіць дазнанне, следчага, пракурора і суда і даць аб'ектыўнае

заключэнне па пастаўленых перад ім пытаннях. Калі пастаўленае пытанне выходзіць за межы спецыяльных ведаў эксперта або прадстаўленыя яму матэрыялы недастатковыя для дачы заключэння, эксперт у пісьмовай форме паведамляе органу, які назначыў экспертызу, аб немагчымасці даць заключэнне.

Эксперт мае права:

1) знаёміцца з матэрыяламі справы, якія адносяцца да прадмета экспертызы;

2) заяўляць хадайніцтвы аб прадстаўленні яму дадатковых матэрыялаў, неабходных для дачы заключэння;

3) з дазволу асобы, якая праводзіць дазнанне, следчага, пракурора або суда прысутнічаць пры правядзенні допытаў і іншых следчых і судовых дзеянняў і задаваць дапытваемым пытанні, што датычаць прадмета экспертызы.

У выпадку адмовы або ўхілення эксперта ад выканання сваіх абавязкаў без уважлівых прычын або дачы ім заведама ілжывага заключэння, або няяўкі без уважлівых прычын па выкліку асобы, якая праводзіць дазнанне, следчага, пракурора і суда ўжываюцца меры, прадугледжаныя артыкулам 67 гэтага Кодэкса.

### Артыкул 74. Адвод эксперта

Эксперт не можа прымаць удзелу ў справе:

1) пры наяўнасці падстаў, прадугледжаных артыкулам 27 гэтага Кодэкса; аднак папярэдні яго ўдзел у справе ў якасці эксперта не з'яўляецца падставай для адводу;

2) калі ён знаходзіўся або знаходзіцца ў службовай або іншай залежнасці ад абвінавачваемага, пацярпеўшага, грамадзянскага істца або грамадзянскага адказчыка;

3) калі ён праводзіў па данай справе рэвізію, матэрыялы якой з'явіліся падставай да ўзбуджэння крымінальнай справы;

4) у выпадку, калі выявіцца яго некампетэнтнасць.

Пры наяўнасці гэтых падстаў эксперту можа быць заяўлен адвод абвінавачваемым, яго законным прадстаўніком і абаронцам, падазраваемым, грамадскім абаронцам, пракурорам, грамадскім абвінаваўцам, а таксама пацярпеўшым, грамадзянскім істцом, грамадзянскім адказчыкам або іх прадстаўнікамі.

Пытанне аб адводзе эксперта вырашаецца пры правядзенні дазнання або папярэдняга следства адпаведна асобай, якая праводзіць дазнанне, следчым або пракурорам, а ў судзе — судом, што разглядае справу.

Артыкул 75. **Абавязковае правядзенне экспертызы**

Правядзенне экспертызы абавязкова:

1) для ўстанаўлення прычын смерці;

2) для ўстанаўлення характару і цяжкасці цялесных пашкоджанняў;

3) для вызначэння псіхічнага стану абвінавачваемага або падазраваемага ў тых выпадках, калі ў асобы, якая праводзіць дазнанне, следчага, пракурора або суда наконт гэтага ўзнікаюць сумненні;

4) для ўстанаўлення ўзросту абвінавачваемага, падазраваемага і пацярпеўшага ў тых выпадках, калі гэта мае значэнне для справы, а дакументы аб узросце адсутнічаюць;

5) для ўстанаўлення палавой сталасці пацярпеўшых па справах аб злачынствах, прадугледжаных артыкулам 117 Крымінальнага кодэкса Беларускай ССР.

Артыкул 76. **Заключэнне эксперта**

Эксперт дае заключэнне ад свайго імя на падставе аб'ектыўнай і ўсебаковай ацэнкі праведзеных даследаванняў у адпаведнасці з яго спецыяльнымі ведамі і нясе за дадзенае ім заключэнне асабістую адказнасць.

Пры назначэнні для правядзення экспертызы некалькіх экспертаў яны да дачы заключэння раяцца паміж сабой. Калі эксперты адной спецыяльнасці прыйдуць да агульнага заключэння, апошняе падпісваецца ўсімі экспертамі. У выпадку рознагалосся паміж экспертамі кожны эксперт дае сваё заключэнне асобна.

Заключэнне эксперта не з'яўляецца абавязковым для асобы, якая праводзіць дазнанне, следчага, пракурора і суда, аднак нязгода іх з заключэннем павінна быць матывавана.

Артыкул 77. **Дадатковая і паўторная экспертыза**

У выпадку недастатковай яснасці або паўнаты заключэння можа быць назначана дадатковая экспертыза, якая даручаецца таму ж або іншаму эксперту.

У выпадку неабгрунтаванасці заключэння эксперта або сумненняў у яго правільнасці можа быць назначана паўторная экспертыза, якая даручаецца іншаму эксперту або іншым экспертам.

Артыкул 78. **Рэчавыя доказы**

Рэчавымі доказамі з'яўляюцца прадметы, якія былі сродкамі злачынства або захавалі на сабе сляды злачынства, або

былі аб'ектамі злачынных дзеянняў абвінавачваемага, а таксама грошы і іншыя каштоўнасці, нажытыя злачынным шляхам, і ўсе іншыя прадметы, якія могуць з'яўляцца сродкамі да выяўлення злачынства, устанаўлення фактычных акалічнасцей справы, выяўлення вінаватых або да абвяржэння абвінавачання ці змякчэння віны абвінавачваемага.

Артыкул 79. **Захоўванне рэчавых доказаў**

Рэчавыя доказы павінны быць падрабязна апісаны ў пратаколах агляду, па магчымасці сфатаграфаваны і далучаны да справы асобнай пастановай асобы, якая праводзіць дазнанне, следчага, пракурора або вызначэннем суда. Рэчавыя доказы павінны захоўвацца пры крымінальнай справе.

Калі тыя ці іншыя прадметы з-за іх груваcткасці або іншых прычын не могуць захоўвацца пры крымінальнай справе, яны павінны быць па магчымасці сфатаграфаваны, апячатаны і захоўвацца ў месцы, указаным асобай, якая праводзіць дазнанне, следчым, пракурорам, судом, аб чым у справе павінна быць адпаведная даведка.

Пры перадачы справы ад органа дазнання следчаму або ад аднаго органа дазнання альбо следчага другому, а таксама пры накіраванні справы пракурору і ў суд альбо пры перадачы справы з аднаго суда ў другі рэчавыя доказы перадаюцца разам са справай, за выключэннем выпадку, прадугледжанага часткай другой гэтага артыкула.

Артыкул 80. **Тэрміны захоўвання рэчавых доказаў**

Рэчавыя доказы захоўваюцца да ўступлення прыгавору ў законную сілу або да заканчэння тэрміну на абскарджанне пастановы або вызначэння аб спыненні справы. У тых выпадках, калі спрэчка аб праве на рэч падлягае вырашэнню ў парадку грамадзянскага судаводства, рэчавыя доказы захоўваюцца да ўступлення ў законную сілу рашэння суда.

У асобных выпадках рэчавыя доказы могуць быць вернуты іх уладальнікам і да заканчэння тэрмінаў, указаных у частцы першай гэтага артыкула, калі гэта магчыма без шкоды для судаводства па справе.

Рэчавыя доказы, якія падвяргаюцца хуткаму псаванню, калі не могуць быць вернуты ўладальніку, здаюцца ў адпаведныя ўстановы для выкарыстання па прызначэнню. Пры неабходнасці яны кампенсуюцца ўладальніку прадметамі таго ж роду і якасці або яму выплачваецца іх кошт.

**Артыкул 81. Меры, якія прымаюцца ў адносінах да рэчавых доказаў пры вырашэнні крымінальнай справы**

У прыгаворы, вызначэнні або пастанове аб спыненні справы павінна быць вырашана пытанне аб рэчавых доказах. Пры гэтым:

1) сродкі злачынства, якія належаць абвінавачваемаму, падлягаюць канфіскацыі і перадаюцца ў адпаведныя ўстановы або знішчаюцца;

2) рэчы, забароненыя да абарачэння, падлягаюць перадачы ў адпаведныя ўстановы або знішчаюцца;

3) рэчы, якія не маюць ніякай каштоўнасці і не могуць быць выкарыстаны, падлягаюць знішчэнню, а ў выпадках хадайніцтва зацікаўленых асоб або ўстаноў могуць быць выдадзены ім;

4) грошы і іншыя каштоўнасці, нажытыя злачынным шляхам, па прыгавору суда падлягаюць перадачы ў даход дзяржавы; астатнія рэчы выдаюцца законным уладальнікам, а пры неўстанаўленні апошніх пераходзяць ва ўласнасць дзяржавы. У выпадку спрэчкі аб прыналежнасці гэтых рэчаў, спрэчка гэтая падлягае вырашэнню ў парадку грамадзянскага судаводства;

5) дакументы, якія з'яўляюцца рэчавымі доказамі, застаюцца пры справе на працягу ўсяго тэрміну захоўвання апошняй або перадаюцца зацікаўленым установам.

**Артыкул 82. Пратаколы следчых і судовых дзеянняў**

Пратаколы, якія засведчваюць акалічнасці і факты, устаноўленыя пры аглядзе, агледжанні, выняцці, вобыску, затрыманні, прад'яўленні для апазнання, а таксама пры правядзенні следчага эксперыменту, складзеныя ў парадку, прадугледжаным гэтым Кодэксам, з'яўляюцца доказам па крымінальнай справе.

**Артыкул 83. Дакументы**

Дакументы з'яўляюцца доказамі, калі акалічнасці і факты, засведчаныя або выкладзеныя ўстановамі, прадпрыемствамі, арганізацыямі, службовымі асобамі і грамадзянамі, маюць значэнне для крымінальнай справы.

У выпадках, калі дакументы маюць адзнакі, указаныя ў артыкуле 78 гэтага Кодэкса, яны з'яўляюцца рэчавымі доказамі.

ГЛАВА 7
## МЕРЫ СТРЫМАННЯ

Артыкул 84. **Ужыванне мер стрымання**

Пры наяўнасці дастатковых падстаў меркаваць, што абвінавачваемы, знаходзячыся на волі, схаваецца ад следства і суда або перашкодзіць устанаўленню ісціны па крымінальнай справе, або будзе займацца злачыннай дзейнасцю, а таксама для забеспячэння выканання прыгавору асоба, якая праводзіць дазнанне, следчы, пракурор і суд маюць права ўжыць у адносінах да абвінавачваемага адну з наступных мер стрымання: падпіску аб нявыездзе, асабістае паручыцельства або паручыцельства грамадскіх арганізацый і калектываў працоўных, узяцце пад варту.

Да ваеннаслужачых можа ўжывацца ў якасці меры стрымання і назіранне за імі камандавання воінскіх часцей, у якіх яны знаходзяцца на службе.

Да непаўналетніх у якасці меры стрымання можа ўжывацца таксама адданне пад нагляд бацькоў, апекуноў або папячыцеляў, а да непаўналетніх, якія выхоўваюцца ў дзіцячых установах, — адданне пад нагляд адміністрацыі гэтых устаноў.

Пры адсутнасці падстаў, якія робяць неабходным ужыванне меры стрымання, у абвінавачваемага адбіраецца абавязацельства з'яўляцца па выкліках і паведамляць аб перамене месца пражывання.

Артыкул 85. **Ужыванне меры стрымання да прад'яўлення абвінавачання**

У выключных выпадках мера стрымання можа быць ужыта ў адносінах да асобы, якая падазраецца ва ўчыненні злачынства, і да прад'яўлення ёй абвінавачання. У гэтым выпадку абвінавачанне павінна быць прад'яўлена не пазней дзесяці сутак з моманту ўжывання меры стрымання. Калі ў гэты тэрмін абвінавачанне не будзе прад'яўлена, мера стрымання адмяняецца.

Асоба, узятая пад варту да прад'яўлення ёй абвінавачання, мае права: абскардзіць дзеянні асобы, якая праводзіць дазнанне, следчага або пракурора, даваць тлумачэнні і заяўляць хадайніцтвы.

Артыкул 86. **Акалічнасці, якія ўлічваюцца пры абранні меры стрымання**

Пры вырашэнні пытання аб неабходнасці ўжыць меру стрымання, а таксама аб абранні той ці іншай з іх асоба, якая пра-

водзіць дазнанне, следчы, пракурор і суд улічваюць, апрача акалічнасцей, указаных у артыкуле 84 гэтага Кодэкса, таксама цяжкасць учыненага злачынства, асобу падазраваемага або абвінавачваемага, род яго заняткаў, узрост, стан здароўя, сямейнае становішча і іншыя акалічнасці.

Артыкул 87. **Пастанова і вызначэнне аб ужыванні меры стрымання**

Аб ужыванні меры стрымання асоба, што праводзіць дазнанне, следчы, пракурор выносяць матываваную пастанову, а суд — матываванае вызначэнне, дзе ёсць указанне на злачынства, у якім падазраецца або абвінавачваецца даная асоба, і падстава для абрання ўжытай меры стрымання. Пастанова або вызначэнне аб'яўляецца асобе, у адносінах да якой яно вынесена.

Артыкул 88. **Падпіска аб нявыездзе**

Падпіска аб нявыездзе заключаецца ў адабранні ад падазраваемага або абвінавачваемага абавязацельства не адлучацца з месца пражывання або часовага знаходжання без дазволу асобы, якая праводзіць дазнанне, следчага, пракурора і суда.

У выпадку парушэння падазраваемым або абвінавачваемым данай ім падпіскі можа быць ужыта больш строгая мера стрымання, аб чым яму павінна быць аб'яўлена пры адабранні падпіскі.

Артыкул 89. **Асабістае паручыцельства**

Асабістае паручыцельства заключаецца ў прыняцці на сябе заслугоўваючымі давер'я асобамі пісьмовага абавязацельства ў тым, што яны ручаюцца за тое, што падазраваемы або абвінавачваемы, знаходзячыся на волі, не схаваецца ад следства і суда, не будзе перашкаджаць устанаўленню ісціны па крымінальнай справе і не будзе займацца злачыннай дзейнасцю. Колькасць паручыцеляў не можа быць менш двух.

Пры адабранні падпіскі аб асабістым паручыцельстве паручыцелю павінна быць паведамлена аб сутнасці справы, па якой абрана даная мера стрымання, і аб адказнасці ў выпадку ўчынення падазраваемым або абвінавачваемым дзеянняў, для папярэджання якіх была ўжыта мера стрымання ў выглядзе асабістага паручыцельства. У гэтым выпадку на кожнага паручыцеля можа быць накладзена судом грашовае спагнанне ў размеры да 100 рублёў у парадку, прадугледжаным артыку-

лам 267 гэтага Кодэкса, або ўжыты меры грамадскага ўздзеяння.

### Артыкул 90. Паручыцельства грамадскай арганізацыі або калектыву працоўных

Паручыцельства грамадскай арганізацыі або калектыву працоўных заключаецца ў дачы пісьмовага абавязацельства ў тым, што грамадская арганізацыя або калектыў працоўных ручаюцца за належныя паводзіны і яўку падазраваемага або абвінавачваемага па выкліках асобы, якая праводзіць дазнанне, следчага, пракурора і суда.

Грамадскай арганізацыі або калектыву працоўных, якія даюць паручыцельства, павінна быць паведамлена аб сутнасці справы, па якой абрана даная мера стрымання.

### Артыкул 91. Узяцце пад варту

Узяцце пад варту ў якасці меры стрымання ўжываецца з захаваннем патрабаванняў артыкула 7 гэтага Кодэкса толькі па справах аб злачынствах, за якія законам прадугледжана пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі.

Да асоб, абвінавачваемых ва ўчыненні злачынстваў, прадугледжаных артыкуламі 61—71, 72, часткай другой, 74—76, 78, 81, 82, часткай першай, 83—85, 87, часткамі другой і трэцяй, 88, часткамі другой і трэцяй, 89, 90, часткай трэцяй, 91, часткай трэцяй, 96, часткай другой, 100, 101, 106, 115, 117, часткай другой, 119, часткай другой, 141, часткамі другой і трэцяй, 142, часткамі другой і трэцяй, 143, 144, часткай трэцяй, 146, часткай другой, 151, часткай другой, 169, часткай другой, 172, часткай другой, 173, часткай другой, 175, часткай другой, 227, пунктамі «б» і «в», 229, пунктамі «б» і «в», 231, пунктам «б», 236, пунктамі «б» і «г», 237, 238, пунктам «б», 240, пунктам «в», 244, пунктам «е», 246, пунктам «г», 248, пунктам «в», 250, 251, пунктам «б», 252—256 Крымінальнага кодэкса Беларускай ССР, узяцце пад варту ў якасці меры стрымання можа быць ужыта па матывах адной толькі небяспекі злачынства.

Непаўналетнія, падвергнутыя затрыманню або папярэдняму зняволенню, павінны ўтрымлівацца асобна ад дарослых і ад асуджаных непаўналетніх.

### Артыкул 92. Тэрміны ўтрымання пад вартай

Утрыманне пад вартай пры расследаванні справы не можа працягвацца больш чым два месяцы. Гэты тэрмін можа быць прадоўжан толькі з прычыны асаблівай складанасці справы

пракурорам вобласці, ваенным пракурорам ваеннай акругі, ваеннага флоту — да трох месяцаў, а Пракурорам Беларускай ССР і Галоўным ваенным пракурорам — да шасці месяцаў з дня ўзяцця пад варту. Далейшае прадоўжанне тэрміну ўтрымання пад вартай можа быць праведзена толькі ў выключных выпадках Генеральным Пракурорам СССР дадаткова на тэрмін не больш чым тры месяцы.

Артыкул 93. **Меры апекі дзяцей і аховы маёмасці ўзятага пад варту**

Асоба, якая праводзіць дазнанне, следчы, пракурор і суд абавязаны:

1) пры наяўнасці ў асобы, узятай пад варту, непаўналетніх дзяцей, якія застаюцца без нагляду,— перадаць іх пад апеку сваякоў або іншых асоб або ўстаноў;

2) пры наяўнасці ў асобы, узятай пад варту, маёмасці або жылля, якое застаецца без нагляду,— прыняць меры да іх аховы.

Аб прынятых мерах асоба, якая праводзіць дазнанне, следчы, пракурор і суд паведамляюць узятаму пад варту.

Артыкул 94. **Паведамленне аб узяцці абвінавачваемага пад варту**

Аб абранні ў якасці меры стрымання ўзяцця пад варту асоба, якая праводзіць дазнанне, следчы, пракурор і суд паведамляюць па месцы работы і сям'і абвінавачваемага. Копія пастановы або вызначэння аб узяцці пад варту пасылаецца ў месца зняволення.

Артыкул 95. **Спатканне з арыштаваным**

Па просьбе блізкіх сваякоў абвінавачваемага следчы, пракурор і суддзя могуць дазволіць ім спатканне з арыштаваным.

Артыкул 96. **Назіранне камандавання воінскай часці**

Назіранне камандавання воінскай часці за абвінавачваемым, які з'яўляецца ваеннаслужачым, заключаецца ў прыняцці мер, прадугледжаных статутамі Узброеных Сіл Саюза ССР для таго, каб забяспечыць належныя паводзіны і яўку абвінавачваемага па выкліках асобы, якая праводзіць дазнанне, следчага, пракурора і суда.

Камандаванню воінскай часці паведамляецца аб сутнасці справы, па якой абрана даная мера стрымання.

Аб устанаўленні назірання камандаванне воінскай часці

ў пісьмовай форме паведамляе органу, які абраў гэтую меру стрымання.

Артыкул 97. **Аддача непаўналетніх пад нагляд**

Аддача пад нагляд бацькоў, апекуноў, папячыцеляў, адміністрацыі дзіцячых устаноў заключаецца ў прыняцці на сябе кім-небудзь з указаных асоб пісьмовага абавязацельства забяспечыць яўку непаўналетняга да следчага і ў суд, а таксама яго належныя паводзіны.

Пры адабранні падпіскі аб прыняцці непаўналетняга пад нагляд бацькам, апекунам, папячыцелям, кіраўнікам дзіцячых устаноў павінна быць паведамлена аб сутнасці справы, па якой абрана даная мера стрымання, і аб іх адказнасці ў выпадку парушэння прынятага на сябе абавязацельства.

Да бацькоў, апекуноў, папячыцеляў, якім быў аддадзены пад нагляд непаўналетні, у выпадку парушэння імі прынятага абавязацельства ўжываюцца меры, прадугледжаныя часткай другой артыкула 89 гэтага Кодэкса.

Артыкул 98. **Адмена або змяненне меры стрымання**

Мера стрымання адмяняецца, калі ў ёй адпадае далейшая неабходнасць, або змяняецца на больш строгую або больш мяккую, калі гэта выклікаецца акалічнасцямі справы. Адмена або змяненне меры стрымання праводзіцца матываванай пастановай асобы, якая праводзіць дазнанне, следчага або пракурора, а пасля перадачы справы ў суд — матываваным вызначэннем суда.

Адмена або змяненне асобай, якая праводзіць дазнанне, і следчым меры стрымання, абранай па ўказанню пракурора, дапускаецца толькі з санкцыі пракурора.

## ГЛАВА 8

## ПРАТАКОЛЫ, ТЭРМІНЫ І СУДОВЫЯ ВЫДАТКІ

Артыкул 99. **Абавязковасць вядзення пратакола**

Пры правядзенні следчых дзеянняў, а таксама ў распарадчых і судовых пасяджэннях судоў першай інстанцыі абавязкова вядуцца пратаколы.

Пратакол павінен мець указанне на месца і дату правядзення працэсуальнага дзеяння з абазначэннем часу яго пачатку і заканчэння і на асоб, якія прымалі ўдзел у яго пра-

вядзенні. У пратаколе выкладаюцца працэсуальныя дзеянні ў тым парадку, у якім яны мелі месца, выяўленыя пры іх правядзенні істотныя для справы акалічнасці, а таксама заявы асоб, што ўдзельнічалі пры правядзенні гэтых дзеянняў.

Пратакол падпісваецца асобамі, указанымі ў адпаведных артыкулах гэтага Кодэкса. Усе ўнесеныя ў пратакол змяненні, дапаўненні і выпраўленні павінны быць агавораны і засведчаны подпісамі гэтых асоб.

Артыкул 100. **Вылічэнне тэрмінаў**

Тэрміны, устаноўленыя гэтым Кодэксам, вылічваюцца гадзінамі, суткамі і месяцамі. Пры вылічэнні тэрмінаў не прымаецца ў разлік тая гадзіна і суткі, якімі пачынаецца цячэнне тэрмінаў.

Пры вылічэнні тэрмінаў суткамі тэрмін канчаецца ў дваццаць чатыры гадзіны апошніх сутак.

Пры вылічэнні тэрмінаў месяцамі тэрмін канчаецца ў адпаведнае чысло апошняга месяца, а калі гэты месяц не мае адпаведнага чысла, тэрмін заканчваецца ў апошнія суткі гэтага месяца.

Калі заканчэнне тэрміну прыпадае на нерабочы дзень, то апошнім днём тэрміну лічыцца першы наступны за тым рабочы дзень.

Тэрмін не лічыцца прапушчаным, калі скарга або іншы дакумент здадзены да заканчэння тэрміну на пошту, а для асоб, якія ўтрымліваюцца пад вартай,— калі скарга або іншы дакумент здадзены да заканчэння тэрміну адміністрацыі месца зняволення.

Артыкул 101. **Аднаўленне прапушчанага тэрміну**

Прапушчаны па ўважлівай прычыне тэрмін павінен быць адноўлен пастановай асобы, якая праводзіць дазнанне, следчага, пракурора або вызначэннем суда, у вядзенні якога знаходзіцца справа.

Па хадайніцтву зацікаўленай асобы выкананне рашэння, абскарджанага з пропускам устаноўленага тэрміну, можа быць прыпынена да вырашэння пытання аб аднаўленні прапушчанага тэрміну.

Артыкул 102. **Судовыя выдаткі**

Судовыя выдаткі складаюцца:

1) з сум, якія выплачваюцца сведкам, пацярпеўшым, экспертам, перакладчыкам і панятым;

2) з сум, якія выдаткоўваюцца на захоўванне, перасылку і даследаванне рэчавых доказаў;

3) з іншых расходаў, панесеных пры судаводстве па данай справе.

Артыкул 103. **Пакрыццё сведкам, пацярпеўшым, экспертам, перакладчыкам, панятым панесеных расходаў.**

За асобай, выклікаемай у якасці сведкі, пацярпеўшага, эксперта, перакладчыка і панятога, захоўваецца сярэдні заработак па месцы яе работы за ўвесь час, затрачаны ёю ў сувязі з выклікам да асобы, якая праводзіць дазнанне, следчага, пракурора або ў суд. Асобам, якія не з'яўляюцца рабочымі або служачымі, выплачваецца ўзнагарода за адрыванне іх ад звычайных заняткаў. Акрамя таго, усе ўказаныя асобы маюць права на пакрыццё панесеных расходаў па яўцы.

Эксперт і перакладчык маюць права на ўзнагароду за выкананне сваіх абавязкаў, акрамя тых выпадкаў, калі гэтыя абавязкі выконваліся ў парадку службовага задання.

Пакрыццё расходаў па яўцы і выплата ўзнагароды праводзіцца са сродкаў органаў дазнання, папярэдняга следства і суда. Парадак выплаты і размеры сум, якія падлягаюць выплаце, устанаўліваюцца Саветам Міністраў Беларускай ССР.

Артыкул 104. **Спагнанне судовых выдаткаў**

Судовыя выдаткі ўскладаюцца на асуджаных або прымаюцца за кошт дзяржавы.

У выпадку прызнання падсуднага вінаватым суд мае права спагнаць з яго судовыя выдаткі. Суд можа пры гэтым ускласці судовыя выдаткі і на падсуднага, прызнанага вінаватым, але вызваленага ад пакарання.

Калі па справе прызнаны вінаватымі некалькі падсудных, суд пастанаўляе, у якім размеры павінны быць ускладзены выдаткі на кожнага з іх, улічваючы пры гэтым віну, ступень адказнасці і маёмаснае становішча гэтых асоб.

У выпадку спынення справы або апраўдання падсуднага, а таксама пры неплацежаздольнасці асобы, з якой павінны быць спагнаны судовыя выдаткі, яны прымаюцца на кошт дзяржавы.

Пры апраўданні падсуднага па справе, узбуджаемай не інакш як па скарзе пацярпеўшага, суд мае права ўскласці вы-

даткі поўнасцю або часткова на асобу, па скарзе якой было пачата судаводства па справе.

Пры спыненні справы за прымірэннем пацярпеўшага з абвінавачваемым суд мае права ўскласці выдаткі на абодвух або на аднаго з іх.

# РАЗДЗЕЛ ДРУГІ

# УЗБУДЖЭННЕ КРЫМІНАЛЬНАЙ СПРАВЫ

## ГЛАВА 9

## УЗБУДЖЭННЕ КРЫМІНАЛЬНАЙ СПРАВЫ

### Артыкул 105. Прычыны і падставы да ўзбуджэння крымінальнай справы

Прычынамі да ўзбуджэння крымінальнай справы з'яўляюцца:

1) заявы грамадзян;

2) паведамленні прафсаюзных і камсамольскіх арганізацый, народных дружын па ахове грамадскага парадку, таварыскіх судоў і іншых грамадскіх арганізацый;

3) паведамленні ўстаноў, прадпрыемстваў, арганізацый і службовых асоб;

4) артыкулы, заметкі і пісьмы, апублікаваныя ў друку;

5) яўка з пакаяннем;

6) непасрэднае выяўленне органам дазнання, следчым, пракурорам, суддзёй або судом прыкмет злачынства.

Справа можа быць узбуджана толькі ў тых выпадках, калі ёсць дастатковыя даныя, якія ўказваюць на наяўнасць прыкмет злачынства.

### Артыкул 106. Крымінальныя справы, якія ўзбуджаюцца па скарзе пацярпеўшага

Справы аб злачынствах, прадугледжаных артыкуламі 110, 128, часткай першай і 129 Крымінальнага кодэкса Беларускай ССР, узбуджаюцца не інакш як па скарзе пацярпеўшага і падлягаюць спыненню ў выпадку прымірэння яго з абвінавачваемым. Прымірэнне дапускаецца толькі да ўходу

суда ў дарадчы пакой для пастанаўлення прыгавору. Спыненне гэтых спраў з прычыны малазначнасці не дапускаецца, акрамя выпадкаў, прадугледжаных артыкуламі 48—50 Крымінальнага кодэкса Беларускай ССР.

Справы аб злачынствах, прадугледжаных часткай першай артыкула 115 Крымінальнага кодэкса Беларускай ССР, узбуджаюцца не інакш як па скарзе пацярпеўшай, але спыненню за прымірэннем пацярпеўшай з абвінавачваемым не падлягаюць. Судаводства па гэтых справах вядзецца ў агульным парадку.

У выключных выпадках, калі справа аб якім-небудзь злачынстве, прадугледжаным артыкуламі 110, 128, часткай першай і 129 Крымінальнага кодэкса Беларускай ССР, мае асаблівае грамадскае значэнне або калі пацярпеўшы з прычыны бездапаможнага стану, залежнасці ад абвінавачваемага або па іншых прычынах не можа абараняць свае правы і законныя інтарэсы, пракурор мае права ўзбудзіць такую справу і пры адсутнасці скаргі пацярпеўшага. Справа, узбуджаная пракурорам, накіроўваецца для правядзення дазнання або папярэдняга следства, а пасля заканчэння расследавання вырашаецца ў агульным парадку. Такая справа спыненню за прымірэннем пацярпеўшага з абвінавачваемым не падлягае.

Пракурор мае права ў любы момант уступіць ва ўзбуджаную суддзёй па скарзе пацярпеўшага справу аб злачынствах, прадугледжаных артыкуламі 110, 128, часткай першай і 129 Крымінальнага кодэкса Беларускай ССР, і падтрымліваць абвінавачанне ў судзе, калі гэтага патрабуе ахова дзяржаўных або грамадскіх інтарэсаў або правоў грамадзян. У гэтым выпадку справа спыненню за прымірэннем пацярпеўшага з абвінавачваемым не падлягае.

### Артыкул 107. **Заявы і паведамленні аб злачынстве**

Заявы грамадзян могуць быць вусныя і пісьмовыя.

Вусныя заявы заносяцца ў пратакол, які падпісваецца заяўшчыкам і службовай асобай органаў дазнання, следчым, пракурорам або суддзёй, прыняўшым заяву. Пісьмовая заява павінна быць падпісана асобай, ад якой яна зыходзіць.

Заяўшчыку павінна быць растлумачана адказнасць за заведама ілжывы данос, што павінна быць засведчана подпісам заяўшчыка.

Паведамленні ўстаноў, прадпрыемстваў, арганізацый і службовых асоб павінны быць зроблены ў пісьмовай форме.

Артыкул 108. **Абавязковасць разгляду заяў і паведамленняў аб злачынстве**

Пракурор, следчы, орган дазнання і суддзя абавязаны прымаць заявы і паведамленні аб любым учыненым або падрыхтоўваемым злачынстве і прымаць па іх рашэнні ў тэрмін не больш як трое сутак з дня атрымання заявы або паведамлення, а ў выключных выпадках — у тэрмін не больш як дзесяць сутак.

Па паступіўшых заявах і паведамленнях могуць быць запатрабаваны неабходныя матэрыялы і атрыманы тлумачэнні, аднак без правядзення следчых дзеянняў, прадугледжаных гэтым Кодэксам.

Па паступіўшай заяве або паведамленню павінна быць прынята адно з наступных рашэнняў:

1) аб узбуджэнні крымінальнай справы;

2) аб адмове ва ўзбуджэнні крымінальнай справы;

3) аб перадачы заявы або паведамлення па падследнасці або падсуднасці.

Аб прынятым рашэнні паведамляецца заяўшчыку.

Да ўзбуджэння справы аб злачынствах, прадугледжаных артыкуламі 110, 128, часткай першай і 129 Крымінальнага кодэкса Беларускай ССР, суддзя прымае меры да прымірэння пацярпеўшага з асобай, на якую пададзена скарга. Калі прымірэнне не адбылося, суддзя пры наяўнасці дастатковых даных выносіць пастанову аб узбуджэнні справы і адданні пад суд асобы, на якую пададзена скарга.

Сустрэчныя скаргі могуць быць аб'яднаны суддзёй у адным судаводстве.

Артыкул 109. **Яўка з пакаяннем**

У выпадку яўкі з пакаяннем устанаўліваецца асоба, што з'явілася, і складаецца пратакол, у якім падрабязна выкладаецца зробленая заява. Пратакол падпісваецца тым, хто з'явіўся з пакаяннем, і службовай асобай, склаўшай пратакол.

Артыкул 110. **Парадак узбуджэння крымінальнай справы**

Пры наяўнасці прычыны і падставы да ўзбуджэння крымінальнай справы пракурор, следчы, орган дазнання, суддзя, суд абавязаны ў межах сваёй кампетэнцыі ўзбудзіць крымінальную справу.

Аб узбуджэнні крымінальнай справы пракурор, следчы,

орган дазнання, суддзя выносяць пастанову, а суд — вызначэнне. У пастанове, вызначэнні павінны быць указаны час, месца, кім яна складзена, прычыны і падстава да ўзбуджэння справы, артыкул крымінальнага закону, па прыкметах якога яна ўзбуджаецца, а таксама далейшы напрамак справы.

Копія пастановы аб узбуджэнні крымінальнай справы, вынесенай следчым або органам дазнання, неадкладна накіроўваецца пракурору.

Адначасова з узбуджэннем крымінальнай справы павінны быць прыняты меры да прадухілення або стрымання злачынства, а таксама да замацавання слядоў злачынства.

### Артыкул 111. **Адмова ва ўзбуджэнні крымінальнай справы**

У выпадку адсутнасці падстаў да ўзбуджэння крымінальнай справы, а таксама пры наяўнасці акалічнасцей, якія выключаюць судаводства па справе, пракурор, следчы, орган дазнання, суддзя, суд адмаўляюць ва ўзбуджэнні крымінальнай справы.

Калі ў атрыманай заяве або паведамленні ёсць даныя аб адміністрацыйным або дысцыплінарным учынку або іншым парушэнні грамадскага парадку і правіл сацыялістычнага супольнага жыцця, пракурор, следчы, орган дазнання, суддзя, суд маюць права накіроўваць паступіўшую заяву або паведамленне на разгляд грамадскай арганізацыі, таварыскаму суду, калектыву працоўных або перадаць атрыманы матэрыял на вырашэнне ў адміністрацыйным або дысцыплінарным парадку.

Аб адмове ва ўзбуджэнні крымінальнай справы выносіцца матываваная пастанова, вызначэнне, аб чым паведамляецца асобе, установе, прадпрыемству або грамадскай арганізацыі, ад якіх паступіла заява або паведамленне, і растлумачваецца ім права на абскарджанне гэтай пастановы.

Адмова ва ўзбуджэнні крымінальнай справы можа быць абскарджана заяўшчыкам адпаведна належнаму пракурору або ў вышэйстаячы суд.

### Артыкул 112. **Накіраванне заявы або паведамлення па падследнасці або падсуднасці**

Пракурор, следчы, орган дазнання, суддзя могуць, не ўзбуджаючы крымінальнай справы, накіраваць атрыманую заяву або паведамленне па падследнасці або падсуднасці. У неабходных выпадках яны абавязаны прыняць меры да

прадухілення або стрымання злачынства, а таксама да захавання слядоў злачынства.

Артыкул 113. **Накіраванне справы пасля яе ўзбуджэння**

Пасля ўзбуджэння крымінальнай справы:

1) пракурор накіроўвае справу для правядзення папярэдняга следства або дазнання;

2) следчы пачынае правядзенне папярэдняга следства, а орган дазнання — правядзенне дазнання;

3) суддзя накіроўвае справу для правядзення папярэдняга следства або дазнання альбо прымае справу да разгляду яе судом.

Артыкул 114. **Нагляд пракурора за законнасцю ўзбуджэння крымінальнай справы**

Пракурор ажыццяўляе нагляд за законнасцю ўзбуджэння крымінальнай справы.

Калі справа ўзбуджана следчым або органам дазнання без законных прычын і падстаў, пракурор сваёй пастановай адмяняе пастанову следчага або органа дазнання, адмаўляючы ва ўзбуджэнні крымінальнай справы, альбо спыняе справу, калі па ёй былі праведзены следчыя дзеянні.

У выпадку беспадстаўнасці адмовы ва ўзбуджэнні справы пракурор сваёй пастановай адмяняе прынятую аб гэтым пастанову следчага або органа дазнання і ўзбуджае справу.

Калі справа ўзбуджана пастановай суддзі або вызначэннем суда без законных прычын і падстаў, а таксама ў выпадку беспадстаўнасці адмовы ва ўзбуджэнні справы пастановай суддзі або вызначэннем суда пракурор абавязан падаць пратэст у вышэйстаячы суд.

## РАЗДЗЕЛ ТРЭЦІ

## ДАЗНАННЕ І ПАПЯРЭДНЯЕ СЛЕДСТВА

### ГЛАВА 10

### ДАЗНАННЕ

Артыкул 115. **Органы дазнання**

Органамі дазнання з'яўляюцца:

1) органы міліцыі;

2) камандзіры воінскіх часцей, злучэнняў і начальнікі ваенных устаноў — па справах аб усіх злачынствах, учыненых падпарадкаванымі ім ваеннаслужачымі, а таксама ваеннаабавязанымі ў час праходжання імі вучэбных збораў; па справах аб злачынствах, учыненых рабочымі і служачымі Узброеных Сіл у сувязі з выкананнем службовых абавязкаў або ў размяшчэнні часці, злучэння, установы;

3) органы дзяржаўнай бяспекі — па справах, аднесеных законам да іх кампетэнцыі;

4) начальнікі папраўча-працоўных устаноў — па справах аб злачынствах супроць устаноўленага парадку нясення службы, учыненых супрацоўнікамі гэтых устаноў, а таксама па справах аб злачынствах, учыненых у размяшчэнні папраўча-працоўнай установы;

5) органы дзяржаўнага пажарнага нагляду — па справах аб пажарах і парушэнні проціпажарных правіл;

6) органы пагранічнай аховы — па справах аб парушэнні дзяржаўнай граніцы.

Артыкул 116. **Дзейнасць органаў дазнання па справах, па якіх правядзенне папярэдняга следства абавязкова**

Пры наяўнасці прыкмет злачынства, па якому правядзенне папярэдняга следства абавязкова, орган дазнання ўзбуджае крымінальную справу і, кіруючыся правіламі крымінальна-працэсуальнага закону, праводзіць неадкладныя следчыя дзеянні па ўстанаўленню і замацаванню слядоў злачынства: агляд, вобыск, выняцце, агледжанне, затрыманне і допыт падазраваемых, допыт пацярпеўшых і сведак.

Аб выяўленым злачынстве і пачатым дазнанні орган дазнання неадкладна паведамляе пракурору.

Пасля выканання неадкладных следчых дзеянняў орган дазнання, не чакаючы ўказанняў пракурора і заканчэння тэрміну, прадугледжанага часткай першай артыкула 118 гэтага Кодэкса, абавязан перадаць справу следчаму.

Пасля перадачы справы следчаму орган дазнання можа праводзіць па ёй следчыя і вышукныя дзеянні толькі па даручэнню следчага. У выпадку перадачы следчаму справы, па якой не было магчыма выявіць асобу, што ўчыніла злачынства, орган дазнання працягвае прымаць аператыўна-вышукныя меры для ўстанаўлення злачынцы, паведамляючы следчаму аб выніках.

Артыкул 117. **Дзейнасць органаў дазнання па справах, па якіх правядзенне папярэдняга следства не абавязкова**

Па справах, па якіх правядзенне папярэдняга следства не абавязкова, орган дазнання ўзбуджае справу і прымае ўсе прадугледжаныя крымінальна-працэсуальным законам меры для ўстанаўлення акалічнасцей, якія падлягаюць даказванню па крымінальнай справе.

Пры правядзенні дазнання па справах, па якіх папярэдняе следства не абавязкова, орган дазнання кіруецца правіламі, устаноўленымі гэтым Кодэксам для папярэдняга следства, за наступнымі выключэннямі:

1) пры правядзенні дазнання абаронца не ўдзельнічае;

2) пацярпеўшаму, грамадзянскаму істцу, грамадзянскаму адказчыку і іх прадстаўнікам паведамляецца аб заканчэнні дазнання і накіраванні справы пракурору, але матэрыялы справы для азнаямлення ім не прад'яўляюцца;

3) на органы дазнання не пашыраюцца правілы, устаноўленыя часткай другой артыкула 44 гэтага Кодэкса. Пры нязгодзе з указаннямі пракурора орган дазнання мае права абскардзіць іх вышэйстаячаму пракурору, не прыпыняючы выкананне гэтых указанняў.

Па справах, па якіх правядзенне папярэдняга следства не абавязкова, матэрыялы дазнання з'яўляюцца падставай для разгляду справы ў судзе.

Артыкул 118. **Тэрмін правядзення дазнання**

Па справах, па якіх правядзенне папярэдняга следства абавязкова, дазнанне павінна быць закончана не пазней чым праз дзесяць сутак з дня ўзбуджэння справы.

Па справах, па якіх правядзенне папярэдняга следства не абавязкова, дазнанне павінна быць закончана не пазней аднаго месяца з дня ўзбуджэння крымінальнай справы, уключаючы ў гэты тэрмін складанне абвінаваўчага заключэння альбо пастановы аб спыненні або прыпыненні справы.

Тэрмін дазнання, устаноўлены часткай другой гэтага артыкула, можа быць прадоўжан пракурорам, які ажыццяўляе нагляд за правядзеннем дазнання, але не больш чым на адзін месяц.

У выключных выпадках тэрмін правядзення дазнання па справе можа быць прадоўжан па правілах, устаноўленых артыкулам 140 гэтага Кодэкса.

Артыкул 119. **Затрыманне падазраваемага ва ўчыненні злачынства**

Орган дазнання мае права затрымаць асобу, падазраваемую ва ўчыненні злачынства, за якое можа быць назначана пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі, толькі пры наяўнасці адной з наступных падстаў:

1) калі гэтую асобу засталі пры ўчыненні злачынства або непасрэдна пасля яго ўчынення;

2) калі відавочцы, у тым ліку і пацярпеўшыя, прама пакажуць на даную асобу, як на ўчыніўшую злачынства;

3) калі на падазраваемым або на яго адзенні, пры ім або ў яго жыллі будуць выяўлены яўныя сляды злачынства.

Пры наяўнасці іншых даных, якія даюць падставу падазраваць асобу ва ўчыненні злачынства, яна можа быць затрымана толькі ў тым выпадку, калі гэтая асоба зрабіла спробу на пабег, або калі яна не мае пастаяннага месца пражывання, або калі не ўстаноўлена асоба падазраваемага.

Асоба, затрыманая па падазрэнню ва ўчыненні злачынства, мае права абскардзіць дзеянні асобы, якая праводзіць дазнанне, следчага або пракурора, даваць тлумачэнні і заяўляць хадайніцтвы.

Аб усякім выпадку затрымання асобы, падазраваемай ва ўчыненні злачынства, орган дазнання абавязан скласці пратакол з указаннем падстаў і матываў затрымання і на працягу дваццаці чатырох гадзін зрабіць аб гэтым паведамленне пракурору. На працягу сарака васьмі гадзін з моманту атрымання паведамлення аб зробленым затрыманні пракурор абавязан даць санкцыю на ўзяцце пад варту альбо вызваліць затрыманага.

Артыкул 120. **Выклік і допыт падазраваемага**

Выклік і допыт падазраваемага робіцца з захаваннем правілаў, устаноўленых артыкуламі 144 — 146 і 149—153 гэтага Кодэкса.

Калі падазраваемы быў затрыманы або ў адносінах да яго абрана мера стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту, яго допыт праводзіцца неадкладна. Аднак, калі правесці допыт неадкладна немагчыма, падазраваемы павінен быць дапытаны не пазней дваццаці чатырох гадзін з моманту затрымання.

Артыкул 121. **Скончэнне або прыпыненне дазнання**

Дазнанне па справах, па якіх вядзенне папярэдняга следства абавязкова, заканчваецца складаннем пастановы аб накіраванні справы следчаму.

Дазнанне па справах, па якіх вядзенне папярэдняга следства не абавязкова, заканчваецца складаннем абвінаваўчага заключэння або пастановай аб спыненні справы. Пры наяўнасці адной з падстаў, прадугледжаных артыкулам 208 гэтага Кодэкса, орган дазнання спыняе справу матываванай пастановай, копія якой у сутачны тэрмін накіроўваецца пракурору. У астатніх выпадках складаецца абвінаваўчае заключэнне, якое з усімі матэрыяламі дазнання прадстаўляецца пракурору для зацвярджэння.

Пры наяўнасці адной з падстаў, прадугледжаных артыкулам 194 гэтага Кодэкса, орган дазнання мае права прыпыніць судаводства па справе, па якой папярэдняе следства не абавязкова. Аб прыпыненні дазнання выносіцца пастанова, копія якой у сутачны тэрмін накіроўваецца пракурору.

## ГЛАВА 11

## АГУЛЬНЫЯ УМОВЫ ВЯДЗЕННЯ ПАПЯРЭДНЯГА СЛЕДСТВА

Артыкул 122. **Органы папярэдняга следства**

Папярэдняе следства па крымінальных справах праводзіцца следчымі пракуратуры, а па справах аб злачынствах, прадугледжаных артыкуламі 61—67, 69, 70 і 76 Крымінальнага кодэкса Беларускай ССР, — таксама следчымі органаў дзяржаўнай бяспекі.

Артыкул 123. **Крымінальныя справы, па якіх правядзенне папярэдняга следства абавязкова**

Папярэдняе следства абавязкова па справах аб злачынствах, прадугледжаных артыкуламі 61—86[1], 87, часткамі другой і трэцяй, 88, часткамі другой і трэцяй, 89, 90, часткамі другой і трэцяй, 91, 93, 96, часткай другой, 97, 100—106, 108, 109, 113—119, 122—127, 128, часткамі другой і трэцяй, 130—139, 143, 146, часткай другой, 148—150, 152, 153, часткай другой, 154, 158, 166—176, 179, 180, 185—187, 189, 191, часткай другой, 198, 205, 206, часткай другой, 207, часткай

другой, 208—211, 212, часткай другой, 216, 221, 226—258 Крымінальнага кодэкса Беларускай ССР, а таксама па ўсіх справах аб злачынствах, учыненых непаўналетнімі або асобамі, якія з прычыны сваіх фізічных або псіхічных недахопаў не могуць самі ажыццяўляць сваё права на абарону.

Па справах аб іншых, акрамя вышэйпералічаных, злачынствах папярэдняе следства праводзіцца ў тых выпадках, калі гэта прызнаюць неабходным суд, пракурор або следчы (Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР ад 7 сакавіка 1961 г.).

Артыкул 124. **Прыцягненне грамадскасці да ўдзелу ў раскрыцці злачынстваў**

Праводзячы расследаванне, следчы шырока выкарыстоўвае дапамогу грамадскасці для раскрыцця злачынстваў і для адшукання асоб, якія іх учынілі, а таксама для выяўлення і ліквідацыі прычын і ўмоў, якія садзейнічалі ўчыненню злачынстваў.

Артыкул 125. **Пачатак правядзення папярэдняга следства**

Папярэдняе следства праводзіцца толькі пасля ўзбуджэння крымінальнай справы і ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

Следчы абавязан неадкладна пачаць правядзенне следства па ўзбуджанай ім або перададзенай яму справе. Калі крымінальная справа ўзбуджана следчым і прынята ім да свайго вядзення, то складаецца адзіная пастанова аб узбуджэнні крымінальнай справы і прыняцці яе да свайго вядзення. У выпадку прыняцця да свайго вядзення справы, узбуджанай пракурорам або судом, следчы выносіць асобную пастанову аб прыняцці справы да свайго вядзення. Копіі гэтых пастаноў следчы не пазней дваццаці чатырох гадзін накіроўвае пракурору.

У выпадку складанасці справы або яе вялікага аб'ёму папярэдняе следства можа быць даручана некалькім следчым. Аб гэтым указваецца ў пастанове аб узбуджэнні справы або выносіцца асобная пастанова. Адзін са следчых прымае справу да вядзення і кіруе дзеяннямі іншых следчых. У гэтым выпадку падазраваемаму, абвінавачваемаму, пацярпеўшаму, грамадзянскаму істцу і грамадзянскаму адказчыку пры растлумачэнні права на адвод аб'яўляецца ўвесь склад следчых.

Артыкул 126. **Злучэнне і выдзяленне крымінальных спраў**

Могуць быць злучаны ў адным вядзенні толькі справы па абвінавачанню некалькіх асоб у саўдзеле ва ўчыненні аднаго або некалькіх злачынстваў або справы па абвінавачанню адной асобы ва ўчыненні некалькіх злачынстваў, а таксама ў загадзя не абяцаным укрывальніцтве гэтых жа злачынстваў і неданясенні аб іх.

Выдзяленне справы дапускаецца толькі ў выпадках, якія выкліканы неабходнасцю, калі гэта не адаб'ецца на ўсебаковасці, паўнаце і аб'ектыўнасці даследавання і вырашэння справы.

Злучэнне і выдзяленне спраў праводзіцца па пастанове следчага або пракурора.

Артыкул 127. **Месца правядзення папярэдняга следства**

Папярэдняе следства праводзіцца ў тым раёне, дзе ўчынена злачынства. З мэтай забеспячэння найбольшай хуткасці, аб'ектыўнасці і паўнаты расследавання яно можа праводзіцца па месцы выяўлення злачынства, а таксама па месцы знаходжання падазраваемага, абвінавачваемага або большасці сведак.

Устанавіўшы, што даная справа яму не падследная, следчы абавязан правесці ўсе неадкладныя следчыя дзеянні, пасля чаго перадаць справу пракурору для накіравання па падследнасці. Пытанне аб падследнасці справы вырашаецца пракурорам па месцы, дзе следства пачата.

У выпадку неабходнасці правядзення следчых або вышукных дзеянняў у іншым раёне следчы мае права правесці іх асабіста альбо даручыць правядзенне гэтых дзеянняў адпаведнаму следчаму або органу дазнання, які абавязан выканаць даручэнне ў тэрмін не звыш дзесяці сутак.

Артыкул 128. **Абавязковасць задавальнення хадайніцтваў, якія маюць значэнне для справы**

Следчы не мае права адмовіць падазраваемаму, абвінавачваемаму і яго абаронцу, а таксама пацярпеўшаму, грамадзянскаму істцу, грамадзянскаму адказчыку або іх прадстаўнікам у допыце сведак, правядзенні экспертызы і іншых следчых дзеянняў па збіранню доказаў, калі акалічнасці, аб

устанаўленні якіх яны хадайнічаюць, могуць мець значэнне для справы. Маючымі для справы значэнне з'яўляюцца акалічнасці, указаныя ў артыкулах 15, 61 і 62 гэтага Кодэкса, а таксама ўсе іншыя акалічнасці, высвятленне якіх можа мець значэнне для правільнага расследавання справы.

Аб выніках разгляду хадайніцтваў паведамляецца асобе, якая заявіла хадайніцтва. Пры поўнай або частковай адмове ў хадайніцтве следчы абавязан вынесці пастанову з указаннем матываў адмовы.

### Артыкул 129. **Перакладчык**

Перакладчыкам з'яўляецца асоба, валодаючая мовамі, веданне якіх неабходна для перакладу, і назначаная органам дазнання, следчым, пракурорам, судом у выпадку, прадугледжаным артыкулам 12 гэтага Кодэкса.

Перакладчык абавязан з'явіцца па выкліку і выканаць поўна і дакладна даручаны яму пераклад.

У выпадку заведама няправільнага перакладу перакладчык нясе адказнасць па артыкулу 177 Крымінальнага кодэкса Беларускай ССР. Пры ўхіленні асобы, назначанай перакладчыкам, ад яўкі або ад выканання сваіх абавязкаў да яе могуць быць ужыты меры грамадскага ўздзеяння або на яе можа быць накладзена грашовае спагнанне ў размеры да дзесяці рублёў. Грашовае спагнанне накладаецца судом у парадку артыкула 267 гэтага Кодэкса.

Правілы гэтага артыкула пашыраюцца на асобу, якая разумее знакі нямога або глухога і запрошана да ўдзелу ў працэсе.

### Артыкул 130. **Удзел перакладчыка**

У выпадку, прадугледжаным артыкулам 12 гэтага Кодэкса, следчы пры допытах і іншых следчых дзеяннях запрашае перакладчыка.

Перад пачаткам следчага дзеяння, у якім удзельнічае перакладчык, следчы растлумачвае перакладчыку яго абавязкі і папярэджвае аб адказнасці за заведама няправільны пераклад, што адзначаецца ў пратаколе адпаведнага следчага дзеяння і сведчыцца подпісам перакладчыка.

### Артыкул 131. **Адвод перакладчыка**

Перакладчык не можа ўдзельнічаць у справе пры наяўнасці падстаў, прадугледжаных артыкулам 27 гэтага Ко-

дэкса, а таксама ў выпадку, калі выявіцца яго некампетэнтнасць. Папярэдні яго ўдзел у справе ў якасці перакладчыка не з'яўляецца падставай для адводу.

Пытанне аб адводзе перакладчыка вырашаецца ў парадку, прадугледжаным часткамі другой і трэцяй артыкула 74 гэтага Кодэкса.

Артыкул 132. **Удзел панятых**

Пры правядзенні агляду, вобыску, выняцця, агледжання, а таксама іншых следчых дзеянняў, у выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам, выклікаюцца панятыя. Панятыя выклікаюцца ў колькасці не менш чым два.

У якасці панятых могуць быць выкліканы незацікаўленыя ў справе грамадзяне.

Перад пачаткам следчага дзеяння, у якім удзельнічаюць панятыя, следчы растлумачвае ім правы і абавязкі.

Паняты абавязан засведчыць факт, змест і вынікі дзеяння, пры правядзенні якіх ён прысутнічаў. Паняты мае права рабіць заўвагі адносна праведзеных дзеянняў. Заўвагі панятога падлягаюць занясенню ў пратакол адпаведнага следчага дзеяння.

Артыкул 133. **Прызнанне пацярпеўшым**

Устанавіўшы, што злачынствам нанесена маральная, фізічная або маёмасная шкода грамадзяніну, следчы па ўласнай ініцыятыве або на падставе заявы гэтай асобы выносіць пастанову аб прызнанні яго пацярпеўшым. Аб прызнанні пацярпеўшым следчы паведамляе пацярпеўшаму або яго прадстаўніку. Пры допыце або яўцы пацярпеўшага следчы растлумачвае яму правы, прадугледжаныя артыкулам 54 гэтага Кодэкса, а ў выпадку прызнання пацярпеўшага таксама і грамадзянскім істцом растлумачвае і правы, прадугледжаныя артыкулам 55 гэтага Кодэкса. Аб гэтым робіцца адзнака ў пратаколе допыту або на пастанове аб прызнанні пацярпеўшым.

Артыкул 134. **Прызнанне грамадзянскім істцом**

Следчы, убачыўшы са справы, што ўчыненым злачынствам нанесены матэрыяльныя страты грамадзяніну, установе, прадпрыемству або арганізацыі, растлумачвае ім або іх

прадстаўнікам права прад'явіць грамадзянскі іск, аб чым складае пратакол або робіць пісьмовае паведамленне.

У выпадку прад'яўлення грамадзянскага іску следчы абавязан вынесці матываваную пастанову аб прызнанні грамадзянскім істцом або аб адмове ў гэтым.

Пастанова аб прызнанні грамадзянскім істцом паведамляецца грамадзянскаму істцу або яго прадстаўніку. У выпадку яўкі грамадзянскага істца або яго прадстаўніка ім растлумачваюцца правы, прадугледжаныя артыкулам 55 гэтага Кодэкса, аб чым робіцца адзнака на пастанове, якая сведчыцца подпісам грамадзянскага істца або яго прадстаўніка. Пастанова аб адмове прызнаць грамадзянскім істцом аб'яўляецца заяўшчыку пад распіску.

Артыкул 135. **Прыцягненне ў якасці грамадзянскага адказчыка**

Устанавіўшы, што матэрыяльную адказнасць за страты, нанесеныя злачыннымі дзеяннямі абвінавачваемага, павінны паводле закону несці бацькі, апекуны, папячыцелі або іншыя асобы альбо ўстановы, прадпрыемствы, арганізацыі, следчы выносіць матываваную пастанову аб прыцягненні адпаведнай асобы або ўстановы, прадпрыемства, арганізацыі ў якасці грамадзянскага адказчыка.

Пастанова аб'яўляецца грамадзянскаму адказчыку або яго прадстаўніку. Пры гэтым ім растлумачваюцца правы, прадугледжаныя артыкулам 57 гэтага Кодэкса, аб чым робіцца адзнака на пастанове, якая сведчыцца подпісам грамадзянскага адказчыка або яго прадстаўніка.

Артыкул 136. **Забеспячэнне кампенсацыі матэрыяльных страт, нанесеных злачынствам, і выкананне прыгавору ў частцы канфіскацыі маёмасці**

Пры наяўнасці дастатковых даных аб нанясенні злачынствам матэрыяльных страт следчы, пракурор абавязаны прыняць меры забеспячэння прад'яўленага або магчымага ў будучым грамадзянскага іску.

Пры расследаванні па крымінальнай справе аб злачынстве, за якое можа быць ужыта пакаранне ў выглядзе канфіскацыі маёмасці, следчы, пракурор абавязаны прыняць меры забеспячэння супроць утойвання маёмасці абвінавачваемага, якая можа быць канфіскавана.

Артыкул 137. **Меры па ліквідацыі прычын і ўмоў, якія садзейнічаюць учыненню злачынства**

Пры ўстанаўленні следствам прычын і ўмоў, якія садзейнічаюць учыненню злачынства, следчы павінен унесці ў адпаведныя прадпрыемствы, установы і грамадскія арганізацыі прадстаўленне аб прыняцці мер па ліквідацыі гэтых прычын і ўмоў.

Адпаведныя прадпрыемствы, установы і грамадскія арганізацыі абавязаны не пазней чым у месячны тэрмін разгледзець прадстаўленне следчага, прыняць неабходныя меры і паведаміць аб гэтым следчаму.

Артыкул 138. **Пратакол следчага дзеяння**

Пратакол аб правядзенні следчага дзеяння складаецца ў ходзе следчага дзеяння або непасрэдна пасля яго заканчэння следчым. У пратаколе ўказваецца: месца і дата правядзення следчага дзеяння, час яго пачатку і заканчэння, пасада і прозвішча асобы, склаўшай пратакол, прозвішча, імя і імя па бацьку кожнай асобы, якая ўдзельнічала ў следчым дзеянні, а ў неабходных выпадках і яе адрас, змест следчага дзеяння і выяўленыя пры яго правядзенні акалічнасці, якія маюць значэнне для справы. Пратакол прачытваецца ўсім асобам, якія ўдзельнічаюць у правядзенні следчага дзеяння, прычым ім павінна быць растлумачана права рабіць заўвагі, якія падлягаюць унясенню ў пратакол.

Пратакол падпісваецца следчым, дапытанай асобай, перакладчыкам, панятымі і іншымі асобамі, калі яны ўдзельнічаюць у правядзенні следчага дзеяння.

Да пратакола могуць быць прыкладзены фатаграфічныя здымкі, планы, схемы, злепкі і адбіткі слядоў. У гэтых выпадках у пратаколе павінна быць зроблена адпаведная спасылка.

Артыкул 139. **Сведчанне факту адмовы ад падпісання або немагчымасці падпісання пратакола следчага дзеяння**

Калі абвінавачваемы, падазраваемы, сведка або іншая асоба адмовіцца падпісаць пратакол следчага дзеяння, аб гэтым робіцца адзнака ў пратаколе, якая сведчыцца подпісам асобы, што праводзіла следчае дзеянне.

Асобе, што адмовілася падпісаць пратакол, павінна быць дадзена магчымасць даць тлумачэнне аб прычынах адмовы, якое заносіцца ў пратакол.

Калі адна з асоб, указаных у частцы першай гэтага артыкула, з прычыны фізічных недахопаў пазбаўлена магчымасці падпісаць пратакол следчага дзеяння, аб гэтым робіцца адзнака ў пратаколе, якая сведчыцца подпісам следчага і панятых.

Калі абвінавачваемы, падазраваемы, сведка і пацярпеўшы не могуць з гэтай жа прычыны падпісаць пратакол допыту, следчы запрашае пабочную асобу, якая са згоды дапытанай асобы сведчыць сваім подпісам правільнасць запісу яе паказанняў. Гэты пратакол падпісвае і следчы, які праводзіў допыт.

## Артыкул 140. Тэрмін папярэдняга следства

Папярэдняе следства па крымінальных справах павінна быць закончана не пазней чым у двухмесячны тэрмін. У гэты тэрмін уключаецца час з дня ўзбуджэння справы і да моманту накіравання пракурору справы з абвінаваўчым заключэннем або пастановай аб перадачы справы ў суд для разгляду пытання аб прымяненні прымусовых мер медыцынскага характару альбо да спынення ці прыпынення судаводства па справе.

Тэрмін папярэдняга следства, устаноўлены часткай першай гэтага артыкула, можа быць прадоўжан пракурорам вобласці, ваенным пракурорам ваеннай акругі, ваеннага флоту, але не больш чым на два месяцы. Далейшае прадоўжанне тэрміну папярэдняга следства можа быць зроблена толькі ў выключных выпадках Пракурорам Беларускай ССР або адпаведна Галоўным ваенным пракурорам.

Пры вяртанні судом справы для правядзення дадатковага следства, а таксама пры аднаўленні прыпыненай або спыненай справы тэрмін дадатковага следства ўстанаўліваецца пракурорам, які ажыццяўляе нагляд за следствам, у межах да аднаго месяца з моманту прыняцця справы да вядзення. Далейшае прадоўжанне тэрміну праводзіцца на агульных падставах.

У выпадку неабходнасці прадоўжання тэрміну следства следчы абавязан скласці аб гэтым матываваную пастанову і прадставіць яе адпаведнаму пракурору да заканчэння тэрміну папярэдняга следства.

Артыкул 141. **Недапушчальнасць разгалашэння даных папярэдняга следства**

Даныя папярэдняга следства могуць быць абвешчаны толькі з дазволу следчага або пракурора і ў тым аб'ёме, у якім яны прызнаюць гэта магчымым.

У неабходных выпадках следчы папярэджвае сведак, пацярпеўшага, грамадзянскага істца, грамадзянскага адказчыка, абаронцу, эксперта, перакладчыка, панятых і іншых асоб, якія прысутнічаюць пры правядзенні следчых дзеянняў, аб недапушчальнасці разгалашэння без яго дазволу даных папярэдняга следства. Ад указаных асоб адбіраецца падпіска з папярэджаннем аб адказнасці па артыкулу 180 Крымінальнага кодэкса Беларускай ССР.

## ГЛАВА 12

## ПРЫЦЯГНЕННЕ Ў ЯКАСЦІ АБВІНАВАЧВАЕМАГА І ДОПЫТ АБВІНАВАЧВАЕМАГА

Артыкул 142. **Прыцягненне ў якасці абвінавачваемага**

Пры наяўнасці дастатковых доказаў, якія даюць падставу для прад'яўлення абвінавачання ва ўчыненні злачынства, следчы выносіць матываваную пастанову аб прыцягненні асобы ў якасці абвінавачваемага.

Артыкул 143. **Пастанова аб прыцягненні ў якасці абвінавачваемага**

У пастанове аб прыцягненні ў якасці абвінавачваемага павінна быць указана: час і месца яе складання; кім складзена пастанова; прозвішча, імя, імя па бацьку і ўзрост прыцягваемага ў якасці абвінавачваемага; злачынства, ва ўчыненні якога абвінавачваецца даная асоба, з указаннем часу, месца і іншых акалічнасцей учынення злачынства, паколькі яны ўстаноўлены матэрыяламі справы; крымінальны закон, які прадугледжвае данае злачынства.

Калі абвінавачваемы абвінавачваецца ва ўчыненні некалькіх злачынстваў, падпадаючых пад дзеянне розных артыкулаў крымінальнага закону, у пастанове аб прыцягненні ў якасці абвінавачваемага павінна быць указана, у якіх канкрэтных дзеяннях абвінавачваецца абвінавачваемы па кожнаму з артыкулаў крымінальнага закону.

Артыкул 144. **Парадак выкліку абвінавачваемага**

Абвінавачваемы, які знаходзіцца на волі, выклікаецца да следчага позвай, якая ўручаецца абвінавачваемаму пад распіску з указаннем часу ўручэння. Позва можа быць перададзена таксама тэлефанаграмай або тэлеграмай.

У позве павінна быць указана, хто выклікаецца ў якасці абвінавачваемага, куды і да каго, дзень і гадзіна яўкі, а таксама вынікі няяўкі.

У выпадку часовай адсутнасці абвінавачваемага позва для перадачы яму ўручаецца пад распіску каму-небудзь з сумесна з ім пражываючых дарослых членаў сям'і, домакіраўніцтву або адміністрацыі па месцы яго работы.

Абвінавачваемы, які знаходзіцца пад вартай, выклікаецца праз адміністрацыю месца зняволення.

Артыкул 145. **Абавязковасць яўкі абвінавачваемага**

Абвінавачваемы абавязан з'явіцца па выкліку следчага ў назначаны тэрмін.

Уважлівымі прычынамі няяўкі абвінавачваемага прызнаюцца:

1) хвароба, якая пазбаўляе абвінавачваемага магчымасці з'явіцца;

2) нясвоечасовае атрыманне абвінавачваемым позвы;

3) іншыя заслугоўваючыя ўвагі акалічнасці.

Артыкул 146. **Прывод абвінавачваемага**

У выпадку няяўкі без уважлівай прычыны абвінавачваемы можа быць падвергнут прыводу.

Прывод абвінавачваемага без папярэдняга выкліку можа быць ужыт толькі ў тых выпадках, калі абвінавачваемы ўхіляецца ад следства або не мае пэўнага месца жыхарства.

Прывод абвінавачваемага, акрамя выпадкаў, якія не церпяць адкладання, не дапускаецца ў начны час.

Аб прыводзе следчы складае пастанову, якая аб'яўляецца абвінавачваемаму.

Прывод па даручэнню следчага праводзіцца органамі міліцыі.

Артыкул 147. **Прад'яўленне абвінавачання**

Прад'яўленне абвінавачання павінна адбыцца не пазней двух сутак з моманту вынясення пастановы аб прыцягненні

ў якасці абвінавачваемага, а ў выпадку прыводу — у дзень прыводу.

Выключэннем могуць быць тыя выпадкі, калі з-за невядомасці месцазнаходжання абвінавачваемага або нясвоечасовай яўкі яго па выкліку прад'явіць абвінавачанне ва ўказаны тэрмін не з'яўляецца магчымым.

Следчы, пераканаўшыся ў асобе абвінавачваемага, аб'яўляе яму пастанову аб прыцягненні ў якасці абвінавачваемага і растлумачвае сутнасць прад'яўленага абвінавачання. Выкананне гэтых дзеянняў засведчваецца подпісам абвінавачваемага на пастанове аб прыцягненні ў якасці абвінавачваемага і подпісам следчага з указаннем часу прад'яўлення абвінавачання.

У выпадку адмовы абвінавачваемага ад подпісу следчы засведчвае на пастанове аб прад'яўленні абвінавачання, што абвінавачваемаму тэкст пастановы аб'яўлен.

### Артыкул 148. **Растлумачэнне абвінавачваемаму яго правоў на папярэднім следстве**

Пры прад'яўленні абвінавачання следчы абавязан растлумачыць абвінавачваемаму яго правы, прадугледжаныя артыкулам 48 гэтага Кодэкса, аб чым робіцца адзнака на пастанове аб прыцягненні ў якасці абвінавачваемага, якая засведчваецца подпісам абвінавачваемага.

### Артыкул 149. **Парадак допыту абвінавачваемага**

Следчы абавязан дапытаць абвінавачваемага неадкладна пасля прад'яўлення яму абвінавачання.

Допыт абвінавачваемага не дапускаецца ў начны час, акрамя выпадкаў, не церпячых адкладання.

Абвінавачваемы дапытваецца ў месцы правядзення папярэдняга следства. Следчы мае права, калі прызнае гэта неабходным, правесці допыт у месцы знаходжання абвінавачваемага.

Абвінавачваемыя, выкліканыя па адной і той жа справе, дапытваюцца паасобку, прычым следчы прымае меры, каб яны не маглі звязвацца паміж сабой.

У пачатку допыту следчы павінен запытаць у абвінавачваемага, ці прызнае ён сябе вінаватым у прад'яўленым яму абвінавачанні, пасля чаго прапаноўвае абвінавачваемаму даць паказанні па сутнасці абвінавачання.

Следчы выслухоўвае паказанні абвінавачваемага, а затым, у выпадку неабходнасці, задае абвінавачваемаму пытанні.

**Артыкул 150. Удзел педагога ў допыце непаўналетняга абвінавачваемага**

У допыце непаўналетняга абвінавачваемага, па ўгледжанню следчага, можа ўдзельнічаць педагог.

Педагог, які ўдзельнічае ў допыце, мае права задаваць пытанні абвінавачваемаму з дазволу следчага. Пасля заканчэння допыту педагог, які ўдзельнічаў у ім, мае права азнаёміцца з пратаколам допыту і зрабіць пісьмовыя заўвагі аб правільнасці і паўнаце наяўных у ім запісаў. Да пачатку допыту непаўналетняга следчы абавязан растлумачыць педагогу яго правы, аб чым робіцца адзнака ў пратаколе допыту.

**Артыкул 151. Акалічнасці, якія падлягаюць выяўленню па справах непаўналетніх**

Пры правядзенні папярэдняга следства па справах непаўналетніх падлягаюць выяўленню наступныя акалічнасці:

1) узрост непаўналетняга (чысло, месяц, год нараджэння);

2) умовы жыцця і выхавання;

3) прычыны і ўмовы, якія садзейнічалі ўчыненню злачынства непаўналетнім;

4) наяўнасць дарослых падбухторшчыкаў і іншых саўдзельнікаў.

Пры наяўнасці даных аб разумовай адсталасці непаўналетняга, не звязанай з псіхічным захворваннем, павінна быць выяўлена таксама, ці мог ён поўнасцю ўсведамляць значэнне сваіх дзеянняў. Для выяўлення гэтых акалічнасцей павінны быць дапытаны бацькі непаўналетняга, яго настаўнікі і выхавацелі і іншыя асобы, якія могуць даць патрэбныя звесткі, а таксама выпатрабаваны неабходныя дакументы і праведзены іншыя следчыя дзеянні.

**Артыкул 152. Пратакол допыту абвінавачваемага**

Аб кожным допыце абвінавачваемага следчы складае пратакол з захаваннем патрабаванняў артыкулаў 138 і 139 гэтага Кодэкса. У пратаколе допыту ўказваюцца даныя аб асобе абвінавачваемага, у тым ліку: прозвішча, імя, імя па бацьку, час і месца нараджэння, грамадзянства, нацыянальнасць, адукацыя, сямейнае становішча, месца работы, род заняткаў або

пасада, месцапражыванне, ранейшая судзімасць, а таксама і іншыя звесткі, якія акажуцца неабходнымі па акалічнасцях справы.

Паказанні абвінавачваемага заносяцца ў пратакол у першай асобе і па магчымасці даслоўна; у выпадку неабходнасці запісваюцца зададзеныя абвінавачваемаму пытанні і яго адказы.

Пасля заканчэння допыту пратакол прад'яўляецца абвінавачваемаму для прачытання або па яго просьбе прачытваецца следчым. Абвінавачваемы мае права патрабаваць дапаўнення пратакола і ўнясення ў яго паправак. Гэтыя дапаўненні і папраўкі падлягаюць абавязковаму занясенню ў пратакол.

Пасля прачытання пратакола абвінавачваемы сваім подпісам засведчвае правільнасць запісу яго паказанняў. Перад подпісам абвінавачваемага ў пратаколе адзначаецца, ці прачытаў пратакол абвінавачваемы асабіста або ён яму быў прачытаны следчым.

Калі пратакол напісан на некалькіх старонках, абвінавачваемы падпісвае кожную старонку асобна. Усе дапаўненні і папраўкі ў пратаколе павінны быць засведчаны подпісам абвінавачваемага і следчага.

Калі допыт абвінавачваемага праводзіцца з удзелам перакладчыка, то пратакол допыту павінен уключаць указанне на растлумачэнне перакладчыку яго абавязкаў і папярэджанне аб адказнасці за заведама няправільны пераклад, што сведчыцца подпісам перакладчыка. У пратаколе таксама адзначаюцца растлумачэнне абвінавачваемаму яго права на адвод перакладчыка і паступіўшыя ў сувязі з гэтым заявы абвінавачваемага.

Перакладчык падпісвае кожную старонку пратакола і пратакол у цэлым. Абвінавачваемы сваім подпісам у канцы пратакола пацвярджае, што зроблены яму ў вуснай форме пераклад пратакола адпавядае дадзеным ім паказанням. Калі пратакол допыту быў перакладзен на іншую мову ў пісьмовым выглядзе, то пераклад у цэлым і кожная яго старонка паасобку павінны быць падпісаны перакладчыкам і абвінавачваемым.

### Артыкул 153. **Уласнаручны запіс абвінавачваемым сваіх паказанняў**

Пасля дачы абвінавачваемым паказанняў, у выпадку яго просьбы, яму павінна быць дадзена магчымасць напісаць свае

паказанні ўласнаручна, аб чым робіцца адзнака ў пратаколе допыту. Паказанні падпісваюцца абвінавачваемым і следчым.

Следчы пасля азнаямлення з пісьмовымі паказаннямі абвінавачваемага можа задаць яму дадатковыя пытанні. Гэтыя пытанні і адказы на іх запісваюцца ў пратакол. Правільнасць запісаў пытанняў і адказаў сведчыцца подпісамі абвінавачваемага і следчага.

### Артыкул 154. **Звальненне з пасады**

Пры прыцягненні службовай асобы ў якасці абвінавачваемай следчы, у выпадку неабходнасці зволіць абвінавачваемага з пасады, выносіць аб гэтым матываваную пастанову, якая падлягае зацвярджэнню пракурорам. Пастанова накіроўваецца для выканання па месцы работы абвінавачваемага.

Звальненне з пасады адмяняецца пастановай следчага, калі ва ўжыванні гэтай меры адпадае далейшая неабходнасць.

### Артыкул 155. **Змяненне і дапаўненне абвінавачання**

Калі пры правядзенні папярэдняга следства ўзнікнуць падставы для змянення прад'яўленага абвінавачання або для яго дапаўнення, следчы абавязан прад'явіць абвінавачваемаму новае абвінавачанне з захаваннем патрабаванняў артыкулаў 142—143 і 147 гэтага Кодэкса і дапытаць яго па новаму абвінавачанню.

Калі ў ходзе папярэдняга следства прад'яўленае абвінавачанне ў якой-небудзь частцы не знайшло пацвярджэння, следчы сваёй пастановай спыняе справу ў гэтай частцы, аб чым аб'яўляе абвінавачваемаму.

## ГЛАВА 13

## ДОПЫТ СВЕДКІ І ПАЦЯРПЕЎШАГА

### Артыкул 156. **Парадак выкліку сведкі**

Сведка выклікаецца да следчага позвай, якая ўручаецца пад распіску сведку, а ў выпадку яго часовай адсутнасці — каму-небудзь з дарослых членаў сям'і або домакіраўніцтву, адміністрацыі па месцы работы сведкі. У позве павінна быць указана: хто выклікаецца ў якасці сведкі, куды і да каго, дзень і гадзіна яўкі, а таксама вынікі няяўкі. Сведка можа быць выкліканы таксама тэлефанаграмай або тэлеграмай.

Выклік у якасці сведкі асобы, якая не дасягнула шаснац-

цацігадовага ўзросту, праводзіцца праз яе бацькоў або іншых законных прадстаўнікоў. Іншы парадак допускаецца толькі ў выпадку, калі гэта выклікаецца акалічнасцямі справы.

Артыкул 157. **Месца допыту сведкі**

Сведка дапытваецца ў месцы правядзення следства. Следчы мае права, калі прызнае гэта неабходным, правесці допыт у месцы знаходжання сведкі.

Артыкул 158. **Парадак допыту сведкі**

Сведкі, выкліканыя па адной і той жа справе, дапытваюцца паасобку і ў адсутнасці іншых сведак. Пры гэтым следчы прымае меры да таго, каб яны не маглі звязвацца паміж сабой.

Перад допытам следчы пераконваецца ў асобе сведкі, растлумачвае яму яго абавязкі і папярэджвае аб адказнасці за адмову або ўхіленне ад дачы паказанняў і за дачу заведама ілжывых паказанняў, аб чым робіцца адзнака ў пратаколе, якая сведчыцца подпісам сведкі.

Сведкам, якія не дасягнулі шаснаццацігадовага ўзросту, следчы растлумачвае абавязак праўдзіва расказаць усё вядомае ім па справе, але яны не папярэджваюцца аб адказнасці за адмову або ўхіленне ад дачы паказанняў і за дачу заведама ілжывых паказанняў.

У пачатку допыту следчы высвятляе адносіны сведкі да абвінавачваемага і пацярпеўшага і іншыя неабходныя звесткі аб асобе дапытваемага.

Допыт па сутнасці справы пачынаецца прапановай сведку расказаць усё яму вядомае аб акалічнасцях, у сувязі з якімі ён выклікан на допыт; пасля расказу сведкі следчы можа задаць яму пытанні. Наводзячыя пытанні не дапускаюцца.

Артыкул 159. **Допыт непаўналетняга сведкі**

Пры допыце сведак ва ўзросце да чатырнаццаці год, а па ўгледжанню следчага і пры допыце сведак ва ўзросце ад чатырнаццаці да шаснаццаці год выклікаецца педагог. У выпадку неабходнасці выклікаюцца таксама законныя прадстаўнікі непаўналетняга або яго блізкія сваякі.

Перад пачаткам допыту гэтым асобам растлумачваюцца іх правы і абавязкі, што адзначаецца ў пратаколе допыту.

Указаныя асобы прысутнічаюць пры допыце і могуць з дазволу следчага задаваць сведку пытанні. Следчы мае права адвесці зададзенае пытанне, аднак адведзенае пытанне павінна быць занесена ў пратакол. Пасля заканчэння допыту

прысутныя сваім подпісам пацвярджаюць правільнасць запісу паказанняў.

Артыкул 160. **Пратакол допыту сведкі**

Аб допыце сведкі складаецца пратакол з захаваннем патрабаванняў артыкулаў 138, 139 і 159 гэтага Кодэкса.

Паказанні сведкі запісваюцца ў першай асобе і па магчымасці даслоўна. У выпадку неабходнасці запісваюцца зададзеныя сведку пытанні і яго адказы.

Пасля заканчэння допыту пратакол прад'яўляецца сведку для прачытання або па просьбе сведкі прачытваецца яму следчым. Сведка мае права патрабаваць дапаўнення пратакола і ўнясення ў яго паправак. Гэтыя дапаўненні і папраўкі падлягаюць абавязковаму занясенню ў пратакол. Пасля прачытання пратакола сведка сведчыць, што паказанні запісаны правільна, аб чым адзначаецца ў пратаколе перад подпісам сведкі. Перад подпісам сведкі ў пратаколе таксама адзначаецца, ці прачытаў сведка пратакол асабіста, ці ён яму быў зачытаны следчым. Калі пратакол напісан на некалькіх старонках, сведка падпісвае кожную старонку асобна.

Пасля дачы сведкам паказанняў, у выпадку яго просьбы, яму павінна быць дадзена магчымасць напісаць свае паказанні ўласнаручна, аб чым робіцца адзнака ў пратаколе допыту. Паказанні падпісваюцца сведкам і следчым.

У выпадку, калі допыт праводзіўся з удзелам перакладчыка, пратакол допыту складаецца з захаваннем правілаў, устаноўленых артыкулам 152 гэтага Кодэкса.

Артыкул 161. **Выклік і допыт пацярпеўшага**

Выклік і допыт пацярпеўшага праводзіцца ў парадку, устаноўленым артыкуламі 156—160 гэтага Кодэкса. Перад пачаткам допыту следчы растлумачвае пацярпеўшаму яго правы, прадугледжаныя артыкулам 54 гэтага Кодэкса, аб чым робіцца адпаведная адзнака ў пратаколе допыту.

## ГЛАВА 14

## ВОЧНАЯ СТАЎКА, ПРАД'ЯЎЛЕННЕ ДЛЯ АПАЗНАННЯ

Артыкул 162. **Парадак вочнай стаўкі**

Следчы мае права правесці вочную стаўку паміж дзвюма раней дапытанымі асобамі, у паказаннях якіх ёсць істотныя супярэчнасці.

Калі вочная стаўка праводзіцца з удзелам сведкі і пацярпеўшага, яны да пачатку допыту папярэджваюцца аб адказнасці за адмову або ўхіленне ад дачы паказанняў і за дачу заведама ілжывых паказанняў, што адзначаецца ў пратаколе.

Пачынаючы допыт на вочнай стаўцы, следчы апытвае асоб, паміж якімі праводзіцца вочная стаўка, ці ведаюць яны адзін аднаго і ў якіх адносінах знаходзяцца паміж сабой. Затым указаным асобам па чарзе прапаноўваецца даць паказанні па тых акалічнасцях, для высвятлення якіх праводзіцца вочная стаўка. Пасля дачы паказанняў кожнаму з дапытваемых следчы можа задаваць пытанні. Асобы, паміж якімі праводзіцца вочная стаўка, могуць з дазволу следчага задаваць пытанні адзін аднаму, аб чым адзначаецца ў пратаколе.

Абвяшчэнне паказанняў, дадзеных удзельнікамі вочнай стаўкі на папярэдніх допытах, дапускаецца толькі пасля дачы імі паказанняў на вочнай стаўцы і запісу іх у пратакол.

У пратаколе вочнай стаўкі паказанні дапытваемых асоб запісваюцца ў той чарговасці, у якой яны даваліся. Кожны ўдзельнік вочнай стаўкі падпісвае свае паказанні і кожную старонку паасобку.

### Артыкул 163. **Прад'яўленне для апазнання**

У выпадку неабходнасці следчы можа прад'явіць для апазнання асобу або прадмет сведку, пацярпеўшаму, падазраваемаму або абвінавачваемаму.

Апазнаючыя папярэдне дапытваюцца аб акалічнасцях, пры якіх яны наглядалі адпаведную асобу або прадмет, і аб прыкметах і асаблівасцях, па якіх яны могуць зрабіць апазнанне.

### Артыкул 164. **Парадак прад'яўлення для апазнання**

Асоба, апазнанне якой праводзіцца, прад'яўляецца апазнаючаму разам з іншымі асобамі па магчымасці падобнымі па выгляду з апазнаваемым. Агульная колькасць асоб, прад'яўляемых для апазнання, павінна быць не менш як тры.

Перад пачаткам следчага дзеяння апазнаваемаму прапануецца заняць любое месца сярод прад'яўляемых асоб, што адзначаецца ў пратаколе.

Пры немагчымасці прад'яўлення асобы апазнанне можа быць зроблена па яе фотакартцы, прад'яўляемай адначасова з іншымі фотакарткамі ў колькасці не менш чым тры.

Прадмет прад'яўляецца ў групе аднародных прадметаў.

Калі апазнаючым з'яўляецца сведка або пацярпеўшы, яны перад апазнаннем папярэджваюцца аб адказнасці за адмову

або ўхіленне ад дачы паказанняў і за дачу заведама ілжывых паказанняў, што адзначаецца ў пратаколе.

Апазнаючаму прапаноўваецца ўказаць асобу або прадмет, аб якім ён даў паказанні. Наводзячыя пытанні не дапускаюцца.

Калі апазнаючы ўказаў на адну з прад'яўленых яму асоб або адзін з прадметаў, яму прапаноўваецца растлумачыць, па якіх прыкметах або асаблівасцях ён пазнаў дадзеную асобу або прадмет.

Прад'яўленне для апазнання праводзіцца ў прысутнасці панятых.

Артыкул 165. **Пратакол прад'яўлення для апазнання**

Аб прад'яўленні для апазнання складаецца пратакол з захаваннем патрабаванняў артыкулаў 138 і 139 гэтага Кодэкса. У пратаколе ўказваюцца звесткі аб асобе апазнаючага, аб асобах або прадметах, прад'яўленых для апазнання, і па магчымасці даслоўна выкладаюцца паказанні апазнаючага.

## ГЛАВА 15

## ВЫНЯЦЦЕ, ВОБЫСК, НАКЛАДАННЕ АРЫШТУ НА МАЁМАСЦЬ

Артыкул 166. **Падставы для правядзення выняцця**

У выпадку неабходнасці адабрання пэўных прадметаў і дакументаў, маючых значэнне для справы, і калі вядома, дзе і ў каго яны знаходзяцца, следчы робіць выняцце.

Выняцце дакументаў, маючых звесткі, якія з'яўляюцца дзяржаўнай тайнай, праводзіцца толькі з санкцыі пракурора і ў парадку, узгодненым з кіраўніком адпаведнай установы.

Выняцце праводзіцца па матываванай пастанове следчага.

Артыкул 167. **Падставы для правядзення вобыску**

Следчы, маючы дастатковыя падставы меркаваць, што ў якім-небудзь памяшканні або іншым месцы, або ў якойнебудзь асобы знаходзяцца сродкі злачынства, прадметы і каштоўнасці, здабытыя злачынным шляхам, а таксама іншыя прадметы або дакументы, якія могуць мець значэнне для справы, робіць вобыск для іх адшукання і адабрання.

Вобыск можа праводзіцца і для выяўлення расшукваемых асоб, а таксама трупаў.

Вобыск праводзіцца па матываванай пастанове следчага

і толькі з санкцыі пракурора. У выпадках, якія не церпяць адкладання, вобыск можа быць зроблен без санкцыі пракурора, але з наступным паведамленнем пракурору ў сутачны тэрмін аб зробленым вобыску.

**Артыкул 168. Асобы, якія прысутнічаюць пры выняцці і вобыску**

Пры правядзенні выняцця або вобыску абавязкова прысутнасць панятых.

Пры вобыску і выняцці павінна быць забяспечана прысутнасць асобы, у якой праводзіцца вобыск або выняцце, альбо паўналетніх членаў яго сям'і. У выпадку немагчымасці іх прысутнасці запрашаюцца прадстаўнікі домакіраўніцтва, выканаўчага камітэта сельскага або пасялковага Савета дэпутатаў працоўных.

Выняцці і вобыскі ў памяшканнях, занятых установамі, прадпрыемствамі, арганізацыямі, праводзяцца ў прысутнасці прадстаўніка данай установы, прадпрыемства, арганізацыі.

Асобам, у якіх праводзіцца выняцце або вобыск, панятым, прадстаўнікам павінна быць растлумачана іх права прысутнічаць пры ўсіх дзеяннях следчага і рабіць заявы наконт гэтых дзеянняў, якія падлягаюць занясенню ў пратакол.

**Артыкул 169. Парадак правядзення выняцця і вобыску**

Правядзенне выняцця і вобыску ў начны час, акрамя выпадкаў, якія не церпяць адкладання, не дапускаецца. Пачынаючы выняцце або вобыск, следчы абавязан прад'явіць пастанову аб гэтым.

Пры правядзенні выняцця пасля прад'яўлення пастановы следчы прапануе выдаць прадметы або дакументы, якія падлягаюць адабранню, а ў выпадку адмовы ў гэтым праводзіць выняцце прымусова.

Пры правядзенні вобыску пасля прад'яўлення пастановы следчы прапануе выдаць сродкі злачынства, прадметы і каштоўнасці, здабытыя злачынным шляхам, а таксама іншыя прадметы або дакументы, якія могуць мець значэнне для справы. Калі яны выдадзены добраахвотна і няма падстаў баяцца ўтойвання расшукваемых прадметаў і дакументаў, следчы мае права абмежавацца адабраннем выдадзенага і не праводзіць далейшых пошукаў.

Пры правядзенні вобыску і выняцця следчы мае права ўскрываць зачыненыя памяшканні і сховішчы, калі ўладальнік адмаўляецца добраахвотна адчыніць іх, пры гэтым следчы па-

вінен пазбягаць не выклікаемага неабходнасцю пашкоджання запораў, дзвярэй і іншых прадметаў.

Следчы абавязан прымаць меры да таго, каб не былі разгалошаны выяўленыя пры вобыску і выняцці акалічнасці інтымнага жыцця асобы, займаючай данае памяшканне, або іншых асоб.

Следчы мае права забараніць асобам, што знаходзяцца ў памяшканні або месцы, у якім праводзіцца вобыск, а таксама асобам, прыходзячым у гэтае памяшканне або месца, пакідаць яго, а таксама звязвацца адной з другой або іншымі асобамі да скančэння вобыску.

Артыкул 170. **Адабранне прадметаў і дакументаў пры выняцці і вобыску**

Пры правядзенні выняцця і вобыску следчы павінен строга абмяжоўвацца адабраннем прадметаў і дакументаў, якія могуць мець дачыненне да справы. Прадметы і дакументы, забароненыя да абарачэння, падлягаюць адабранню незалежна ад іх дачынення да справы.

Усе прадметы і дакументы, якія адбіраюцца, прад'яўляюцца панятым і іншым прысутным асобам і ў выпадку неабходнасці ўпакоўваюцца і апячатваюцца на месцы выняцця або вобыску.

Артыкул 171. **Асабісты вобыск**

Асабісты вобыск праводзіцца ў адпаведнасці з правіламі, ўстаноўленымі артыкуламі 167—170 гэтага Кодэкса.

Асабісты вобыск без вынясення аб тым асобнай пастановы і без санкцыі пракурора можа праводзіцца:

1) пры затрыманні або ўзяцці пад варту;

2) пры наяўнасці дастатковых падстаў меркаваць, што асоба, якая знаходзіцца ў памяшканні або ў іншым месцы, у якім праводзіцца выняцце і вобыск, хавае пры сабе прадметы або дакументы, што могуць мець значэнне для справы.

Асабісты вобыск можа праводзіцца толькі асобай аднаго полу з абшукваемым і ў прысутнасці панятых таго ж полу.

Артыкул 172. **Правядзенне выняцця і вобыску ў памяшканнях дыпламатычных прадстаўніцтваў**

Выняцце і вобыск у памяшканнях, займаемых дыпламатычнымі прадстаўніцтвамі, а таксама ў памяшканнях, у якіх

пражываюць члены дыпламатычных прадстаўніцтваў і іх сем'і, могуць праводзіцца толькі па просьбе або са згоды дыпламатычнага прадстаўніка. Згода дыпламатычных прадстаўнікоў на выняцце або вобыск атрымліваецца праз Міністэрства замежных спраў Беларускай ССР.

Выняцце і вобыск ва ўказаных памяшканнях праводзяцца абавязкова ў прысутнасці пракурора і прадстаўніка Міністэрства замежных спраў Беларускай ССР.

Артыкул 173. **Выняцце паштова-тэлеграфнай карэспандэнцыі**

Накладанне арышту на карэспандэнцыю і выняцце яе ў паштова-тэлеграфных установах можа праводзіцца толькі з санкцыі пракурора або па пастанове суда.

Пры неабходнасці накласці арышт на карэспандэнцыю і правесці яе агляд і выняцце следчы выносіць аб гэтым матываваную пастанову. Пасля зацвярджэння пракурорам указанай пастановы следчы накіроўвае адпаведнай паштова-тэлеграфнай установе пастанову, прапануе затрымліваць карэспандэнцыю і паведамляе аб часе свайго прыбыцця для правядзення агляду і выняцця затрыманай карэспандэнцыі. Агляд і выняцце праводзяцца ў прысутнасці панятых з ліку работнікаў паштова-тэлеграфнай установы.

Накладанне арышту на карэспандэнцыю адмяняецца пастановай следчага, калі ва ўжыванні гэтай меры адпадае далейшая неабходнасць.

Артыкул 174. **Накладанне арышту на маёмасць**

З мэтай забеспячэння грамадзянскага іску або магчымай канфіскацыі маёмасці следчы абавязан накласці арышт на маёмасць абвінавачваемага, падазраваемага або асоб, якія нясуць па закону матэрыяльную адказнасць за іх дзеянні, або іншых асоб, у якіх знаходзіцца маёмасць, набытая злачынным шляхам.

Аб накладанні арышту на маёмасць следчы складае матываваную пастанову.

Накладанне арышту на маёмасць можа быць зроблена адначасова з выняццем або вобыскам альбо самастойна.

Маёмасць, на якую накладваецца арышт, апісваецца з захаваннем патрабаванняў артыкулаў 168 і 169 гэтага Кодэкса. Уся апісваемая маёмасць павінна быць прад'яўлена панятым і іншым прысутным асобам.

Арышт не можа быць накладзен на прадметы, неабходныя для самога абвінавачваемага і асоб, якія знаходзяцца на яго ўтрыманні. Пералік гэтых прадметаў устанаўліваецца заканадаўствам Беларускай ССР.

Маёмасць, на якую накладзен арышт, перадаецца следчым на захоўванне прадстаўніку выканаўчага камітэта сельскага або пасялковага Савета дэпутатаў працоўных, альбо домакіраўніцтва, або ўладальніку гэтай маёмасці, або яго сваяку, або іншай асобе, якой павінна быць растлумачана яе адказнасць за захаванасць гэтай маёмасці, аб чым у яе адбіраецца падпіска. У выпадку неабходнасці маёмасць, на якую накладзен арышт, можа быць адабрана.

Пры накладанні арышту на грашовыя ўклады правядзенне якіх-небудзь аперацый па іх спыняецца.

Накладанне арышту на маёмасць адмяняецца пастановай следчага, калі ва ўжыванні гэтай меры адпадае далейшая неабходнасць.

### Артыкул 175. **Пратакол выняцця, вобыску, накладання арышту на маёмасць**

Аб правядзенні выняцця, вобыску, накладання арышту на маёмасць следчы складае пратакол з захаваннем патрабаванняў артыкулаў 138 і 139 гэтага Кодэкса. Калі, акрамя пратаколаў, складаецца асобы вопіс адабраных або перадаваемых на адказнае захаванне прадметаў і дакументаў, вопіс прыкладаецца да пратакола. Пратакол выняцця, вобыску, накладання арышту на маёмасць павінен мець указанні на растлумачэнне прысутным асобам правоў, прадугледжаных артыкулам 168 гэтага Кодэкса, і зробленыя імі заявы.

Адносна прадметаў і дакументаў, якія падлягаюць адабранню, павінна быць указана, ці выдадзены яны добраахвотна або адабраны прымусова, у якім імена месцы і пры якіх акалічнасцях яны выяўлены. Усе прадметы і дакументы, якія адбіраюцца, а таксама ўся апісваемая маёмасць павінны быць пералічаны ў пратаколе або прыкладзеным да яго вопісу з дакладным указаннем колькасці, меры, вагі або індывідуальных прыкмет і па магчымасці іх кошту.

Калі пры выняцці, вопісу, накладанні арышту на маёмасць мелі месца спробы знішчыць або схаваць прадметы і дакументы альбо факты парушэння парадку з боку абшукваемых або іншых асоб, пратакол павінен мець указанне на гэта і на меры, прынятыя следчым.

Артыкул 176. **Абавязковасць уручэння копіі пратакола**

Копія пратакола ўручаецца пад распіску асобе, у якой былі зроблены выняцце, вобыск, накладанне арышту на маёмасць, або паўналетнім членам сям'і, а пры іх адсутнасці — прадстаўніку выканаўчага камітэта сельскага або пасялковага Савета дэпутатаў працоўных або домакіраўніцтва.

Калі выняцце, вобыск, накладанне арышту на маёмасць праводзіліся ў памяшканні, што належыць установе, прадпрыемству, арганізацыі, копія пратакола ўручаецца пад распіску адпаведнай службовай асобе.

## ГЛАВА 16

## АГЛЯД І АГЛЕДЖАННЕ

Артыкул 177. **Падставы для правядзення агляду**

З мэтай выяўлення слядоў злачынства, рэчавых доказаў, высвятлення абставін здарэння, а таксама іншых акалічнасцей, маючых значэнне для справы, следчы праводзіць агляд месца здарэння, мясцовасці, памяшкання, прадметаў і дакументаў.

Артыкул 178. **Парадак правядзення агляду**

Агляд праводзіцца ў прысутнасці панятых.

Следчы мае права прыцягнуць да ўдзелу ў аглядзе абвінавачваемага, падазраваемага, пацярпеўшага.

У неабходных выпадках для ўдзелу ў правядзенні агляду следчы можа запрасіць адпаведнага спецыяліста, не зацікаўленага ў зыходзе справы.

Следчы можа рабіць пры аглядзе вымярэнні, фатаграфаванне, складаць планы і схемы, рабіць злепкі і адбіткі слядоў.

Агляд прадметаў і дакументаў, выяўленых пры выняцці або вобыску, аглядзе месца здарэння, мясцовасці і памяшкання, следчы робіць на месцы правядзення адпаведнага следчага дзеяння. У гэтым выпадку вынікі агляду запісваюцца ў пратакол указанага следчага дзеяння. У выпадку, калі для агляду прадметаў або дакументаў запатрабуецца працяглы час, або па іншых падставах следчы робіць агляд па месцы правядзення следства. У неабходных выпадках адбіраемыя прадметы ўпакоўваюцца і апячатваюцца.

Агляд паштова-тэлеграфнай карэспандэнцыі праводзіцца з захаваннем патрабаванняў артыкула 173 гэтага Кодэкса.

Артыкул 179. **Агляд трупа**

Вонкавы агляд трупа на месцы яго выяўлення праводзіць следчы ў прысутнасці панятых і з удзелам судова-медыцынскага эксперта, а пры немагчымасці яго ўдзелу — іншага ўрача.

У выпадку неабходнасці выняцця трупа з месца пахавання следчы выносіць аб гэтым пастанову. Выняцце трупа праводзіцца ў прысутнасці следчага, судова-медыцынскага эксперта і панятых.

Артыкул 180. **Агледжанне**

Следчы мае права правесці агледжанне абвінавачваемага, падазраваемага, пацярпеўшага для ўстанаўлення на іх целе слядоў злачынства або наяўнасці асаблівых прыкмет, калі пры гэтым не патрабуецца судова-медыцынскай экспертызы.

Аб правядзенні агледжання следчы складае пастанову. Пастанова аб правядзенні агледжання абавязкова для асобы, у адносінах да якой яна вынесена.

Агледжанне праводзіцца ў прысутнасці панятых, а ў неабходных выпадках з удзелам урача.

Агледжанне ў тых выпадках, калі гэтае следчае дзеянне суправаджаецца агаленнем агледжваемай асобы, праводзіцца ў прысутнасці панятых таго ж полу.

Следчы не прысутнічае пры агледжанні асобы другога полу, калі агледжанне суправаджаецца агаленнем гэтай асобы. У гэтым выпадку агледжанне праводзіцца ўрачом у прысутнасці панятых.

Пры агледжанні не дапускаюцца дзеянні, якія ўніжаюць годнасць або небяспечныя для здароўя агледжваемай асобы.

Артыкул 181. **Пратакол агляду і агледжання**

Аб правядзенні агляду і агледжання следчым складаецца пратакол з захаваннем патрабаванняў артыкулаў 138 і 139 гэтага Кодэкса.

У пратаколе апісваюцца ўсе дзеянні следчага, а таксама ўсё выяўленае пры аглядзе і агледжанні ў той паслядоўнасці, як праводзіўся агляд, і ў тым выглядзе, у якім выяўленае наглядалася ў момант агляду ці агледжання. У пратаколе пералічваецца і апісваецца таксама ўсё адабранае пры аглядзе або агледжанні.

Артыкул 182. **Следчы эксперымент**

З мэтай праверкі і ўдакладнення даных, маючых значэнне для справы, следчы мае права зрабіць следчы эксперымент

шляхам узнаўлення дзеянняў, абстаноўкі або іншых акалічнасцей пэўнай падзеі і правядзення неабходных доследных дзеянняў. Пры гэтым следчы ў неабходных выпадках праводзіць вымярэнні, фатаграфаванне, складае планы і схемы.

Правядзенне следчага эксперыменту дапускаецца пры ўмове, калі пры гэтым не ўніжаецца годнасць і гонар асоб, якія прымаюць у ім удзел, і акружаючых і не ствараецца небяспекі для іх здароўя.

Пры правядзенні следчага эксперыменту павінны прысутнічаць панятыя. У выпадку неабходнасці ў правядзенні следчага эксперыменту могуць удзельнічаць падазраваемы, абвінавачваемы, пацярпеўшы, сведка. Следчы мае права запрасіць для ўдзелу ў правядзенні следчага эксперыменту і спецыяліста, не зацікаўленага ў зыходзе справы.

Аб правядзенні следчага эксперыменту складаецца пратакол з захаваннем патрабаванняў артыкулаў 138 і 139 гэтага Кодэкса. У пратаколе падрабязна выкладаюцца ўмовы, ход і вынікі праведзенага следчага эксперыменту.

## ГЛАВА 17

## ПРАВЯДЗЕННЕ ЭКСПЕРТЫЗЫ

### Артыкул 183. **Парадак назначэння экспертызы**

Прызнаўшы неабходным правядзенне экспертызы, следчы складае аб гэтым пастанову, у якой указваюцца падставы для назначэння экспертызы, прозвішча эксперта або назва ўстановы, у якой павінна быць праведзена экспертыза, пытанні, пастаўленыя перад экспертам, і матэрыялы, якія прадастаўляюцца ў распараджэнне эксперта.

Пры назначэнні экспертызы следчы высвятляе неабходныя даныя аб спецыяльнасці і кампетэнтнасці асобы, якой даручаецца правядзенне экспертызы.

Следчы абавязан азнаёміць абвінавачваемага з пастановай аб назначэнні экспертызы і растлумачыць яго правы, устаноўленыя артыкулам 184 гэтага Кодэкса. Аб гэтым складаецца пратакол, які падпісваецца следчым і абвінавачваемым.

Пастанова аб назначэнні судова-псіхіятрычнай экспертызы і заключэнне экспертаў не аб'яўляюцца абвінавачваемаму, калі яго псіхічны стан робіць гэта немагчымым.

Артыкул 184. **Правы абвінавачваемага пры назначэнні і правядзенні экспертызы**

Пры назначэнні і правядзенні экспертызы абвінавачваемы мае права:

1) заявіць адвод эксперту;

2) прасіць аб назначэнні эксперта з ліку ўказаных ім асоб;

3) прадставіць дадатковыя пытанні для атрымання па іх заключэння эксперта;

4) прысутнічаць з дазволу следчага пры правядзенні экспертызы і даваць тлумачэнні эксперту;

5) прадстаўляць дадатковыя дакументы;

6) знаёміцца з заключэннем эксперта.

У выпадку задавальнення хадайніцтва абвінавачваемага следчы адпаведна змяняе або дапаўняе сваю пастанову аб назначэнні экспертызы.

У выпадку адмовы ў хадайніцтве следчы выносіць матываваную пастанову, якая аб'яўляецца абвінавачваемаму пад распіску.

Артыкул 185. **Атрыманне ўзораў для параўнаўчага даследавання**

Следчы мае права атрымаць у падазраваемага або абвінавачваемага ўзоры почырку або іншыя ўзоры, неабходныя для параўнаўчага даследавання, аб чым складае пастанову.

У неабходных выпадках узяцце ўзораў для параўнаўчага даследавання праводзіцца з удзелам спецыяліста, не зацікаўленага ў зыходзе справы.

Аб узяцці ўзораў для параўнаўчага даследавання складаецца пратакол з захаваннем патрабаванняў артыкулаў 138 і 139 гэтага Кодэкса.

Артыкул 186. **Правядзенне экспертызы ў экспертнай установе**

Пры даручэнні правядзення экспертызы эксперту адпаведнай экспертнай установы следчы накіроўвае ў гэтую ўстанову сваю пастанову і матэрыялы, неабходныя для правядзення экспертызы.

Пасля атрымання пастановы следчага кіраўнік экспертнай установы даручае правядзенне экспертызы аднаму або некальнкім супрацоўнікам данай установы. Па даручэнню следчага кіраўнік экспертнай установы растлумачвае супрацоўнікам, якім даручана правядзенне экспертызы, правы і абавязкі

эксперта, прадугледжаныя артыкулам 73 гэтага Кодэкса, папярэджвае іх аб адказнасці за адмову або ўхіленне ад дачы заключэння або за дачу заведама ілжывага заключэння па артыкулах 178 і 177 Крымінальнага кодэкса Беларускай ССР, аб чым адбірае ў іх падпіску, якая разам з заключэннем эксперта накіроўваецца следчаму.

Артыкул 187. **Змяшчэнне абвінавачваемага або падазраваемага ў медыцынскую ўстанову**

Калі пры правядзенні судова-медыцынскай або судова-псіхіятрычнай экспертызы ўзнікае неабходнасць у стацыянарным наглядзе, следчы змяшчае абвінавачваемага або падазраваемага ў адпаведную медыцынскую ўстанову, аб чым указваецца ў пастанове аб назначэнні экспертызы.

Змяшчэнне ў лячэбна-псіхіятрычную ўстанову абвінавачваемага або падазраваемага, які не ўтрымліваецца пад вартай, праводзіцца з санкцыі пракурора.

Час знаходжання ў псіхіятрычнай лячэбнай установе залічваецца ў тэрмін утрымання пад вартай.

Калі ў судова-медыцынскую ўстанову, у сувязі з правядзеннем экспертызы, накіроўваецца падазраваемы, то яму даюцца правы, устаноўленыя артыкуламі 183 і 184 гэтага Кодэкса.

Артыкул 188. **Правядзенне экспертызы па-за экспертнай установай**

Калі экспертыза праводзіцца па-за экспертнай установай, следчы пасля вынясення пастановы аб назначэнні экспертызы выклікае да сябе асобу, якой даручаецца экспертыза, пераконваецца ў яе асобе, спецыяльнасці і кампетэнтнасці, устанаўлівае адносіны эксперта да абвінавачваемага, падазраваемага і пацярпеўшага, а таксама правярае, ці няма падстаў да адводу эксперта.

Следчы ўручае эксперту пастанову аб назначэнні экспертызы, растлумачвае эксперту правы і абавязкі, прадугледжаныя артыкулам 73 гэтага Кодэкса, і папярэджвае яго аб адказнасці за адмову або ўхіленне ад дачы заключэння або за дачу заведама ілжывага заключэння. Аб выкананні гэтых дзеянняў следчы робіць адзнаку ў пастанове аб назначэнні экспертызы, якая засведчваецца подпісам эксперта.

Калі эксперт робіць якія-небудзь заявы або ўзбуджае хадайніцтва па справе, следчы абавязан скласці пратакол

з захаваннем патрабаванняў артыкулаў 138 і 139 гэтага Кодэкса.

**Артыкул 189. Прысутнасць следчага пры правядзенні экспертызы**

Следчы мае права прысутнічаць пры правядзенні экспертызы. Пры ўскрыцці трупа ў час правядзення судова-медыцынскай экспертызы, як правіла, прысутнічае следчы.

**Артыкул 190. Змест заключэння эксперта**

Пасля правядзення неабходных даследаванняў эксперт складае заключэнне, у якім павінна быць указана: калі, дзе, кім (прозвішча, імя і імя па бацьку, адукацыя, спецыяльнасць, вучоная ступень і званне, займаемая пасада), на якой падставе была зроблена экспертыза, хто прысутнічаў пры правядзенні экспертызы, якія матэрыялы эксперт выкарыстаў, якія даследаванні зрабіў, якія пытанні былі пастаўлены эксперту і яго матываваныя адказы. Калі пры правядзенні экспертызы эксперт установіць акалічнасці, маючыя значэнне для справы, адносна якіх яму не былі пастаўлены пытанні, ён мае права ўказаць на іх у сваім заключэнні.

Заключэнне даецца ў пісьмовым выглядзе і падпісваецца экспертам.

**Артыкул 191. Допыт эксперта**

Следчы мае права дапытаць эксперта для растлумачэння або ўдакладнення дадзенага ім заключэння. Эксперт мае права выкласці свае адказы ўласнаручна. Пратакол допыту эксперта складаецца з захаваннем патрабаванняў артыкулаў 138 і 139 гэтага Кодэкса.

**Артыкул 192. Прад'яўленне абвінавачваемаму заключэння эксперта**

Заключэнне эксперта або яго паведамленне аб немагчымасці даць заключэнне, а таксама пратакол допыту эксперта прад'яўляюцца абвінавачваемаму, які мае права даць свае тлумачэнні і заявіць пярэчанні, а таксама прасіць аб пастаноўцы дадатковых пытанняў эксперту і аб назначэнні дадатковай або паўторнай экспертызы. Аб выкананні ўказаных дзеянняў адзначаецца ў пратаколе допыту абвінавачваемага.

Правілы гэтага артыкула прымяняюцца і ў выпадках, калі экспертыза была зроблена да прыцягнення асобы ў якасці абвінавачваемай.

Артыкул 193. **Правядзенне дадатковай і паўторнай экспертызы**

Дадатковая і паўторная экспертызы назначаюцца ў выпадках, прадугледжаных артыкулам 77, і праводзяцца з захаваннем патрабаванняў артыкулаў 183 — 192 гэтага Кодэкса.

## ГЛАВА 18

## ПРЫПЫНЕННЕ ПАПЯРЭДНЯГА СЛЕДСТВА

Артыкул 194. **Падставы і тэрміны прыпынення папярэдняга следства**

Папярэдняе следства прыпыняецца:

1) у выпадку, калі абвінавачваемы скрыўся ад следства або суда або калі па іншых прычынах не ўстаноўлена яго месцазнаходжанне;

2) у выпадку псіхічнага або іншага цяжкага захворвання абвінавачваемага, засведчанага ўрачом, працуючым у медыцынскай установе;

3) у выпадку неўстанаўлення асобы, якая падлягае прыцягненню ў якасці абвінавачваемай.

Пры наяўнасці адной з гэтых акалічнасцей следчы выносіць матываваную пастанову аб прыпыненні папярэдняга следства. Калі па справе прыцягнута два або некалькі абвінавачваемых, а падставы для прыпынення датычаць не ўсіх абвінавачваемых, следчы мае права выдзеліць і прыпыніць справу ў адносінах да асобных абвінавачваемых.

У выпадках, прадугледжаных пунктамі 1 і 3 гэтага артыкула, папярэдняе следства прыпыняецца толькі пасля заканчэння тэрміну на яго правядзенне; у выпадках, прадугледжаных пунктам 2 гэтага артыкула, яно можа быць прыпынена і да заканчэння тэрміну папярэдняга следства.

Да прыпынення папярэдняга следства следчы абавязан выканаць усе следчыя дзеянні, правядзенне якіх магчыма ў адсутнасці абвінавачваемага, прыняць усе меры да яго выяўлення, а пры невядомасці асобы, якая ўчыніла злачынства, да ўстанаўлення гэтай асобы.

Судаводства па прыпыненай справе падлягае спыненню пасля заканчэння даўнасці, устаноўленай крымінальным законам.

Артыкул 195. **Пошукі абвінавачваемага**

Пры невядомасці месцазнаходжання абвінавачваемага следчы прымае неабходныя меры да яго пошукаў. Следчы мае права даручыць правядзенне пошукаў органам дазнання. Аб гэтым даручэнні ўказваецца ў пастанове аб прыпыненні папярэдняга следства або выносіцца асобная пастанова.

Пошукі могуць быць аб'яўлены як у час правядзення папярэдняга следства, так і адначасова з яго прыпыненнем.

Пры наяўнасці падстаў, указаных у артыкуле 84 гэтага Кодэкса, следчы можа абраць у адносінах да расшукваемага меру стрымання. У выпадках, прадугледжаных артыкулам 91 гэтага Кодэкса, следчы з санкцыі пракурора можа абраць меру стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту.

Артыкул 196. **Меры да ўстанаўлення асобы, якая падлягае прыцягненню ў якасці абвінавачваемай**

Пасля прыпынення папярэдняга следства ў выпадку, прадугледжаным пунктам 3 артыкула 194 гэтага Кодэкса, следчы абавязан прымаць як непасрэдна, так і праз органы дазнання меры да ўстанаўлення асобы, якая падлягае прыцягненню ў якасці абвінавачваемай.

Артыкул 197. **Аднаўленне папярэдняга следства**

Прыпыненае папярэдняе следства аднаўляецца матываванай пастановай следчага пасля таго, як адпалі падставы для прыпынення або ўзнікла неабходнасць правядзення дадатковых следчых дзеянняў.

## ГЛАВА 19

## ЗАКАНЧЭННЕ ПАПЯРЭДНЯГА СЛЕДСТВА

Артыкул 198. **Заканчэнне папярэдняга следства**

Правядзенне папярэдняга следства заканчваецца складаннем абвінаваўчага заключэння альбо пастановы аб накіраванні справы ў суд для разгляду пытання аб ужыцці прымусовых мер медыцынскага характару ў парадку, прадугледжаным артыкулам 222 гэтага Кодэкса, альбо пастановы аб спыненні справы.

Артыкул 199. **Азнаямленне пацярпеўшага, грамадзянскага істца і грамадзянскага адказчыка з матэрыяламі справы**

Прызнаўшы папярэдняе следства закончаным, а сабраныя доказы дастатковымі для складання абвінаваўчага заключэння, следчы абавязан паведаміць аб гэтым пацярпеўшаму, грамадзянскаму істцу, грамадзянскаму адказчыку або іх прадстаўнікам і адначасова растлумачыць ім, што яны маюць права азнаёміцца з матэрыяламі справы.

У выпадку вуснага або пісьмовага хадайніцтва аб гэтым каго-небудзь з указаных асоб следчы знаёміць пацярпеўшага і грамадзянскага істца або іх прадстаўнікоў з матэрыяламі справы, а грамадзянскага адказчыка або яго прадстаўніка — з матэрыяламі справы, якія датычаць заяўленага іску.

Аб азнаямленні пацярпеўшага, грамадзянскага істца і грамадзянскага адказчыка або іх прадстаўнікоў з матэрыяламі справы складаюцца пратаколы з захаваннем патрабаванняў артыкулаў 138 і 139 гэтага Кодэкса. У пратаколах адзначаецца, з якімі матэрыяламі справы азнаёмлены пацярпеўшы, грамадзянскіісцец, грамадзянскі адказчык або іх прадстаўнікі, а таксама якія хадайніцтвы былі пры гэтым заяўлены. Пісьмовыя хадайніцтвы далучаюцца да справы.

У выпадку поўнай або частковай адмовы ў задавальненні хадайніцтва следчы выносіць аб гэтым матываваную пастанову. Пастанова аб'яўляецца асобе, якая заявіла хадайніцтва.

Артыкул 200. **Азнаямленне абвінавачваемага з усімі матэрыяламі справы**

Прызнаўшы сабраныя доказы дастатковымі для складання абвінаваўчага заключэння і выканаўшы патрабаванні артыкула 199 гэтага Кодэкса, следчы аб'яўляе абвінавачваемаму, што следства па яго справе скончана і што ён мае права на азнаямленне з усімі матэрыяламі справы як асабіста, так і з дапамогай абаронцы, а таксама на заяву хадайніцтва аб дапаўненні папярэдняга следства.

Калі абвінавачваемы не заявіў аб жаданні мець абаронцу, яму прад'яўляюцца для азнаямлення ўсе матэрыялы справы. У выпадках, калі абвінавачваемы хадайнічае аб выкліку абаронцы для ўдзелу ў азнаямленні з судаводствам па справе, а таксама ў выпадках, калі абаронца ўдзельнічае ў справе з моманту прад'яўлення абвінавачання, следчы прад'яўляе ўсе матэрыялы справы абвінавачваемаму і яго абаронцу.

Пры гэтым прад'яўленне матэрыялаў справы павінна быць адкладзена да яўкі абаронцы, але не больш чым на пяць сутак. Пры немагчымасці для абранага абвінавачваемым абаронцы з'явіцца ва ўказаны тэрмін следчы прымае меры для выкліку іншага абаронцы. Усе матэрыялы справы прад'яўляюцца абвінавачваемаму і яго абаронцу ў падшытым і пранумараваным выглядзе. Па просьбе абвінавачваемага або яго абаронцы следчы мае права дазволіць ім знаёміцца з матэрыяламі справы раздзельна.

Калі па справе прыцягнута некалькі абвінавачваемых, кожнаму з іх прад'яўляюцца ўсе матэрыялы справы.

Пасля заканчэння азнаямлення абвінавачваемага і яго абаронцы з матэрыяламі справы следчы абавязан запытаць у іх, ці хадайнічаюць яны аб дапаўненні следства і чым іменна.

Абвінавачваемы мае права ў працэсе азнаямлення з матэрыяламі справы выпісваць з яе неабходныя звесткі.

Артыкул 201. **Азнаямленне законнага прадстаўніка непаўналетняга абвінавачваемага з матэрыяламі справы**

Пры аб'яўленні непаўналетняму аб заканчэнні папярэдняга следства і прад'яўленні яму для азнаямлення матэрыялаў справы павінен быць дапушчан законны прадстаўнік абвінавачваемага, калі ён хадайнічае аб гэтым.

Следчы можа не дапусціць законнага прадстаўніка непаўналетняга да ўдзелу ў азнаямленні абвінавачваемага з матэрыяламі справы, калі прызнае, што гэта можа быць у шкоду інтарэсам непаўналетняга.

Артыкул 202. **Правы абаронцы пры азнаямленні з усімі матэрыяламі справы**

Абаронца абвінавачваемага мае права:

1) мець спатканне з абвінавачваемым сам-насам;

2) знаёміцца з усімі матэрыяламі справы і выпісваць з яе неабходныя звесткі;

3) абмяркоўваць з абвінавачваемым пытанне аб заяўленні хадайніцтваў;

4) заяўляць хадайніцтвы аб правядзенні следчых дзеянняў, выпатрабаванні і далучэнні да справы доказаў і па ўсіх іншых пытаннях, якія маюць значэнне для справы;

5) заяўляць адвод следчаму, пракурору, эксперту, перакладчыку;

6) скардзіцца пракурору на дзеянні следчага, якія пару-

шаюць або абмяжоўваюць правы абаронцы або абвінавачваемага;

7) прысутнічаць з дазволу следчага пры правядзенні следчых дзеянняў, якія выконваюцца па хадайніцтвах, заяўленых абвінавачваемым і яго абаронцам.

Артыкул 203. **Пратакол аб'яўлення аб сканчэнні папярэдняга следства і аб прад'яўленні абвінавачваемаму і яго абаронцу матэрыялаў справы**

Аб прад'яўленні абвінавачваемаму і яго абаронцу для азнаямлення ўсіх матэрыялаў справы следчы складае пратакол з захаваннем патрабаванняў артыкулаў 138 і 139 гэтага Кодэкса. У пратаколе адзначаецца, што абвінавачваемаму аб'яўлена аб заканчэнні папярэдняга следства, растлумачаны яго правы, якія іменна матэрыялы (колькасць тамоў і лістоў) былі прад'яўлены для азнаямлення, дзе і на працягу якога часу адбывалася азнаямленне з матэрыяламі справы, якія хадайніцтвы былі заяўлены абвінавачваемым і яго абаронцам і якія заявы былі імі зроблены. Калі абвінавачваемы адмовіўся ад азнаямлення з матэрыяламі справы, аб гэтым указваецца ў пратаколе і выкладаюцца матывы адмовы, калі абвінавачваемы іх паведаміў.

Артыкул 204. **Хадайніцтвы абвінавачваемага і яго абаронцы аб дапаўненні папярэдняга следства**

Хадайніцтвы аб дапаўненні папярэдняга следства могуць быць заяўлены абвінавачваемым і яго абаронцам вусна і пісьмова. Заяўленыя хадайніцтвы заносяцца ў пратакол, а пісьмовыя хадайніцтвы, акрамя таго, далучаюцца да справы.

У выпадку заяўлення хадайніцтва аб высвятленні акалічнасцей, якія маюць значэнне для справы, следчы абавязан дапоўніць папярэдняе следства. Калі пры дадаткова праведзеных следчых дзеяннях прысутнічае абаронца, ён мае права з дазволу следчага задаваць пытанні сведку, пацярпеўшаму, эксперту і абвінавачваемаму, а таксама хадайнічаць аб занясенні ў пратакол даных, якія маюць значэнне для справы.

Следчы можа адвесці пытанні, якія прапаноўвае абаронца, аднак адведзенае пытанне павінна быць занесена ў пратакол.

У выпадку, калі следчы адмаўляе поўнасцю або часткова ў задавальненні заяўленых хадайніцтваў, ён аб гэтым выносіць матываваную пастанову, якую аб'яўляе заяўшчыку.

Пасля правядзення дадатковых следчых дзеянняў следчы абавязан азнаёміць абвінавачваемага, яго абаронцу з дадаткова сабранымі матэрыяламі і даць магчымасць пацярпеўшаму, грамадзянскаму істцу і грамадзянскаму адказчыку або іх прадстаўнікам азнаёміцца з гэтымі матэрыяламі ў межах, установленых гэтым Кодэксам.

Артыкул 205. **Абвінаваўчае заключэнне**

Абвінаваўчае заключэнне складаецца з апісальнай і рэзалютыўнай частак.

У апісальнай частцы выкладаецца сутнасць справы: месца і час учынення злачынства, яго спосабы, матывы, вынікі і іншыя істотныя акалічнасці; звесткі аб пацярпеўшым; доказы, якія пацвярджаюць наяўнасць злачынства і вінаватасць абвінавачваемага; акалічнасці, якія змякчаюць і абцяжваюць адказнасць абвінавачваемага; довады, якія прыводзіць абвінавачваемы ў сваю абарону, і вынікі праверкі гэтых довадаў. Абвінаваўчае заключэнне павінна мець спасылкі на лісты справы.

У рэзалютыўнай частцы прыводзяцца звесткі аб асобе абвінавачваемага і выкладаецца фармулёўка прад'яўленага абвінавачання з указаннем артыкула або артыкулаў крымінальнага закону, якія прадугледжваюць данае злачынства.

Абвінаваўчае заключэнне падпісваецца следчым з указаннем месца і часу яго складання.

Артыкул 206. **Дадатак да абвінаваўчага заключэння**

Да абвінаваўчага заключэння прыкладаюцца спіс асоб, якія падлягаюць, на думку следчага, выкліку ў судовае пасяджэнне, а таксама даведкі аб тэрмінах следства, аб абраных мерах стрымання з указаннем часу ўтрымання пад вартай, аб рэчавых доказах, аб грамадзянскім іску, аб прынятых мерах забеспячэння грамадзянскага іску і магчымай канфіскацыі маёмасці, аб судовых выдатках.

У спісе асоб, якія падлягаюць выкліку ў судовае пасяджэнне, указваецца іх месцапражыванне або месцазнаходжанне і лісты справы, на якіх выкладзены іх паказанні або заключэнні.

Артыкул 207. **Накіраванне крымінальнай справы пракурору**

Пасля падпісання абвінаваўчага заключэння следчы неадкладна накіроўвае справу пракурору.

Артыкул 208. **Падставы да спынення крымінальнай справы**

Крымінальная справа спыняецца:

1) пры наяўнасці падстаў, указаных у артыкуле 5 гэтага Кодэкса;

2) пры недаказанасці ўдзелу абвінавачваемага ва ўчыненні злачынства, калі вычарпаны ўсе магчымасці для збірання дадатковых доказаў;

3) пры наяўнасці падстаў, указаных у артыкулах 10, часткі трэцяй і 48—50 Крымінальнага кодэкса Беларускай ССР.

Калі па справе прыцягнута некалькі абвінавачваемых, а падставы да спынення справы датычаць не ўсіх абвінавачваемых, то следчы спыняе справу ў адносінах да асобных абвінавачваемых.

Артыкул 209. **Пастанова аб спыненні справы**

Аб спыненні справы следчы складае матываваную пастанову, у якой выкладаецца сутнасць справы і падставы спынення.

Пастановай павінна быць вырашана пытанне аб рэчавых доказах, аб адмене меры стрымання і арышту на маёмасць. Пастанова падпісваецца следчым з указаннем месца і часу яе складання.

Копію пастановы аб спыненні справы следчы накіроўвае пракурору. Адначасова следчы пісьмова паведамляе аб спыненні і падставах спынення крымінальнай справы асобе, якая прыцягвалася ў якасці абвінавачваемай, пацярпеўшай, а таксама асобе або ўстанове, па заявах якіх справа была ўзбуджана, і растлумачвае парадак абскарджання.

Калі расследаваннем устаноўлены факты, што патрабуюць ужывання мер грамадскага, дысцыплінарнага або адміністрацыйнага ўздзеяння ў адносінах да асобы, якая прыцягвалася ў якасці абвінавачваемай, або іншых асоб, следчы, спыняючы крымінальную справу, даводзіць аб гэтых фактах да ведама грамадскай арганізацыі або таварыскага суда, або калектыву працоўных, або адміністрацыі адпаведнага прадпрыемства, установы для прыняцця грамадскіх або дысцыплінарных, або адміністрацыйных мер уздзеяння.

Пастанова аб спыненні справы можа быць абскарджана пракурору.

Артыкул 210. **Аднаўленне спыненай справы**

Пракурор мае права сваёй пастановай пры наяўнасці да таго падстаў адмяніць пастанову следчага аб спыненні крымінальнай справы і аднавіць судаводства па справе.

Аднаўленне судаводства па спыненай справе можа мець месца толькі ў выпадку, калі не скончыліся тэрміны даўнасці.

## ГЛАВА 20

## НАГЛЯД ПРАКУРОРА ЗА ВЫКАНАННЕМ ЗАКОНАЎ ПРЫ ПРАВЯДЗЕННІ ДАЗНАННЯ І ПАПЯРЭДНЯГА СЛЕДСТВА

Артыкул 211. **Паўнамоцтвы пракурора па ажыццяўленню нагляду за выкананнем законаў пры правядзенні дазнання і папярэдняга следства**

Нагляд за выкананнем законаў пры правядзенні дазнання і папярэдняга следства ажыццяўляецца пракурорам у адпаведнасці з Палажэннем аб Пракурорскім наглядзе ў СССР.

Пракурор абавязан:

1) прыцягваць да крымінальнай адказнасці асоб, вінаватых ва ўчыненні злачынстваў, прымаць меры да таго, каб ні адно злачынства не засталося нераскрытым і ні адзін злачынец не ўхіліўся ад адказнасці;

2) строга сачыць за тым, каб ні адзін грамадзянін не падвяргаўся незаконнаму і неабгрунтаванаму прыцягненню да крымінальнай адказнасці або іншаму незаконнаму абмежаванню ў правах;

3) сачыць за няўхільным захаваннем устаноўленага гэтым Кодэксам парадку правядзення дазнання і папярэдняга следства;

4) ажыццяўляць нагляд за тым, каб ніхто не быў падвергнуты арышту інакш як па пастанове суда або з санкцыі пракурора; пры вырашэнні пытання аб санкцыі на арышт пракурор абавязан дакладна азнаёміцца з усімі матэрыяламі, якія абгрунтоўваюць правядзенне арышту, а ў неабходных выпадках асабіста дапытаць абвінавачваемага або падазраваемага.

Пракурор мае права:

1) даваць указанні аб правядзенні дазнання і папярэдняга следства, аб абранні, змяненні або адмене ў адносінах да

падазраваемага і абвінавачваемага меры стрымання, аб прыцягненні ў якасці абвінавачваемага, кваліфікацыі злачынства і аб'ёме абвінавачання, аб напрамку справы, а таксама аб правядзенні асобных следчых дзеянняў і пошукаў скрыўшыхся злачынцаў;

2) патрабаваць ад органа дазнання і следчага для праверкі крымінальныя справы, дакументы, матэрыялы і іншыя звесткі аб учыненых злачынствах, ходзе дазнання, папярэдняга следства і пошукаў злачынцаў;

3) удзельнічаць у правядзенні дазнання і папярэдняга следства і ў неабходных выпадках асабіста праводзіць папярэдняе следства або асобныя следчыя дзеянні;

4) вяртаць крымінальныя справы органу дазнання і следчаму са сваімі пісьмовымі ўказаннямі аб правядзенні дадатковага расследавання;

5) адмяняць незаконныя і неабгрунтаваныя пастановы органа дазнання і следчага;

6) адхіляць асобу, якая праводзіць дазнанне, або следчага ад далейшага вядзення дазнання або следства, калі імі допушчана парушэнне закону пры расследаванні справы;

7) забіраць любую справу ад органа дазнання і перадаваць яе следчаму, а таксама перадаваць справу ад аднаго следчага іншаму з мэтай забеспячэння найбольш поўнага і аб'ектыўнага расследавання справы;

8) даручаць органам дазнання выкананне асобных следчых дзеянняў і пошукавых мер па справах, якія знаходзяцца ў вядзенні следчых органаў пракуратуры;

9) спыняць крымінальныя справы па падставах, прадугледжаных гэтым Кодэксам.

### Артыкул 212. **Абавязковасць указанняў пракурора**

Указанні пракурора даюцца ў пісьмовай форме і абавязковыя для следчага і асобы, якая праводзіць дазнанне. Абскарджанне атрыманых указанняў вышэйстаячаму пракурору не прыпыняе іх выканання, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных часткай другой артыкула 44 гэтага Кодэкса.

### Артыкул 213. **Пытанні, якія падлягаюць вырашэнню пракурорам па справе, што паступіла з абвінаваўчым заключэннем**

Пры паступленні справы ад органа дазнання або следчага пракурор абавязан праверыць:

1) ці мела месца дзеянне, якое ставіцца ў віну абвінавачваемаму, і ці ёсць у гэтым дзеянні склад злачынства;

2) ці няма ў справе акалічнасцей, што выклікаюць спыненне справы;

3) ці праведзена дазнанне або папярэдняе следства ўсебакова, поўна і аб'ектыўна;

4) ці абгрунтавана прад'яўленае абвінавачанне наяўнымі ў справе доказамі;

5) ці прад'яўлена абвінавачанне па ўсіх устаноўленых дазнаннем або папярэднім следствам злачынных дзеяннях абвінавачваемага;

6) ці прыцягнуты ў якасці абвінавачваемых усе асобы, якія выкрыты ва ўчыненні злачынства;

7) ці правільна кваліфікавана злачынства;

8) ці правільна абрана мера стрымання;

9) ці прыняты меры забеспячэння грамадзянскага іску і магчымай канфіскацыі маёмасці;

10) ці высветлены акалічнасці, якія садзейнічалі ўчыненню злачынства, і ці прыняты меры да іх ліквідацыі;

11) ці складзена абвінаваўчае заключэнне ў адпаведнасці з патрабаваннямі гэтага Кодэкса;

12) ці захаваны пры правядзенні дазнання або папярэдняга следства ўсе іншыя патрабаванні гэтага Кодэкса.

### Артыкул 214. **Рашэнне пракурора па справе, якая паступіла з абвінаваўчым заключэннем**

Пракурор абавязан у тэрмін не больш чым пяць сутак разгледзець паступіўшую справу і прыняць па ёй адно з наступных рашэнняў:

1) зацвердзіць абвінаваўчае заключэнне;

2) вярнуць справу органу дазнання або следчаму са сваімі пісьмовымі ўказаннямі для правядзення дадатковага дазнання або следства;

3) спыніць справу, склаўшы аб тым пастанову ў адпаведнасці з артыкулам 209 гэтага Кодэкса;

4) у выпадку неадпаведнасці абвінаваўчага заключэння патрабаванням артыкула 205 гэтага Кодэкса вярнуць справу са сваімі пісьмовымі ўказаннямі следчаму або органу дазнання для перакладання абвінаваўчага заключэння;

5) скласці новае абвінаваўчае заключэнне, а раней складзенае — са справы выключыць і вярнуць органу дазнання або следчаму з указаннем выяўленых няправільнасцей.

Артыкул 215. **Змяненне абвінавачання пры зацвярджэнні абвінаваўчага заключэння пракурорам**

Пракурор мае права сваёй пастановай выключыць з абвінаваўчага заключэння асобныя пункты абвінавачання, а таксама прымяніць закон аб менш цяжкім злачынстве. Пры гэтым, у выпадку неабходнасці, складаецца новае абвінаваўчае заключэнне.

Калі патрабуецца змяніць абвінавачанне на больш цяжкае або такое, якое істотна адрозніваецца па фактычных акалічнасцях ад першапачатковага абвінавачання, пракурор вяртае справу органу дазнання або следчаму для прад'яўлення новага абвінавачання.

Артыкул 216. **Змяненне пракурорам меры стрымання і спісу асоб, якія падлягаюць выкліку ў судовае пасяджэнне**

Пракурор мае права адмяніць або змяніць раней абраную меру стрымання або абраць меру стрымання, калі яна не была абрана.

Пракурор мае права таксама змяніць прыкладзены да абвінаваўчага заключэння спіс асоб, якія падлягаюць выкліку ў судовае пасяджэнне.

Артыкул 217. **Накіраванне пракурорам справы ў суд**

Пракурор, зацвердзіўшы абвінаваўчае заключэнне альбо склаўшы новае абвінаваўчае заключэнне, накіроўвае справу ў суд, якому яна падсудная, і паведамляе абвінавачваемаму, у які суд накіравана справа.

Адначасова пракурор паведамляе суду, ці лічыць ён неабходным падтрымліваць у судзе абвінавачанне.

Пасля накіравання справы ў суд усякія хадайніцтвы і скаргі па справе накіроўваюцца непасрэдна ў суд.

## ГЛАВА 21

## АБСКАРДЖАННЕ ДЗЕЯННЯЎ ОРГАНА ДАЗНАННЯ, СЛЕДЧАГА І ПРАКУРОРА

Артыкул 218. **Парадак абскарджання**

Скаргі на дзеянні органа дазнання або следчага падаюцца пракурору непасрэдна альбо праз асобу, што праводзіць

дазнанне, або следчага, на дзеянні якога скарга пададзена. Скаргі могуць быць як пісьмовыя, так і вусныя. Вусныя скаргі заносяцца ў пратакол, які падпісваецца заяўшчыкам і асобай, прыняўшай скаргу.

Асоба, якая праводзіць дазнанне, і следчы абавязаны на працягу дваццаці чатырох гадзін накіраваць паступіўшую скаргу разам са сваімі тлумачэннямі пракурору.

Падача скаргі да яе вырашэння не прыпыняе прывядзенне ў выкананне абскарджваемага дзеяння, калі гэтага не палічаць патрэбным зрабіць адпаведна асоба, якая праводзіць дазнанне, следчы або пракурор.

Артыкул 219. **Разгляд скаргі пракурорам**

Пракурор на працягу трох сутак пасля атрымання скаргі абавязан разгледзець яе і паведаміць заяўшчыку аб выніках разгляду. У выпадку адмовы пракурор абавязан вытлумачыць матывы, па якіх скарга прызнана неабгрунтаванай.

Артыкул 220. **Абскарджанне дзеянняў і рашэнняў пракурора**

Скаргі на дзеянні і рашэнні пракурора падаюцца вышэйстаячаму пракурору.

ГЛАВА 22

## АСАБЛІВАСЦІ ПАПЯРЭДНЯГА СЛЕДСТВА ПА СПРАВАХ АБ АСОБАХ, ЯКІЯ ЗНАХОДЗЯЦЦА Ў СТАНЕ ПОЎНАЙ АДСУТНАСЦІ ПАМЯЦІ, І АСОБАХ, ЗАХВАРЭЎШЫХ НА ПСІХІЧНУЮ ХВАРОБУ ПАСЛЯ ЎЧЫНЕННЯ ЗЛАЧЫНСТВА

Артыкул 221. **Парадак папярэдняга следства**

Па справах аб грамадска небяспечных дзеяннях асоб, якія знаходзяцца ў стане поўнай адсутнасці памяці, а таксама аб злачынствах асоб, захварэўшых на псіхічную хваробу пасля ўчынення злачынства, абавязкова правядзенне папярэдняга следства.

Пры правядзенні папярэдняга следства павінны быць высветлены наступныя акалічнасці:

1) час, месца, спосаб і іншыя акалічнасці ўчынення грамадска небяспечнага дзеяння;

2) учыненне грамадска небяспечнага дзеяння данай асобай;

3) наяўнасць у асобы, якая ўчыніла грамадска небяспеч-

нае дзеянне, псіхічных захворванняў у мінулым, ступень і характар псіхічнага захворвання ў момант учынення грамадска небяспечнага дзеяння і да часу расследавання справы;

4) паводзіны асобы, якая ўчыніла грамадска небяспечнае дзеянне, як да яго ўчынення, так і пасля;

5) характар і размер шкоды, нанесенай грамадска небяспечным дзеяннем.

Накіраванне асобы на судова-псіхіятрычную экспертызу дапускаецца толькі пры наяўнасці дастатковых даных, якія ўказваюць, што іменна гэтая асоба ўчыніла грамадска небяспечнае дзеянне, адносна якога ўзбуджана крымінальная справа і вядзецца расследаванне.

Калі з прычыны псіхічнага стану правядзенне следчых дзеянняў з удзелам асобы, якая ўчыніла грамадска небяспечнае дзеянне, з'яўляецца немагчымым, следчы складае аб гэтым пратакол.

Артыкул 222. **Заканчэнне папярэдняга следства**

Пасля заканчэння папярэдняга следства следчы выносіць пастанову:

1) аб спыненні вядзення справы — у выпадках, прадугледжаных артыкулам 208 гэтага Кодэкса, або ў выпадках, калі па характару ўчыненага грамадска небяспечнага дзеяння і свайму псіхічнаму стану асоба, якая ўчыніла гэтае дзеянне, не з'яўляецца небяспечнай для грамадства;

2) аб накіраванні справы ў суд пры ўстанаўленні падстаў для прымянення да асобы, якая ўчыніла грамадска небяспечнае дзеянне, прымусовых мер медыцынскага характару.

У пастанове аб накіраванні справы ў суд павінны быць выкладзены ўсе акалічнасці справы, устаноўленыя папярэднім следствам, і падставы для ўжывання судом прымусовых мер медыцынскага характару.

Пастанова разам са справай накіроўваецца пракурору, які пры згодзе з пастановай перадае справу ў суд, а пры нязгодзе — вяртае справу для правядзення дадатковага расследавання. Пры адсутнасці падстаў для ўжывання прымусовых мер медыцынскага характару пракурор спыняе справу.

Пры спыненні справы, калі па характару ўчыненага грамадска небяспечнага дзеяння і свайму псіхічнаму стану асоба, якая ўчыніла гэтае дзеянне, не з'яўляецца небяспечнай для грамадства, але з'яўляецца псіхічна хворай, следчы або пракурор паведамляюць аб ёй мясцовым органам аховы здароўя.

## РАЗДЗЕЛ ЧАЦВЁРТЫ

# СУДАВОДСТВА Ў СУДЗЕ ПЕРШАЙ ІНСТАНЦЫІ

### ГЛАВА 23

### АДДАННЕ АБВІНАВАЧВАЕМАГА ПАД СУД І ПАДРЫХТОЎЧЫЯ ДЗЕЯННІ ДА СУДОВАГА ПАСЯДЖЭННЯ

Артыкул 223. **Адданне пад суд**

Суддзя пры наяўнасці дастатковых падстаў для разгляду справы ў судовым пасяджэнні, не прадвырашаючы пытання аб вінаватасці, выносіць пастанову аб адданні абвінавачваемага пад суд.

У выпадках нязгоды суддзі з вывадамі абвінаваўчага заключэння, а таксама пры неабходнасці змяніць меру стрымання, выбраную ў адносінах да абвінавачваемага, справа падлягае разгляду ў распарадчым пасяджэнні суда. Пры гэтым незалежна ад падстаў унясення справы на разгляд распарадчага пасяджэння суд вырашае ўсе пытанні, прадугледжаныя артыкуламі 224 і 230 гэтага Кодэкса.

Пытанне аб адданні пад суд павінна быць вырашана суддзёй або судом у распарадчым пасяджэнні не пазней дзесяці сутак з моманту паступлення справы ў суд.

Артыкул 224. **Пытанні, якія падлягаюць высвятленню пры адданні пад суд**

Пры вырашэнні суддзёй або судом у распарадчым пасяджэнні пытання аб адданні абвінавачваемага пад суд падлягае высвятленню ў адносінах да кожнага з абвінавачваемых наступнае:

1) ці падсудна справа данаму суду;

2) ці ёсць у дзеянні, якое ставіцца ў віну абвінавачваемаму, склад злачынства;

3) ці прад'яўлена абвінавачанне па ўсіх дзеяннях і ці прыцягнуты ўсе ўдзельнікі ўчынення злачынства;

4) ці няма акалічнасцей, якія выклікаюць спыненне альбо прыпыненне справы;

5) ці сабраны па справе доказы, дастатковыя для яе разгляду ў судовым пасяджэнні;

6) ці правільна прыменены да дзеянняў, якія ставяцца ў віну абвінавачваемаму, крымінальны закон;

7) ці захаваны пры ўзбуджэнні справы, правядзенні дазнання або папярэдняга следства патрабаванні гэтага Кодэкса;

8) ці складзена абвінаваўчае заключэнне ў адпаведнасці з патрабаваннямі гэтага Кодэкса;

9) ці правільна абрана мера стрымання ў адносінах да абвінавачваемага;

10) ці прыняты меры, якія забяспечваюць кампенсацыю матэрыяльных страт, нанесеных злачынствам, і магчымую канфіскацыю маёмасці.

Артыкул 225. **Разгляд хадайніцтваў.**

Пры вырашэнні пытання аб адданні абвінавачваемага пад суд суддзя або суд у распарадчым пасяджэнні абавязаны разгледзець наяўныя хадайніцтвы аб допуску да ўдзелу ў справе, аб далейшым накіраванні справы, аб выпатрабаванні дадатковых доказаў, аб грамадзянскім іску і мерах яго забеспячэння. Пры гэтым суддзя або суд у распарадчым пасяджэнні маюць права выклікаць для дачы тлумачэнняў асобу або прадстаўніка арганізацыі, якія заявілі хадайніцтва. Акрамя таго, суд у распарадчым пасяджэнні абавязан разгледзець хадайніцтва аб змяненні меры стрымання.

Аб выніках вырашэння хадайніцтва паведамляецца асобам або арганізацыям, што заявілі хадайніцтва. Адмова ў задавальненні хадайніцтва абскарджанню не падлягае. Аднак хадайніцтва можа быць зноў заяўлена ў судовым пасяджэнні.

Артыкул 226. **Склад суда ў распарадчым пасяджэнні**

Крымінальныя справы ў распарадчым пасяджэнні ўсіх судоў разглядаюцца ў складзе суддзі і двух народных засядацеляў.

Удзел пракурора ў распарадчым пасяджэнні абавязковы.

Артыкул 227. **Парадак распарадчага пасяджэння суда**

Разгляд справы ў распарадчым пасяджэнні пачынаецца дакладам суддзі, які абгрунтоўвае сваю нязгоду з вывадамі абвінаваўчага заключэння або з мерай стрымання. Затым суд выслухоўвае пракурора. Пасля гэтага запрашаюцца выкліканыя ў пасяджэнне суда асобы, якія выслухоўваюцца ў сувязі з заяўленымі імі хадайніцтвамі. Па заяўленых хадайніцтвах суд выслухоўвае заключэнне пракурора. Вызначэнне выносіцца ў дарадчым пакоі.

Выклік сведак і экспертаў у распарадчае пасяджэнне не дапускаецца.

**Артыкул 228. Віды вызначэнняў, якія выносяцца судом у распарадчым пасяджэнні**

У распарадчым пасяджэнні суд выносіць адно з наступных вызначэнняў:

1) аб адданні абвінавачваемага пад суд;

2) аб вяртанні справы для правядзення дадатковага расследавання;

3) аб прыпыненні вядзення справы;

4) аб накіраванні справы па падсуднасці;

5) аб спыненні вядзення справы.

**Артыкул 229. Адданне абвінавачваемага пад суд у распарадчым пасяджэнні**

Зрабіўшы вывад, што ёсць дастатковыя падставы для разгляду справы ў судовым пасяджэнні, суд у распарадчым пасяджэнні, не прадвырашаючы пытання аб вінаватасці, выносіць вызначэнне аб адданні абвінавачваемага пад суд. Пры гэтым суд мае права выключыць з абвінаваўчага заключэння асобныя пункты абвінавачання або прымяніць крымінальны закон аб менш цяжкім злачынстве, аднак з тым, каб новае абвінавачанне па сваіх фактычных акалічнасцях не адрознівалася істотна ад абвінавачання, якое ёсць у абвінаваўчым заключэнні.

Рашэнне аб выключэнні асобных пунктаў абвінавачання або аб прымяненні іншага крымінальнага закону павінна быць матывавана ў вызначэнні распарадчага пасяджэння.

**Артыкул 230. Вырашэнне пытанняў, звязаных з падрыхтоўкай да разгляду справы ў судовым пасяджэнні**

Прызнаўшы наяўнасць дастатковых падстаў для аддання абвінавачваемага пад суд, суддзя або суд у распарадчым пасяджэнні абавязаны таксама вырашыць наступныя пытанні:

1) аб удзеле ў судовым разборы пракурора;

2) аб допуску ў якасці абаронцы асобы, абранай абвінавачваемым, або аб назначэнні абаронцы;

3) аб асобах, якія падлягаюць выкліку ў судовае пасяджэнне ў якасці пацярпеўшага, грамадзянскага істца, грамадзянскага адказчыка, іх прадстаўнікоў, сведак і экспертаў;

4) аб выкліку перакладчыка;

5) аб месцы і часе судовага разбору.

Акрамя таго, суд у распарадчым пасяджэнні вырашае пытанне аб допуску грамадскага абвінаваўцы або грамадскага абаронцы, а таксама аб разглядзе справы ў закрытым судовым пасяджэнні ў выпадках, прадугледжаных артыкулам 13 гэтага Кодэкса.

Пастанова суддзі або вызначэнне распарадчага пасяджэння суда аб неабходнасці ўдзелу ў судовым разборы пракурора абавязкова для апошняга.

Калі пракурор, накіроўваючы справу ў суд, паведаміць, што ён лічыць неабходным падтрымліваць абвінавачанне, то суддзя або суд у распарадчым пасяджэнні не маюць права адмовіць яму ў гэтым.

### Артыкул 231. Пастанова суддзі і вызначэнне распарадчага пасяджэння суда

У пастанове суддзі і вызначэнні распарадчага пасяджэння суда павінна ўказвацца:

1) час і месца вынясення пастановы або вызначэння;

2) пасада і прозвішча суддзі, які вынес пастанову, або склад суда ў распарадчым пасяджэнні, прозвішча сакратара, пасада і прозвішча пракурора, якія прымалі ўдзел у распарадчым пасяджэнні;

3) падставы і сутнасць прынятых рашэнняў.

Пастанова падпісваецца суддзёй. Вызначэнне падпісваецца старшынствуючым і народнымі засядацелямі.

### Артыкул 232. Пастанова і вызначэнне аб адданні пад суд

У пастанове суддзі і вызначэнні распарадчага пасяджэння суда аб адданні абвінавачваемага пад суд павінны быць: вывад аб дастатковасці доказаў для разгляду справы ў судовым пасяджэнні, рашэнне аб адданні пад суд, прозвішча, імя і імя па бацьку асобы, якую аддаюць пад суд, крымінальны закон, што падлягае прымяненню, рашэнне аб меры стрымання ў адносінах да падсуднага, а таксама рашэнні па хадайніцтвах і па пытаннях, пералічаных у артыкуле 230 гэтага Кодэкса.

### Артыкул 233. Прыпыненне справы і накіраванне яе па падсуднасці

Калі пры разглядзе пытання аб адданні пад суд высветліцца, што абвінавачваемы скрыўся і месцазнаходжанне яго

невядома, суддзя або суд у распарадчым пасяджэнні выносяць пастанову або вызначэнне аб прыпыненні вядзення справы да адшукання абвінавачваемага, а справу вяртаюць пракурору.

У выпадку засведчанага ўрачом, працуючым у лячэбнай установе, цяжкага захворвання абвінавачваемага, якое выключае магчымасць яго ўдзелу ў судовым пасяджэнні, суддзя або суд у распарадчым пасяджэнні выносяць пастанову або вызначэнне аб прыпыненні вядзення справы да выздараўлення абвінавачваемага.

Калі суддзя або суд у распарадчым пасяджэнні ўстановяць, што справа не падсудная данаму суду, яны выносяць пастанову або вызначэнне аб накіраванні справы па падсуднасці.

### Артыкул 234. **Вяртанне справы для правядзення дадатковага расследавання**

Суд у распарадчым пасяджэнні накіроўвае справу для правядзення дадатковага расследавання ў выпадках:

1) непаўнаты праведзенага дазнання або папярэдняга следства, якая не можа быць папоўнена ў судовым пасяджэнні;

2) істотнага парушэння крымінальна-працэсуальнага закону пры правядзенні дазнання або папярэдняга следства, якое перашкаджае разгляду справы судом;

3) наяўнасці падстаў для прад'яўлення абвінавачваемаму іншага абвінавачання, звязанага з прад'яўленым раней, альбо для змянення абвінавачання на больш цяжкае або на абвінавачанне, якое істотна адрозніваецца па фактычных акалічнасцях ад абвінавачання, што змяшчалася ў абвінаваўчым заключэнні;

4) наяўнасці падстаў для прыцягнення да крымінальнай адказнасці па данай справе іншых асоб пры немагчымасці выдзеліць аб іх матэрыялы справы;

5) няправільнага злучэння або раз'яднання справы.

Справа накіроўваецца для дадатковага расследавання пракурору. Пры гэтым суд абавязан указаць у сваім вызначэнні, на якой падставе справа вяртаецца і якія акалічнасці павінны быць дадаткова высветлены.

Пры накіраванні справы для дадатковага расследавання суд абавязан вырашыць пытанне аб меры стрымання ў адносінах да абвінавачваемага.

Артыкул 235. **Меры забеспячэння грамадзянскага іску і канфіскацыі маёмасці**

У выпадку непрыняцця асобай, якая праводзіць дазнанне, або следчым мер, якія забяспечваюць кампенсацыю матэрыяльных страт, нанесеных злачынствам, і магчымай канфіскацыі маёмасці, калі такія меры не могуць быць прыняты непасрэдна судом, суддзя або суд у распарадчым пасяджэнні абавязваюць адпаведныя органы прыняць неабходныя меры забеспячэння.

Артыкул 236. **Спыненне справы**

Пры наяўнасці акалічнасцей, указаных у артыкуле 5 і пункце 3 артыкула 208 гэтага Кодэкса, суд у распарадчым пасяджэнні спыняе справу. Пры гэтым суд адмяняе прынятыя меры стрымання, меры забеспячэння грамадзянскага іску і канфіскацыі маёмасці і вырашае пытанне аб рэчавых доказах. Копія вызначэння аб спыненні справы ўручаецца асобе, якая прыцягвалася да крымінальнай адказнасці, і пацярпеўшаму.

Пры ўстанаўленні фактаў, якія патрабуюць ужывання мер грамадскага ўздзеяння да асобы, якая прыцягвалася да крымінальнай адказнасці, суд, спыняючы крымінальную справу, даводзіць аб гэтых фактах да ведама адпаведнага таварыскага суда, Камісіі па справах непаўналетніх альбо грамадскай арганізацыі, або калектыву працоўных.

Пры спыненні справы па падставах, указаных у артыкуле 50 Крымінальнага кодэкса Беларускай ССР, суд паведамляе грамадскай арганізацыі або калектыву працоўных аб задавальненні іх хадайніцтва і перадачы ім на парукі асобы, якая прыцягвалася да крымінальнай адказнасці.

Артыкул 237. **Пратакол распарадчага пасяджэння**

У пратаколе распарадчага пасяджэння ўказваюцца: месца і час пасяджэння, назва і склад суда, сакратар, пракурор, выкліканыя судом асобы, разглядаемая справа, дзеянні суда ў тым парадку, у якім яны мелі месца, хадайніцтвы асоб, выкліканых у распарадчае пасяджэнне, вызначэнні, вынесеныя без уходу ў дарадчы пакой, указанне на вынясенне вызначэння ў дарадчым пакоі.

Пратакол падпісваецца старшынствуючым і сакратаром.

7 Зак. 86

Артыкул 238. **Забеспячэнне магчымасці азнаямлення з матэрыяламі справы**

Пасля аддання абвінавачваемага пад суд суддзя абавязан забяспечыць пракурору, падсуднаму, яго абаронцы, а таксама пацярпеўшаму, грамадзянскаму істцу, грамадзянскаму адказчыку або іх прадстаўнікам магчымасць азнаёміцца з усімі матэрыяламі справы і выпісваць з яе неабходныя звесткі.

У выпадку заяўлення хадайніцтва грамадскай арганізацыі або калектыву працоўных аб допуску іх прадстаўніка да азнаямлення з матэрыяламі справы да судовага пасяджэння суддзя пасля праверкі паўнамоцтваў прадстаўніка мае права дазволіць яму знаёміцца з матэрыяламі справы.

Артыкул 239. **Уручэнне копіі абвінаваўчага заключэння, пастановы суддзі або вызначэння суда**

Падсуднаму павінна быць уручана судом копія абвінаваўчага заключэння.

Калі пры вырашэнні пытання аб адданні пад суд зменены абвінавачанне або мера стрымання, або спіс асоб, якія падлягаюць выкліку ў суд, то падсуднаму ўручаецца таксама копія вызначэння суда або пастановы суддзі.

Па справах аб злачынствах, прадугледжаных артыкуламі 110, 128, часткай першай і 129 Крымінальнага кодэкса Беларускай ССР, калі па іх не праводзілася папярэдняе следства або дазнанне, падсуднаму ўручаюцца копіі заявы пацярпеўшага і пастановы суддзі аб адданні яго пад суд.

Разгляд справы ў судовым пасяджэнні не можа быць пачаты раней трох сутак з моманту ўручэння падсуднаму гэтых дакументаў.

Артыкул 240. **Выклік у судовае пасяджэнне**

Суддзя дае распараджэнне аб выкліку ў судовае пасяджэнне асоб, указаных у яго пастанове або ў вызначэнні распарадчага пасяджэння, забяспечвае ўручэнне ім судовых позваў, а таксама прымае іншыя меры для падрыхтоўкі судовага пасяджэння.

Артыкул 241. **Тэрміны разгляду справы ў судовым пасяджэнні**

Справа павінна быць пачата разглядам у судовым пасяджэнні не пазней чатырнаццаці сутак з моманту вынясення пастановы суддзі альбо вызначэння распарадчага пасяджэння аб адданні абвінавачваемага пад суд.

ГЛАВА 24

## АГУЛЬНЫЯ ЎМОВЫ СУДОВАГА РАЗБОРУ

Артыкул 242. **Непасрэднасць, вуснасць і бесперапыннасць судовага разбору**

Суд першай інстанцыі пры разглядзе справы абавязан непасрэдна даследаваць доказы па справе: дапытаць падсудных, пацярпеўшых, сведак, заслухаць заключэнні экспертаў, агледзець рэчавыя доказы, абвясціць пратаколы і іншыя дакументы.

Судовае пасяджэнне па кожнай справе адбываецца бесперапынна, акрамя часу, назначанага для адпачынку. Разгляд тымі ж суддзямі іншых спраў раней заканчэння слухання пачатай справы не дапускаецца.

Артыкул 243. **Роўнасць правоў удзельнікаў судовага разбору**

Абвінаваўца, падсудны, абаронца, а таксама пацярпеўшы, грамадзянскі істец, грамадзянскі адказчык і іх прадстаўнікі ў судовым разборы карыстаюцца роўнымі правамі па прадстаўленню доказаў, удзелу ў даследаванні доказаў і заяўленню хадайніцтваў.

Артыкул 244. **Старшынствуючы ў судовым пасяджэнні**

У пасяджэнні раённага (гарадскога) народнага суда старшынствуе старэйшы народны суддзя, народны суддзя, а ў пасяджэнні ўсякага іншага суда — старшыня, намеснік старшыні або член суда.

Старшынствуючы кіруе судовым пасяджэннем, прымаючы ўсе прадугледжаныя гэтым Кодэксам меры да ўсебаковага, поўнага і аб'ектыўнага даследавання акалічнасцей справы і ўстанаўлення ісціны, выключаючы з судовага разбору ўсё, што не мае дачынення да справы, і забяспечваючы выхаваўчае ўздзеянне судовага працэсу.

У выпадку пярэчання якой-небудзь з асоб, якая ўдзельнічае ў судовым разборы, супраць дзеянняў старшынствуючага, гэтыя пярэчанні заносяцца ў пратакол судовага пасяджэння.

Артыкул 245. **Удзел падсуднага ў судовым разборы**

Разбор справы ў пасяджэнні суда першай інстанцыі праходзіць з удзелам падсуднага, яўка якога ў суд абавязковая.

Разбор справы ў адсутнасці падсуднага дапускаецца толькі ў тых выпадках, калі падсудны знаходзіцца па-за межамі Саюза ССР і ўхіляецца ад яўкі ў суд.

Артыкул 246. **Вынікі няяўкі падсуднага**

Пры няяўцы падсуднага справа павінна быць адкладзена, за выключэннем выпадку, прадугледжанага артыкулам 245 гэтага Кодэкса.

Суд мае права падвергнуць падсуднага, які не з'явіўся, прыводу, а таксама выбраць або змяніць у адносінах да яго меру стрымання.

Артыкул 247. **Удзел пракурора ў судовым разборы**

Пракурор падтрымлівае перад судом дзяржаўнае абвінавачанне, прымае ўдзел у даследаванні доказаў, дае заключэнні па ўзнікаючых у час судовага разбору пытаннях, прадстаўляе суду свае меркаванні адносна прымянення крымінальнага закону і меры пакарання ў адносінах да падсуднага.

Пракурор, падтрымліваючы абвінавачанне, кіруецца патрабаваннямі закону і сваім унутраным перакананнем, заснаваным на разглядзе ўсіх акалічнасцей справы.

Калі ў выніку судовага разбору пракурор пераканаецца, што даныя судовага следства не пацвярджаюць прад'яўленага падсуднаму абвінавачання, ён абавязан адмовіцца ад абвінавачання і выкласці суду матывы адмовы.

Адмова пракурора ад абвінавачання не вызваляе суд ад абавязку працягваць разбор справы і вырашыць на агульных падставах пытанне аб вінаватасці або невінаватасці падсуднага.

Пракурор мае права прад'явіць або падтрымаць прад'яўлены пацярпеўшым грамадзянскі іск, калі гэтага патрабуе ахова дзяржаўных або грамадскіх інтарэсаў або правоў грамадзян.

Артыкул 248. **Удзел абаронцы ў судовым разборы**

Абаронца прымае ўдзел у даследаванні доказаў, выказвае сваю думку па ўзнікаючых у час судовага разбору пытаннях, выкладае суду меркаванні па сутнасці абвінавачання, адносна акалічнасцей, уплываючых на ступень і характар адказнасці падсуднага, аб прымяненні крымінальнага закону, аб меры пакарання і грамадзянска-прававых выніках злачынства.

Артыкул 249. **Удзел грамадскіх абвінаваўцаў і абаронцаў у судовым разборы**

Прадстаўнікі грамадскіх арганізацый працоўных могуць быць па вызначэнню суда дапушчаны да ўдзелу ў судовым разборы крымінальных спраў у якасці грамадскіх абвінаваўцаў або абаронцаў.

Грамадскі абвінаваўца мае права прымаць удзел у даследаванні доказаў, заяўляць перад судом хадайніцтвы і адводы, удзельнічаць у судовых спрэчках, выкладаючы суду думку аб даказанасці абвінавачання, грамадскай небяспецы падсуднага і ўчыненага ім. Грамадскі абвінаваўца можа выказаць меркаванні наконт прымянення крымінальнага закону і меры пакарання ў адносінах да падсуднага і па іншых пытаннях справы. Грамадскі абвінаваўца мае права адмовіцца ад абвінавачання, калі даныя судовага следства даюць для гэтага падставу.

Грамадскі абаронца мае права прымаць удзел у даследаванні доказаў, заяўляць перад судом хадайніцтвы і адводы, удзельнічаць у судовых спрэчках, выкладаючы суду думку аб акалічнасцях, уплываючых на ступень і характар адказнасці падсуднага, аб прымяненні крымінальнага закону, а таксама аб магчымасці змякчэння пакарання падсуднаму, умоўнага яго асуджэння або вызвалення ад пакарання і аддачы на парукі той грамадскай арганізацыі або калектыву працоўных, ад імя якіх грамадскі абаронца выступае.

Артыкул 250. **Вынікі няяўкі пракурора, грамадскага абвінаваўцы, абаронцы, грамадскага абаронцы**

У выпадку няяўкі пракурора ў судовае пасяджэнне суд вырашае пытанне аб магчымасці разгляду справы ў яго адсутнасці або аб адкладанні справы. Калі суд прызнае ўдзел пракурора неабходным, разбор справы адкладваецца.

Пры няяўцы абаронцы і немагчымасці замяніць яго ў гэтым пасяджэнні разбор справы адкладваецца. Замена абаронцы, які не з'явіўся ў судовае пасяджэнне, дапускаецца толькі са згоды падсуднага.

Пры няяўцы грамадскага абвінаваўцы або грамадскага абаронцы суд, у залежнасці ад акалічнасцей справы, вырашае пытанне аб адкладанні справы разглядам або аб яе разглядзе ў іх адсутнасці.

Новаўступіўшым у справу пракурору, грамадскаму абвінаваўцу, абаронцу і грамадскаму абаронцу павінен быць дадзе-

ны час, неабходны для падрыхтоўкі да ўдзелу ў судовым разборы.

Аб няяўцы пракурора або адваката без уважлівай прычыны суд паведамляе адпаведна вышэйстаячаму пракурору або прэзідыуму калегіі адвакатаў. Пры няяўцы грамадскага абвінаваўцы або грамадскага абаронцы без уважлівай прычыны суд паведамляе аб гэтым адпаведнай грамадскай арганізацыі.

### Артыкул 251. Вынікі няяўкі пацярпеўшага

Пры няяўцы пацярпеўшага суд вырашае пытанне аб разборы справы або адкладанні яе, у залежнасці ад таго, ці магчымы ў адсутнасці пацярпеўшага поўнае высвятленне ўсіх акалічнасцей справы і абарона яго правоў і законных інтарэсаў.

Пры няяўцы без уважлівых прычын пацярпеўшага па справах аб злачынствах, прадугледжаных артыкуламі 110, 128, часткай першай і 129 Крымінальнага кодэкса Беларускай ССР, калі па іх не праводзілася папярэдняе следства або дазнанне, справа спыняецца, аднак па хадайніцтву падсуднага справа ў гэтых выпадках можа быць разгледжана па сутнасці ў адсутнасці пацярпеўшага.

### Артыкул 252. Вынікі няяўкі грамадзянскага істца або грамадзянскага адказчыка

Пры няяўцы грамадзянскага істца або яго прадстаўніка суд пакідае грамадзянскі іск без разгляду; пры гэтым за пацярпеўшым захоўваецца права прад'явіць іск у парадку грамадзянскага судаводства.

Суд мае права па хадайніцтву грамадзянскага істца разгледзець грамадзянскі іск у яго адсутнасці.

Суд разглядае грамадзянскі іск незалежна ад яўкі грамадзянскага істца або яго прадстаўніка, калі іск падтрымлівае пракурор або калі суд прызнае гэта неабходным.

Няяўка грамадзянскага адказчыка або яго прадстаўніка не спыняе разгляд грамадзянскага іску.

### Артыкул 253. Вынікі няяўкі перакладчыка

Пры няяўцы перакладчыка ў судовае пасяджэнне і немагчымасці яго замены справа разглядам адкладваецца. Калі перакладчык ухіляецца ад яўкі ў судовае пасяджэнне або ад выканання сваіх абавязкаў без уважлівых прычын, да яго могуць быць прыняты меры, прадугледжаныя артыкулам 129 гэтага Кодэкса.

**Артыкул 254. Межы судовага разбору**

Разбор справы ў судзе праводзіцца толькі ў адносінах да абвінавачваемых і толькі па таму абвінавачанню, па якому яны аддадзены пад суд.

Змяненне абвінавачання ў судзе дапускаецца, калі гэтым не пагаршаецца становішча падсуднага і не парушаецца яго права на абарону. Калі змяненне абвінавачання выклікае парушэнне права падсуднага на абарону, суд накіроўвае справу для новага папярэдняга следства або дазнання.

Не дапускаецца змяненне абвінавачання ў судзе на больш цяжкае або на такое, якое істотна адрозніваецца па фактычных акалічнасцях ад першапачатковага абвінавачання.

Калі змяненне абвінавачання заключаецца ў выключэнні часткі яго або прыкмет злачынства, якія абцяжваюць адказнасць падсуднага, суд мае права працягваць разбор справы.

**Артыкул 255. Узбуджэнне справы па новаму абвінавачанню**

Калі пры судовым разборы будуць устаноўлены акалічнасці, што ўказваюць на ўчыненне падсудным злачынства, па якому абвінавачанне яму раней прад'яўлена не было, суд, не прыпыняючы разбору, выслухоўвае заключэнне пракурора, што ўдзельнічае ў справе, узбуджае справу па новаму абвінавачанню і накіроўвае неабходныя матэрыялы для правядзення дазнання або папярэдняга следства.

У выпадку, калі новае абвінавачанне звязана з першапачатковым і раздзельны іх разгляд не з'яўляецца магчымым, уся справа павінна быць вернута для правядзення дадатковага расследавання.

**Артыкул 256. Узбуджэнне справы ў адносінах да новай асобы**

Калі пры судовым разборы будуць устаноўлены акалічнасці, якія ўказваюць на ўчыненне злачынства асобай, не прыцягнутай да крымінальнай адказнасці, суд, выслухаўшы заключэнне пракурора, які ўдзельнічае ў справе, узбуджае ў адносінах да гэтай асобы справу і накіроўвае неабходныя матэрыялы для правядзення дазнання або папярэдняга следства.

У выпадках, калі новаўзбуджаная справа знаходзіцца ў сувязі са справай, якая разглядаецца, і паасобны іх разгляд немагчымы, суд накіроўвае ўсю справу для правядзення дадатковага расследавання.

Узбуджэнне справы ў адносінах да сведкі, пацярпеўшага, эксперта або перакладчыка, якія далі заведама ілжывае паказанне, заключэнне або пераклад, можа мецьмесца толькі аднача́сова з пастанаўленнем прыгавору.

Суд мае права ўжыць меру стрымання да асобы, у адносінах да якой узбуджана справа, кіруючыся правіламі артыкулаў 84, 86 і 87 гэтага Кодэкса.

### Артыкул 257. Адкладанне разбору і прыпыненне справы

Пры немагчымасці разбору справы з прычыны няяўкі ў судовае пасяджэнне каго-небудзь з выкліканых асоб або ў сувязі з неабходнасцю выпатрабавання новых доказаў суд адкладвае разбор і прымае меры да выкліку асоб, якія не з'явіліся, або выпатрабавання новых доказаў.

Калі падсудны скрыўся, а таксама ў выпадку псіхічнага або іншага цяжкага захворвання падсуднага, што выключае адмагчымасць яго яўкі ў суд, суд прыпыняе судаводства ў адносінах да гэтага падсуднага да яго адшукання або выздараўлення і працягвае разбор у адносінах да астатніх падсудных. Пошукі знікшага падсуднага аб'яўляюцца вызначэннем суда.

### Артыкул 258. Накіраванне справы для правядзення дадатковага расследавання

Калі ў час судовага разбору будуць устаноўлены акалічнасці, указаныя ў артыкуле 234 гэтага Кодэкса, суд накіроўвае справу для правядзення дадатковага расследавання.

Пры паступленні справы ў суд пасля заканчэння дадатковага расследавання пытанне аб адданні абвінавачваемага пад суд вырашаецца ў агульным парадку.

### Артыкул 259. Спыненне справы ў судовым пасяджэнні

Справа падлягае спыненню ў судовым пасяджэнні, калі ў час судовага разбору будуць высветлены акалічнасці, прадугледжаныя артыкулам 5 гэтага Кодэкса, акрамя выпадкаў, указаных у частцы другой гэтага артыкула.

### Артыкул 260. Вырашэнне пытання аб меры стрымання

У час судовага разбору суд мае права абраць, змяніць або адмяніць меру стрымання ў адносінах да падсуднага.

Артыкул 261. **Парадак вынясення вызначэнняў у судовым пасяджэнні**

Па ўсіх пытаннях, якія вырашаюцца судом у час судовага разбору, суд выносіць вызначэнні.

Вызначэнні аб накіраванні справы для правядзення дадатковага расследавання, аб узбуджэнні справы па новаму абвінавачанню або ў адносінах да новай асобы, аб спыненні справы, аб абранні, змяненні або адмене меры стрымання, аб адводах і аб назначэнні экспертызы выносяцца судом у дарадчым пакоі і выкладаюцца ў выглядзе асобных дакументаў, якія падпісваюцца ўсім складам суда.

Усе іншыя вызначэнні могуць, па ўгледжанню суда, выносіцца альбо ва ўказаным вышэй парадку, альбо пасля нарады суддзяў на месцы з занясеннем вызначэння ў пратакол судовага пасяджэння.

Вызначэнні, вынесеныя судом у час судовага разбору, падлягаюць абвяшчэнню.

Артыкул 262. **Распарадак судовага пасяджэння**

Пры ўваходзе суддзяў усе прысутныя ў зале судовага пасяджэння ўстаюць.

Усе ўдзельнікі працэсу звяртаюцца да суда, даюць свае паказанні і робяць заявы стоячы. Адступленне ад гэтага правіла можа быць дапушчана толькі з дазволу старшынствуючага.

Усе ўдзельнікі працэсу, а таксама ўсе прысутныя ў зале судовага пасяджэння грамадзяне павінны беспярэчна падпарадкоўвацца распараджэнням старшынствуючага аб захаванні парадку ў судовым пасяджэнні.

Асобы, якія не дасягнулі шаснаццацігадовага ўзросту, у залу судовага пасяджэння не дапускаюцца, за выключэннем выпадкаў, калі яны выкліканы судом.

Пракурор і абаронца, якія ўдзельнічаюць у справе, абавязаны прысутнічаць пры абвяшчэнні прыгавору.

Артыкул 263. **Меры, якія прымаюцца ў адносінах да парушальнікаў парадку ў судовым пасяджэнні**

У выпадку парушэння падсудным парадку ў час судовага пасяджэння, а таксама пры непадпарадкаванні распараджэнням старшынствуючага старшынствуючы папярэджвае падсуднага аб тым, што пры паўтарэнні гэтых дзеян-

няў ён будзе выдалены з залы пасяджэння. Пры паўторным парушэнні парадку падсудны, па вызначэнню суда, можа быць выдалены з залы пасяджэння, і разбор справы працягваецца ў яго адсутнасці. Аднак прыгавор абвяшчаецца ў прысутнасці падсуднага або аб'яўляецца яму неадкладна пасля абвяшчэння.

У выпадку непадпарадкавання пракурора, грамадскага абвінаваўцы, абаронцы і грамадскага абаронцы распараджэнням старшынствуючага ён робіць ім папярэджанне. Пры далейшым непадпарадкаванні ўказаных асоб распараджэнням старшынствуючага разгляд справы па вызначэнню суда можа быць адкладзены, калі не з'яўляецца магчымым без шкоды для справы замяніць даную асобу іншай. Адначасова суд паведамляе аб гэтым адпаведна вышэйстаячаму пракурору, прэзідыуму калегіі адвакатаў або грамадскай арганізацыі.

Грамадзянскі ісцец, грамадзянскі адказчык, пацярпеўшы і іх прадстаўнікі, эксперт і перакладчык у выпадку парушэння імі парадку ў судовым пасяджэнні або непадпарадкавання распараджэнням старшынствуючага могуць быць выдалены з залы пасяджэння па вызначэнню суда.

Астатнія асобы, якія прысутнічаюць у зале судовага пасяджэння, у такіх выпадках могуць быць выдалены па распараджэнню старшынствуючага. Акрамя таго, на іх можа быць судом накладзен штраф у размеры да дзесяці рублёў.

Вызначэнне аб накладанні штрафу за парушэнне, дапушчанае ў судовым пасяджэнні, выносіцца судом, які разглядае справу, у тым жа судовым пасяджэнні.

### Артыкул 264. **Пратакол судовага пасяджэння**

Пратакол у судовым пасяджэнні вядзе сакратар, які абавязан поўна і правільна выкладаць у пратаколе дзеянні і рашэнні суда, а таксама дзеянні ўдзельнікаў працэсу, якія мелі месца ў ходзе пасяджэння.

У пратаколе судовага пасяджэння ўказваецца: месца і дата пасяджэння з абазначэннем часу яго пачатку і заканчэння, назва і склад суда, сакратар, перакладчык, пракурор, грамадскі абвінаваўца, абаронца, грамадскі абаронца, падсудны, а таксама пацярпеўшы, грамадзянскі ісцец, грамадзянскі адказчык і іх прадстаўнікі і іншыя выкліканыя судом асобы, разглядаемая справа, даныя аб асобе падсуднага і мера стрымання, час уручэння дакументаў, прадугледжаных артыкулам 239 гэтага Кодэкса, дзеянні суда ў тым

парадку, у якім яны мелі месца, заявы і хадайніцтвы асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, вызначэнні, вынесеныя судом без уходу ў дарадчы пакой, указанне на вынясенне вызначэнняў у дарадчым пакоі, растлумачэнне асобам, якія ўдзельнічаюць у справе, іх правоў і абавязкаў, падрабязны змест паказанняў, пытанні, зададзеныя эксперту, і яго адказы, вынікі праведзеных у судовым пасяджэнні аглядаў і іншых дзеянняў па збіранню доказаў, указанне на факты, якія асобы, што ўдзельнічаюць у справе, прасілі засведчыць у пратаколе, указанне на факты парушэння парадку ў зале судовага пасяджэння, калі яны мелі месца, і на асобу парушальніка, кароткі змест судовых спрэчак і апошняга слова падсуднага, указанне аб абвяшчэнні прыгавору і растлумачэнні парадку і тэрміну яго абскарджання.

Пратакол судовага пасяджэння павінен быць падрыхтаваны і падпісаны не пазней чым праз трое сутак пасля заканчэння судовага пасяджэння, а па складаных справах — не пазней сямі сутак.

Пратакол падпісваецца старшынствуючым і сакратаром судовага пасяджэння.

Старшынствуючы абавязан забяспечыць удзельнікам працэсу магчымасць азнаёміцца з пратаколам.

Артыкул 265. **Заўвагі на пратакол судовага пасяджэння**

На працягу трох сутак пасля падпісання пратакола пракурор, абаронца, падсудны, а таксама пацярпеўшы, грамадзянскі ісцец, грамадзянскі адказчык і іх прадстаўнікі могуць падаць свае заўвагі на пратакол.

Артыкул 266. **Разгляд заўваг на пратакол судовага пасяджэння**

Заўвагі на пратакол судовага пасяджэння разглядаюцца старшынствуючым, які ў выпадку згоды з заўвагамі сведчыць іх правільнасць і далучае да пратакола судовага пасяджэння.

Пры нязгодзе старшынствуючага з заўвагамі яны ўносяцца на разгляд распарадчага пасяджэння суда, прычым старшынствуючы і хоць бы адзін з народных засядацеляў павінны быць з ліку суддзяў, якія ўдзельнічалі ў разборы справы. У неабходных выпадках выклікаюцца асобы, якія падалі заўвагі на пратакол.

У выніку разгляду заўваг суд выносіць матываванае вы-

значэнне аб засведчанні іх правільнасці альбо аб адхіленні іх. Заўвагі на пратакол і вызначэнне суда далучаюцца да пратакола судовага пасяджэння.

Артыкул 267. **Парадак вырашэння судом пытання аб накладанні грашовых спагнанняў**

Грашовыя спагнанні ў выпадках, прадугледжаных артыкуламі 89, 97 і 129 гэтага Кодэкса, накладаюцца судом, да падсуднасці якога адносіцца адпаведная крымінальная справа.

Ва ўказаных выпадках пытанне аб накладанні грашовага спагнання вырашаецца судом у судовым пасяджэнні асобна ад крымінальнай справы з выклікам асобы, на якую можа быць накладзена грашовае спагнанне. Няяўка выкліканай асобы без уважлівых прычын не спыняе разгляду справы.

У судовым пасяджэнні абвяшчаецца пратакол, складзены асобай, што праводзіла дазнанне, следчым або пракурорам, у якім выкладзены акалічнасці дапушчанага парушэння. Пасля гэтага заслухоўваюцца тлумачэнні парушальніка, заключэнне пракурора, калі ён удзельнічае ў справе, і выносіцца вызначэнне.

Суд, які вынес вызначэнне аб накладанні грашовага спагнання на перакладчыка, паручыцеля, асобу, якая парушыла парадак у зале судовага пасяджэння, мае права адтэрмінаваць і растэрмінаваць выкананне на тэрмін да трох месяцаў.

ГЛАВА 25

## ПАДРЫХТОЎЧАЯ ЧАСТКА СУДОВАГА ПАСЯДЖЭННЯ

Артыкул 268. **Адкрыццё судовага пасяджэння**

Старшынствуючы ў назначаны для разгляду крымінальнай справы час адкрывае судовае пасяджэнне і аб'яўляе, якая справа падлягае разгляду суда.

Артыкул 269. **Праверка яўкі ў суд**

Сакратар дакладвае аб яўцы ў суд пракурора, грамадскага абвінаваўцы, падсуднага, абаронцы, грамадскага абаронцы, а таксама пацярпеўшага, грамадзянскага істца, грамадзянскага адказчыка і іх прадстаўнікоў, перакладчыка, сведак і экспертаў і паведамляе аб прычынах няяўкі адсутных.

Артыкул 270. **Растлумачэнне перакладчыку яго абавязкаў**

Старшынствуючы растлумачвае перакладчыку яго абавязак перакладаць суду паказанні і заявы асоб, што ўдзельнічаюць у справе, не валодаючых мовай, на якой вядзецца судаводства, а гэтым асобам — змест паказанняў, заяў, дакументаў, абвяшчаемых на судзе, прамоў і рэплік у судовых спрэчках, а таксама распараджэнні старшынствуючага і рашэнні суда.

Перакладчык папярэджваецца старшынствуючым аб адказнасці па артыкулу 177 Крымінальнага кодэкса Беларускай ССР за заведама няправільны пераклад.

Артыкул 271. **Выдаленне сведак з залы судовага пасяджэння**

Сведкі, якія з'явіліся, да пачатку іх допыту выдаляюцца з залы судовага пасяджэння. Старшынствуючы прымае меры да таго, каб дапытаныя судом сведкі не звязваліся з недапытанымі сведкамі.

Артыкул 272. **Устанаўленне асобы падсуднага і своечасовасці ўручэння яму копіі абвінаваўчага заключэння**

Старшынствуючы ўстанаўлівае асобу падсуднага, высвятляючы яго прозвішча, імя, імя па бацьку, год, месяц, дзень і месца нараджэння, месца пражывання, заняткі, адукацыю, сямейнае становішча і іншыя звесткі аб асобе падсуднага, якія могуць мець значэнне для справы.

Затым старшынствуючы пытаецца ў падсуднага, ці ўручаны яму і калі іменна копіі дакументаў, пералічаных у артыкуле 239 гэтага Кодэкса.

У выпадку неўручэння ўказаных дакументаў у тэрмін, устаноўлены артыкулам 239 гэтага Кодэкса, разбор справы павінен быць адкладзены.

Артыкул 273. **Аб'яўленне складу суда і растлумачэнне права адводу**

Старшынствуючы аб'яўляе склад суда, паведамляе, хто з'яўляецца пракурорам, абаронцам, грамадскім абвінаваўцам, грамадскім абаронцам, а таксама сакратаром судовага пасяджэння, экспертам і перакладчыкам, растлумачвае падсуднаму і іншым удзельнікам судовага разбору іх права за-

явіць адвод суддзям, сакратару судовага пасяджэння, пракурору, эксперту і перакладчыку. Калі ў судовым пасяджэнні прысутнічае запасны народны засядацель, старшынствуючы аб'яўляе аб гэтым.

Запасному народнаму засядацелю можа быць заяўлены адвод.

Заяўленыя адводы дазваляюцца па правілах, устаноўленых артыкуламі 29, 30, 42, 74 і 131 гэтага Кодэкса.

Папярэдні ўдзел у справе ў якасці сакратара судовага пасяджэння не з'яўляецца падставай для адводу.

Артыкул 274. **Растлумачэнне падсуднаму яго правоў**

Старшынствуючы растлумачвае падсуднаму яго правы на судовым разборы, прадугледжаныя артыкулам 48 гэтага Кодэкса.

Артыкул 275. **Растлумачэнне пацярпеўшаму, грамадзянскаму істцу і грамадзянскаму адказчыку іх правоў**

Старшынствуючы растлумачвае пацярпеўшаму, грамадзянскаму істцу, грамадзянскаму адказчыку і іх прадстаўнікам правы на судовым разборы, прадугледжаныя адпаведна артыкуламі 54, 55 і 57 гэтага Кодэкса. Пацярпеўшаму па справах аб злачынствах, прадугледжаных артыкуламі 110, 128, часткай першай і 129 Крымінальнага кодэкса Беларускай ССР, калі па іх не праводзілася папярэдняе следства або дазнанне, растлумачваецца, акрамя таго, яго права на прымірэнне з падсудным.

Артыкул 276. **Растлумачэнне эксперту яго правоў і абавязкаў**

Старшынствуючы растлумачвае эксперту яго правы і абавязкі, прадугледжаныя артыкулам 73 гэтага Кодэкса, і папярэджвае яго аб адказнасці за адмову ад дачы заключэння і за дачу заведама ілжывага заключэння па артыкулах 178 і 177 Крымінальнага кодэкса Беларускай ССР.

Артыкул 277. **Заяўленне і вырашэнне хадайніцтваў**

Старшынствуючы апытвае пракурора, грамадскага абвінаваўцу, падсуднага, абаронцу, грамадскага абаронцу, а таксама пацярпеўшага, грамадзянскага істца, грамадзянскага адказчыка або іх прадстаўнікоў, ці ёсць у іх якія-небудзь ха-

дайніцтвы. Асобы, заявіўшыя хадайніцтвы, абавязаны іх абгрунтаваць.

Суд, выслухаўшы думку астатніх удзельнікаў судовага разбору, павінен абмеркаваць кожнае заяўленае хадайніцтва, задаволіць яго, калі акалічнасці, якія падлягаюць высвятленню, маюць значэнне для справы, або вынесці матываванае вызначэнне аб адмове ў задавальненні заяўленага хадайніцтва.

Адмова суда ў задавальненні хадайніцтва не абмяжоўвае права асобы, якой у гэтым адмоўлена, зноў заявіць яго ў далейшым у залежнасці ад ходу судовага разбору.

Суд мае права, незалежна ад таго, ці заяўлена хадайніцтва, вынесці вызначэнне аб выкліку новых сведак, назначэнні экспертызы, выпатрабаванні дакументаў і іншых доказаў.

Артыкул 278. **Вырашэнне пытання аб магчымасці разгляду крымінальнай справы ў адсутнасці якой-небудзь з асоб, якія ўдзельнічаюць у справе**

Пры няяўцы каго-небудзь з удзельнікаў судовага разбору, а таксама сведкі або эксперта суд выслухоўвае думку падсуднага, яго абаронцы, грамадскага абаронцы, грамадскага абвінаваўцы, а таксама пацярпеўшага, грамадзянскага істца, грамадзянскага адказчыка або іх прадстаўнікоў і заключэнне пракурора аб магчымасці разбору справы і выносіць вызначэнне аб працягу разбору або аб яго адкладанні.

У выпадку неабходнасці адкласці разгляд справы суд абавязан да закрыцця судовага пасяджэння паставіць перад удзельнікамі судовага разбору пытанне, ці не маюць яны хадайніцтваў па справе. Калі такія хадайніцтвы заяўлены, суд абавязан вырашыць іх.

ГЛАВА 26

## СУДОВАЕ СЛЕДСТВА

Артыкул 279. **Пачатак судовага следства**

Судовае следства пачынаецца з абвяшчэння абвінаваўчага заключэння. У выпадках змянення абвінавачання ў распарадчым пасяджэнні суда абвяшчаецца таксама вызначэнне распарадчага пасяджэння.

Калі папярэдняе следства або дазнанне па справе не праводзілася, судовае следства пачынаецца абвяшчэннем пастановы суддзі альбо вызначэння суда аб адданні пад суд, альбо выкладам заявы пацярпеўшага.

Старшынствуючы апытвае кожнага падсуднага, ці зразумела яму абвінавачанне, у неабходных выпадках растлумачвае падсуднаму сутнасць абвінавачання і пытае, ці прызнае ён сябе вінаватым. Па жаданню падсуднага старшынствуючы дае яму магчымасць матываваць адказ.

Артыкул 280. **Устанаўленне парадку даследавання доказаў**

Пасля апытання падсудных аб прызнанні або адмаўленні імі сваёй віны суд выслухоўвае прапанову пракурора, грамадскага абвінаваўцы, падсуднага, абаронцы, грамадскага абаронцы, а таксама пацярпеўшага, грамадзянскага істца, грамадзянскага адказчыка і іх прадстаўнікоў аб паслядоўнасці допыту падсудных, пацярпеўшых, сведак, экспертаў і выносіць вызначэнне аб парадку даследавання доказаў.

Артыкул 281. **Допыт падсуднага**

Допыт падсуднага пачынаецца прапановай старшынствуючага даць паказанні адносна абвінавачання і вядомых яму акалічнасцей справы. Пасля гэтага яго дапытваюць суддзі, пракурор, грамадскі абвінаваўца, а таксама пацярпеўшы, грамадзянскі ісцец, грамадзянскі адказчык або іх прадстаўнікі, абаронца, грамадскі абаронца. Затым падсуднаму могуць быць зададзены пытанні іншымі падсуднымі і іх абаронцамі. Старшынствуючым адхіляюцца пытанні, якія не маюць дачынення да справы.

Суддзі маюць права задаваць пытанні падсуднаму ў любы момант судовага следства.

Допыт падсуднага ў адсутнасці іншага падсуднага дапускаецца толькі па вызначэнню суда ў выключных выпадках, калі гэтага патрабуюць інтарэсы ўстанаўлення ісціны. У гэтым выпадку, пасля вяртання падсуднага ў залу судовага пасяджэння, старшынствуючы паведамляе яму змест паказанняў, дадзеных у яго адсутнасці, і дае яму магчымасць задаць пытанні падсуднаму, дапытанаму ў яго адсутнасці.

Падсудны мае права даваць паказанні ў любы момант судовага следства.

**Артыкул 282. Удзел у судовым пасяджэнні законных прадстаўнікоў непаўналетняга падсуднага.**

У судовае пасяджэнне павінны быць выкліканы бацькі або іншыя законныя прадстаўнікі непаўналетняга падсуднага. Яны маюць права ўдзельнічаць у даследаванні доказаў на судовым следстве, прадстаўляць доказы, заяўляць хадайніцтвы і адводы. Указаныя правы павінны быць ім растлумачаны пры адкрыцці судовага пасяджэння.

Пры неабходнасці дапытаць бацькоў і іншых законных прадстаўнікоў падсуднага ў якасці сведак суд заслухоўвае іх паказанні.

Законныя прадстаўнікі падсуднага прысутнічаюць у зале судовага пасяджэння на працягу ўсяго судовага разбору.

У выключных выпадках, калі ўдзел у судовым пасяджэнні законнага прадстаўніка можа нанесці шкоду інтарэсам непаўналетняга абвінавачваемага, суд мае права сваім матываваным вызначэннем альбо поўнасцю адхіліць законнага прадстаўніка ад удзелу ў судовым пасяджэнні, альбо абмежаваць яго ўдзел у той ці іншай частцы судовага пасяджэння.

Суд, выслухаўшы думку абаронцы і законнага прадстаўніка падсуднага і заключэнне пракурора, мае права сваім вызначэннем выдаліць непаўналетняга з залы судовага пасяджэння на час даследавання акалічнасцей, якія могуць мець адмоўны ўплыў на непаўналетняга.

Няяўка законных прадстаўнікоў падсуднага не прыпыняе разгляду справы, калі суд не палічыць іх удзел неабходным.

**Артыкул 283. Удзел у судовым пасяджэнні прадстаўнікоў навучальна-выхаваўчых устаноў і грамадскіх арганізацый.**

З мэтай узмацнення выхаваўчага ўздзеяння судовага разбору справы аб непаўналетнім аб часе і месцы разгляду справы суд паведамляе школе або іншай навучальна-выхаваўчай установе, у якой вучыўся непаўналетні, а таксама грамадскім арганізацыям па месцы яго вучобы або работы. У выпадку неабходнасці суд мае права выклікаць у судовае пасяджэнне прадстаўнікоў гэтых арганізацый, а таксама прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый па месцы работы бацькоў, апекуна або папячыцеля падсуднага.

Артыкул 284. **Абвяшчэнне паказанняў падсуднага**

Абвяшчэнне на судзе паказанняў падсуднага, дадзеных пры правядзенні дазнання або папярэдняга следства, можа мець месца ў наступных выпадках:

1) пры наяўнасці істотных супярэчнасцей паміж гэтымі паказаннямі і паказаннямі, дадзенымі падсудным на судзе;

2) пры адмове падсуднага ад дачы паказанняў на судзе;

3) калі справа разглядаецца ў адсутнасці падсуднага.

Гэтае правіла пашыраецца таксама на выпадкі абвяшчэння паказанняў падсуднага, дадзеных на судзе.

Артыкул 285. **Папярэджанне сведкі аб адказнасці за адмову або ўхіленне ад дачы паказанняў і за дачу заведама ілжывых паказанняў**

Перад допытам старшынствуючы ўстанаўлівае асобу сведкі, растлумачвае яго грамадзянскі абавязак і абавязак праўдзіва расказаць усё вядомае яму па справе і папярэджвае яго аб адказнасці за адмову або ўхіленне ад дачы паказанняў і за дачу заведама ілжывых паказанняў.

У сведкі адбіраецца падпіска аб тым, што яму растлумачаны яго абавязкі і адказнасць. Падпіска далучаецца да пратакола судовага пасяджэння.

Сведкам, якія не дасягнулі шаснаццацігадовага ўзросту, старшынствуючы растлумачвае значэнне поўных і праўдзівых паказанняў. Аб адказнасці за адмову або ўхіленне ад дачы паказанняў і за дачу заведама ілжывых паказанняў гэтыя сведкі не папярэджваюцца і падпіска ў іх не адбіраецца.

Артыкул 286. **Допыт сведак**.

Сведкі дапытваюцца паасобку і ў адсутнасці яшчэ не дапытаных сведак.

Старшынствуючы высвятляе дачыненне сведкі да падсуднага і пацярпеўшага і прапануе паведаміць сведку ўсё, што яму вядома па справе. Пасля гэтага сведку дапытваюць судзі, пракурор, грамадскі абвінаваўца, а таксама пацярпеўшы, грамадзянскіісцец, грамадзянскі адказчык і іх прадстаўнікі, абаронца, грамадскі абаронца і падсудны. Калі сведка выклікан у судовае пасяджэнне па хадайніцтву аднаго з удзельнікаў судовага разбору, гэты ўдзельнік задае пытанні такому сведку першым. Старшынствуючым адхіляюцца пытанні, якія не маюць дачынення да справы.

Суддзі маюць права задаваць пытанні сведку ў любы момант судовага следства.

Дапытаныя сведкі застаюцца ў зале пасяджэння і не могуць выходзіць да заканчэння судовага следства без дазволу суда.

Суд можа дазволіць дапытаным сведкам пакінуць залу судовага пасяджэння раней заканчэння судовага следства не інакш як пасля заслухання думак пракурора, грамадскага абвінаваўцы, падсуднага, абаронцы, грамадскага абаронцы, а таксама пацярпеўшага, грамадзянскага істца, грамадзянскага адказчыка і іх прадстаўнікоў.

### Артыкул 287. **Выкарыстанне сведкам пісьмовых заметак і дакументаў**

Сведка пры допыце яго на судзе можа карыстацца пісьмовымі заметкамі ў тых выпадках, калі яго паказанні датычаць якіх-небудзь лічбовых і іншых даных, якія цяжка ўтрымаць у памяці. Гэтыя заметкі павінны быць прад'яўлены суду па яго патрабаванню.

Сведку дазваляецца прачытанне наяўных у яго дакументаў, якія датычаць дадзенага ім паказання; гэтыя дакументы прад'яўляюцца суду і па вызначэнню суда могуць быць далучаны да справы.

### Артыкул 288. **Допыт непаўналетняга сведкі**

Пры допыце сведак ва ўзросце да чатырнаццаці год, а па ўгледжанню суда — і пры допыце сведак ва ўзросце ад чатырнаццаці да шаснаццаці год выклікаецца педагог. У выпадку неабходнасці выклікаюцца таксама бацькі або іншыя законныя прадстаўнікі непаўналетняга. Указаныя асобы могуць, з дазволу старшынствуючага, задаваць сведку пытанні.

Допыт непаўналетняга сведкі, калі гэтага патрабуюць інтарэсы ўстанаўлення ісціны, можа быць па вызначэнню суда праведзены ў адсутнасці падсуднага. Пасля вяртання падсуднага ў залу судовага пасяджэння яму павінна быць паведамлена паказанне сведкі і дадзена магчымасць задаваць пытанні гэтаму сведку.

Сведка, які не дасягнуў шаснаццаці год, павінен быць выдален з залы пасяджэння пасля заканчэння яго допыту, акрамя выпадкаў, калі суд прызнае неабходным далейшую прысутнасць гэтага сведкі.

Артыкул 289. **Абвяшчэнне паказанняў сведкі**

Абвяшчэнне на судзе паказанняў, дадзеных сведкай пры правядзенні дазнання або папярэдняга следства, можа мець месца ў наступных выпадках:

1) пры наяўнасці істотных супярэчнасцей паміж гэтымі паказаннямі і паказаннямі сведкі на судзе;

2) пры адсутнасці ў судовым пасяджэнні сведкі па прычынах, якія выключаюць магчымасць яго яўкі ў суд.

Гэтае правіла пашыраецца таксама на выпадкі абвяшчэння паказанняў сведкі, дадзеных на судзе.

Артыкул 290. **Допыт пацярпеўшага**

Пацярпеўшы дапытваецца па правілах, устаноўленых для допыту сведак, але раней за сведак.

Удзел пацярпеўшага ў крымінальнай справе ў якасці грамадзянскага істца або абвінаваўцы не выключае магчымасці яго допыту.

Артыкул 291. **Правядзенне экспертызы на судзе**

Эксперт удзельнічае ў даследаванні акалічнасцей справы, якія датычаць прадмета экспертызы. Ён можа задаваць пытанні падсуднаму, пацярпеўшаму і сведкам аб акалічнасцях, якія маюць значэнне для дачы заключэння.

Пасля высвятлення ўсіх акалічнасцей, якія маюць значэнне для дачы заключэння, старшынствуючы прапануе пракурору, грамадскаму абвінаваўцу, абаронцу, грамадскаму абаронцу, падсуднаму, а таксама пацярпеўшаму, грамадзянскаму істцу, грамадзянскаму адказчыку і іх прадстаўнікам прадставіць у пісьмовым выглядзе пытанні эксперту. Пастаўленыя пытанні павінны быць абвешчаны і па іх заслухана думка ўдзельнікаў судовага разбору і заключэнне пракурора. Суд разглядае гэтыя пытанні, адхіляе тыя з іх, якія не датычаць справы або кампетэнцыі эксперта, а таксама фармулюе новыя пытанні, пасля чаго эксперт пачынае складаць заключэнне.

Заключэнне даецца экспертам у пісьмовым выглядзе, абвяшчаецца ім у судовым пасяджэнні і далучаецца да справы разам з пытаннямі. Эксперт мае права зрабіць у сваім заключэнні вывады па акалічнасцях справы, што датычаць яго кампетэнцыі, аб якіх яму не былі пастаўлены пытанні.

Пры неабходнасці прадставіць эксперту ўзоры для параўнаўчага даследавання прымяняюцца правілы артыкула 185 гэтага Кодэкса.

Артыкул 292. **Допыт эксперта**

Пасля абвяшчэння экспертам заключэння яму могуць быць зададзены пытанні для растлумачэння або дапаўнення дадзенага ім заключэння.

Пытанні эксперту спачатку задаюць суддзі, а затым пракурор, грамадскі абвінаваўца, пацярпеўшы, грамадзянскі істец, грамадзянскі адказчык і іх прадстаўнікі, абаронца, грамадскі абаронца і падсудны.

Артыкул 293. **Правядзенне дадатковай або паўторнай экспертызы**

У выпадках, прадугледжаных артыкулам 77 гэтага Кодэкса, суд можа назначыць дадатковую або паўторную экспертызу.

Дадатковая або паўторная экспертыза праводзіцца па правілах, устаноўленых артыкуламі 291 і 292 гэтага Кодэкса.

Артыкул 294. **Агляд рэчавых доказаў**

Рэчавыя доказы, прадстаўленыя ў суд разам са справай, а таксама прадстаўленыя ў судовае пасяджэнне, павінны быць агледжаны судом і прад'яўлены пракурору, грамадскаму абвінаваўцу, падсуднаму, абаронцу, грамадскаму абаронцу, а таксама пацярпеўшаму, грамадзянскаму істцу, грамадзянскаму адказчыку і іх прадстаўнікам. Агляд рэчавых доказаў можа быць праведзены ў любы момант судовага следства як па ініцыятыве суда, так і па хадайніцтву ўдзельнікаў судовага разбору. У выпадку неабходнасці рэчавыя доказы могуць быць прад'яўлены сведкам і эксперту. Асобы, якім прад'яўлены рэчавыя доказы, могуць звяртаць увагу суда на тыя ці іншыя акалічнасці, звязаныя з аглядам.

Агляд рэчавых доказаў, якія не маглі быць дастаўлены ў суд, праводзіцца, у выпадку неабходнасці, усім складам суда па месцы знаходжання рэчавага доказу, з захаваннем правіл, устаноўленых часткай першай гэтага артыкула.

Артыкул 295. **Абвяшчэнне дакументаў**

Дакументы, далучаныя да справы або прадстаўленыя ў судовым пасяджэнні, калі ў іх выкладзены або засведчаны акалічнасці, маючыя значэнне для справы, падлягаюць абвяшчэнню. Дакументы могуць быць абвешчаны ў любы момант судовага следства поўнасцю або часткова як па ініцыятыве суда, так і па хадайніцтву пракурора, грамадскага абвіна-

ваўцы, падсуднага, абаронцы, грамадскага абаронцы, а таксама пацярпеўшага, грамадзянскага істца, грамадзянскага адказчыка і іх прадстаўнікоў. Дакументы, прадстаўленыя ў судовае пасяджэнне, па вызначэнню суда могуць быць далучаны да справы.

Артыкул 296. **Агляд мясцовасці і памяшкання**

Суд, прызнаўшы неабходным агледзець якое-небудзь памяшканне або мясцовасць, праводзіць агляд усім складам у прысутнасці пракурора, грамадскага абвінаваўцы, падсуднага, абаронцы, грамадскага абаронцы, а таксама пацярпеўшага, грамадзянскага істца, грамадзянскага адказчыка і іх прадстаўнікоў. У выпадку неабходнасці агляд праводзіцца ў прысутнасці сведак і эксперта.

Пасля прыбыцця на месца агляду старшынствуючы аб'яўляе аб працягу судовага пасяджэння, і суд пачынае агляд; пры гэтым падсуднаму, пацярпеўшаму, сведкам і эксперту могуць быць прапанаваны пытанні ў сувязі з аглядам.

Удзельнікі судовага разбору, якія прысутнічаюць пры аглядзе, могуць звяртаць увагу суда на ўсё тое, што, на іх думку, можа садзейнічаць высвятленню акалічнасцей справы.

Артыкул 297. **Заканчэнне судовага следства**

Пасля даследавання ўсіх доказаў старшынствуючы апытвае пракурора, грамадскага абвінаваўцу, падсуднага, абаронцу, грамадскага абаронцу, а таксама пацярпеўшага, грамадзянскага істца, грамадзянскага адказчыка і іх прадстаўнікоў, ці жадаюць яны дапоўніць судовае следства і чым іменна. У выпадку заяўлення хадайніцтваў аб дапаўненні судовага следства суд абмяркоўвае гэтыя хадайніцтвы і вырашае іх.

Пасля вырашэння хадайніцтваў і пасля выканання неабходных следчых дзеянняў старшынствуючы аб'яўляе судовае следства закончаным.

## ГЛАВА 27

## СУДОВЫЯ СПРЭЧКІ І АПОШНЯЕ СЛОВА ПАДСУДНАГА

Артыкул 298. **Судовыя спрэчкі**

Пасля заканчэння судовага следства суд пераходзіць да выслухоўвання судовых спрэчак. Судовыя спрэчкі складаюцца

з прамоў пракурора, грамадскага абвінаваўцы, а таксама грамадзянскага істца, грамадзянскага адказчыка або іх прадстаўнікоў, абаронцы, грамадскага абаронцы і падсуднага, калі абаронца ў судовым пасяджэнні не ўдзельнічае.

Па справах аб злачынствах, прадугледжаных артыкуламі 110, 128, часткай першай і 129 Крымінальнага кодэкса Беларускай ССР, у судовых спрэчках удзельнічаюць пацярпеўшы або яго прадстаўнік, калі ў справу не ўступіў пракурор. У выпадку аб'яднання ў адным судаводстве сустрэчных абвінавачанняў па такіх справах парадак чарговасці выступленняў у судовых спрэчках вызначаецца судом.

Паслядоўнасць выступленняў пракурора і грамадскага абвінаваўцы, а таксама паслядоўнасць выступленняў абаронцы і грамадскага абаронцы ўстанаўліваецца судом па іх прапанове.

Удзельнікі судовых спрэчак не маюць права спасылацца на доказы, якія не былі прадметам даследавання на судовым следстве. У выпадку неабходнасці прад'яўлення новых доказаў яны могуць хадайнічаць аб аднаўленні судовага следства.

Суд не можа абмяжоўваць працягласць судовых спрэчак пэўным часам, але старшынствуючы мае права спыняць асоб, якія ўдзельнічаюць у спрэчках, калі яны закранаюць акалічнасці, якія не маюць дачынення да разглядаемай справы.

Пасля заканчэння прамоў усімі ўдзельнікамі судовых спрэчак яны могуць выступіць яшчэ па аднаму разу з рэплікай адносна сказанага ў прамовах. Права апошняй рэплікі заўсёды належыць абаронцу, а пры яго адсутнасці — падсуднаму.

### Артыкул 299. **Апошняе слова падсуднага**

Пасля заканчэння судовых спрэчак старшынствуючы дае падсуднаму апошняе слова. Пытанні да падсуднага ў часе яго апошняга слова не дапускаюцца.

Суд не можа абмяжоўваць працягласць апошняга слова падсуднага пэўным часам, але старшынствуючы мае права спыняць падсуднага ў тых выпадках, калі ён закранае акалічнасці, якія яўна не маюць дачынення да справы.

Калі падсудны ў апошнім слове паведаміць аб новых акалічнасцях, якія маюць істотнае значэнне для справы, суд абавязан аднавіць судовае следства.

Артыкул 300. **Уход суда на нараду для пастанаўлення прыгавору**

Выслухаўшы апошняе слова падсуднага, суд неадкладна выходзіць на нараду для пастанаўлення прыгавору, аб чым старшынствуючы аб'яўляе прысутным у зале судовага пасяджэння.

ГЛАВА 28

## ПАСТАНАЎЛЕННЕ ПРЫГАВОРУ

Артыкул 301. **Вынясенне прыгавору імем Беларускай ССР або Саюза ССР**

Суд выносіць прыгавор імем Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі.

Ваенныя трыбуналы ў адпаведнасці з артыкулам 43 Асноў крымінальнага судаводства Саюза ССР і саюзных рэспублік выносяць прыгавор імем Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.

Артыкул 302. **Законнасць і абгрунтаванасць прыгавору**

Прыгавор суда павінен быць законным і абгрунтаваным.

Суд абгрунтоўвае прыгавор толькі на тых доказах, якія былі разгледжаны ў судовым пасяджэнні.

Прыгавор суда павінен быць матываваны.

Артыкул 303. **Тайна нарады суддзяў**

Прыгавор пастанаўляецца судом у дарадчым пакоі. У час нарады суддзяў у дарадчым пакоі могуць знаходзіцца толькі суддзі, якія ўваходзяць у склад суда па данай справе. Прысутнасць іншых асоб не дапускаецца.

З надыходам начнога часу суд мае права спыніць нараду для адпачынку. Суддзі не маюць права разгалашаць меркаванні, якія мелі месца ў час нарады.

Артыкул 304. **Пытанні, якія вырашаюцца судом пры пастанаўленні прыгавору**

Пры пастанаўленні прыгавору суд у дарадчым пакоі вырашае наступныя пытанні:

1) ці мела месца дзеянне, ва ўчыненні якога абвінавачваецца падсудны;

2) ці ёсць у гэтым дзеянні склад злачынства і якім іменна крымінальным законам яно прадугледжана;

3) ці ўчыніў гэтае дзеянне падсудны;

4) ці вінаваты падсудны ва ўчыненні гэтага злачынства;

5) ці падлягае падсудны пакаранню за ўчыненае ім злачынства;

6) якое іменна пакаранне павінна быць назначана падсуднаму і ці падлягае яно адбыццю падсудным;

7) ці падлягае задавальненню грамадзянскі іск, у карысць каго і ў якім размеры, а таксама ці падлягаюць кампенсацыі матэрыяльныя страты, калі грамадзянскі іск не быў прад'яўлен;

8) што рабіць з рэчавымі доказамі;

9) на каго і ў якім размеры павінны быць ускладзены судовыя выдаткі;

10) аб меры стрымання ў адносінах да падсуднага.

Калі падсудны абвінавачваецца ва ўчыненні некалькіх злачынстваў, суд вырашае пытанні, указаныя ў пунктах 1—6 гэтага артыкула, па кожнаму злачынству паасобку.

Калі ва ўчыненні злачынства абвінавачваюцца некалькі падсудных, суд вырашае гэтыя пытанні ў адносінах да кожнага падсуднага паасобку.

### Артыкул 305. Абмеркаванне пытання аб наглядзе за ўмоўна асуджаным і правядзенні з ім выхаваўчай работы

Пры ўжыванні ўмоўнага асуджэння суд у парадку, устаноўленым законам, вырашае, на каго ўскласці нагляд за ўмоўна асуджаным і правядзенне з ім выхаваўчай работы.

Калі аб умоўным асуджэнні ёсць хадайніцтва грамадскай арганізацыі або калектыву рабочых, служачых, калгаснікаў па месцы работы вінаватага, суд можа перадаць умоўна асуджанага гэтай арганізацыі або калектыву для перавыхавання і выпраўлення.

### Артыкул 306. Абмеркаванне пытання аб прысутнасці поўнай памяці ў падсуднага

У тых выпадках, калі ў час дазнання, папярэдняга следства або судовага разбору ўзнікала пытанне аб прысутнасці поўнай памяці ў падсуднага, суд абавязан пры пастанаўленні прыгавору яшчэ раз абмеркаваць гэтае пытанне. Прызнаўшы, што падсудны ў час учынення грамадска небяспечнага дзеяння знаходзіўся ў стане поўнай адсутнасці памяці або пасля ўчы-

нення злачынства захварэў на псіхічную хваробу, якая пазбаўляе яго магчымасці ўсведамляць свае дзеянні або кіраваць імі, суд выносіць вызначэнне ў парадку главы дваццаць дзевятай гэтага Кодэкса.

Артыкул 307. **Ужыванне судом да непаўналетняга прымусовых мер выхаваўчага характару**

Калі ў выніку судовага разбору па справе суд зробіць вывад, што выпраўленне асобы, учыніўшай ва ўзросце да васемнаццаці год злачынства, якое не прадстаўляе вялікай грамадскай небяспекі, магчыма без ужывання крымінальнага пакарання, ён пастанаўляе абвінаваўчы прыгавор з ужываннем да непаўналетняга адной з прымусовых мер выхаваўчага характару, прадугледжаных артыкулам 60 Крымінальнага кодэкса Беларускай ССР.

Артыкул 308. **Парадак нарады суддзяў**

Пастанаўленню прыгавору папярэднічае нарада суддзяў. Старшынствуючы ставіць на вырашэнне суда пытанні ў парадку, указаным у артыкуле 304 гэтага Кодэкса. Кожнае пытанне павінна быць пастаўлена ў такой форме, каб на яго мог быць дадзены альбо сцвярджальны, альбо адмоўны адказ.

Усе пытанні вырашаюцца простай большасцю галасоў. Ніхто з суддзяў не мае права ўстрымацца ад галасавання. Старшынствуючы падае свой голас апошнім.

Артыкул 309. **Асобая думка суддзі**

Старшынствуючы або народны засядацель, які застаўся пры асобай думцы, мае права выкласці яе ў дарадчым пакоі ў пісьмовым выглядзе. Асобая думка пры абвяшчэнні прыгавору не аб'яўляецца, але далучаецца да справы.

Калі на прыгавор суда, па якому адзін з суддзяў застаўся пры асобай думцы, не паступіць касацыйнай скаргі або пратэсту, суд, які вырашаў справу, пасля ўваходжання прыгавору ў законную сілу, накіроўвае справу старшыні вышэйстаячага суда для вырашэння пытання аб прынясенні пратэсту ў парадку нагляду.

Артыкул 310. **Аднаўленне судовага следства або накіраванне справы для правядзення дадатковага расследавання**

Калі ў час абмеркавання ў дарадчым пакоі пытанняў, указаных у артыкулах 304—306 гэтага Кодэкса, суд прызнае не-

абходным высветліць якія-небудзь акалічнасці, што маюць значэнне для справы, ён аднаўляе судовае следства, аб чым выносіць вызначэнне. Пасля заканчэння судовага следства суд зноў адкрывае судовыя спрэчкі і выслухоўвае апошняе слова падсуднага.

Калі ў час нарады суд зробіць вывад аб неабходнасці накіравання справы для правядзення дадатковага расследавання, ён выносіць аб гэтым матываванае вызначэнне.

### Артыкул 311. **Віды прыгавораў**

Прыгавор суда можа быць абвінаваўчым або апраўдальным.

Абвінаваўчы прыгавор не можа быць заснаваны на меркаваннях і пастанаўляецца толькі пры ўмове, калі ў ходзе судовага разбору вінаватасць падсуднага ва ўчыненні злачынства даказана. Суд пастанаўляе абвінаваўчы прыгавор без назначэння пакарання, калі да моманту разгляду справы ў судзе дзеянне страціла грамадскую небяспеку або асоба, якая яго ўчыніла, перастала быць грамадска небяспечнай.

Апраўдальны прыгавор пастанаўляецца ў выпадках, калі:

1) не ўстаноўлена падзея злачынства;

2) у дзеянні падсуднага няма складу злачынства;

3) не даказан удзел падсуднага ва ўчыненні злачынства.

### Артыкул 312. **Вырашэнне грамадзянскага іску пры пастанаўленні прыгавору**

Пры пастанаўленні абвінаваўчага прыгавору суд у залежнасці ад даказанасці падстаў і размераў грамадзянскага іску задавальняе прад'яўлены іск поўнасцю або часткова або адмаўляе ў ім.

У выключных выпадках, пры немагчымасці зрабіць падрабязны разлік па грамадзянскаму іску без адкладання разбору справы, суд можа прызнаць за грамадзянскім істцом права на задавальненне іску і перадаць пытанне аб яго размерах на разгляд у парадку грамадзянскага судаводства.

Пры пастанаўленні апраўдальнага прыгавору суд:

1) адмаўляе ў задавальненні грамадзянскага іску, калі не ўстаноўлена падзея злачынства або не даказан удзел падсуднага ва ўчыненні злачынства;

2) пакідае іск без разгляду ў выпадку апраўдання падсуднага з-за адсутнасці складу злачынства.

Артыкул 313. **Забеспячэнне грамадзянскага іску**

У выпадку задавальнення грамадзянскага іску суд мае права да ўваходжання прыгавору ў законную сілу пастанавіць аб прыняцці мер забеспячэння гэтага іску, калі яны раней не былі прыняты.

Калі грамадзянскі іск не быў прад'яўлены і страты, нанесеныя злачынствам, не былі кампенсаваны, суд мае права пры вынясенні абвінаваўчага прыгавору пастанавіць аб прыняцці мер забеспячэння іску, аб чым паведамляе зацікаўленым асобам альбо арганізацыям.

У выпадку, калі на працягу шасці месяцаў з дня ўваходжання прыгавору ў законную сілу пацярпеўшым не будзе заяўлены іск у парадку грамадзянскага судаводства, то прынятыя судом меры па забеспячэнню грамадзянскага іску трацяць сілу.

Артыкул 314. **Складанне прыгавору**

Пасля вырашэння пытанняў, указаных у артыкулах 304—306 гэтага Кодэкса, суд пераходзіць да складання прыгавору. Ён павінен быць складзены ў ясных, зразумелых выразах і складацца з уводнай, апісальнай і рэзалютыўнай частак.

Прыгавор выкладаецца на той мове, на якой адбываўся судовы разбор.

Прыгавор павінен быць напісаны адным з суддзяў, што ўдзельнічаюць у яго пастанаўленні, і падпісваецца ўсімі суддзямі. Суддзя, які застаўся пры асобай думцы, таксама падпісвае прыгавор.

Выпраўленні ў прыгаворы павінны быць агавораны і агаворкі падпісаны ўсімі суддзямі ў дарадчым пакоі да абвяшчэння прыгавору.

Артыкул 315. **Уводная частка прыгавору**

Ва ўводнай частцы прыгавору ўказваецца:

1) прыгавор вынесен імем Беларускай ССР, а ў выпадках, прадугледжаных часткай другой артыкула 301 гэтага Кодэкса,— імем Саюза ССР;

2) час і месца пастанаўлення прыгавору;

3) назва суда, які пастанавіў прыгавор, склад суда, сакратар судовага пасяджэння, пракурор, грамадскі абвінаваўца, абаронца, грамадскі абаронца;

4) імя, імя па бацьку, прозвішча падсуднага, год, месяц, дзень і месца яго нараджэння, месца пражывання, месца работы, заняткі, адукацыя, сямейнае становішча і іншыя звесткі аб асобе падсуднага, якія маюць значэнне для справы;

5) крымінальны закон, які прадугледжвае злачынства, ва ўчыненні якога абвінавачваецца падсудны.

### Артыкул 316. Апісальная частка прыгавору

Апісальная частка абвінаваўчага прыгавору павінна змяшчаць апісанне злачыннага дзеяння, прызнанага доказаным, з указаннем месца, часу, спосабу яго ўчынення, характару віны, матываў і вынікаў злачынства; доказы, на якіх заснаваны вывады суда, і матывы, па якіх суд адхіліў іншыя доказы; указанні на акалічнасці, што змякчаюць або абцяжваюць адказнасць; у выпадку прызнання часткі абвінавачання неабгрунтаванай — падставы да гэтага. Суд абавязан таксама прывесці матывы змянення абвінавачання, калі яно было праведзена ў судзе, а ў неабходных выпадках — матывы адносна абранай меры пакарання. Акрамя таго, павінна быць матывавана вызваленне падсуднага ад пакарання, ужыванне ўмоўнага асуджэння, а таксама назначэнне пакарання ніжэй ніжэйшай мяжы, прадугледжанай крымінальным законам за данае злачынства, або пераход да іншага больш мяккага пакарання. Калі па справе ёсць больш чым адзін падсудны, пералічаныя ўказанні павінны быць зроблены адносна кожнага з падсудных у паасобку.

У апісальнай частцы апраўдальнага прыгавору выкладаецца сутнасць абвінавачання, па якому абвінавачваемы быў аддадзены пад суд; акалічнасці справы, устаноўленыя судом; прыводзяцца доказы, якія з'явіліся падставай для апраўдання падсуднага, з указаннем матываў, што растлумачваюць, чаму суд адхіляе доказы, на якіх было заснавана абвінавачванне. Не дапускаецца ўключэнне ў апраўдальны прыгавор фармулёвак, якія ставяць пад сумненне невінаватасць апраўданага.

У апісальнай частцы абвінаваўчага і апраўдальнага прыгавору павінны быць матывы, якія абгрунтоўваюць рашэнне суда адносна грамадзянскага іску або кампенсацыі матэрыяльных страт, нанесеных злачынствам.

### Артыкул 317. Рэзалютыўная частка абвінаваўчага прыгавору

У рэзалютыўнай частцы абвінаваўчага прыгавору павінны быць указаны:

1) прозвішча, імя і імя па бацьку падсуднага;

2) рашэнне аб прызнанні падсуднага вінаватым;

3) крымінальны закон, па якому падсудны прызнан вінаватым;

4) від і размер пакарання, назначанага падсуднаму за кожнае злачынства, якое прызнана даказаным; канчатковая мера пакарання, якая падлягае адбыццю ў адпаведнасці з артыкуламі 39 і 40 Крымінальнага кодэкса Беларускай ССР;

5) працягласць выпрабавальнага тэрміну і на каго ўскладаецца абавязак назірання за асуджаным у выпадку ўжывання ўмоўнага асуджэння;

6) рашэнне аб заліку папярэдняга заключэння, калі падсудны да пастанаўлення прыгавору ўтрымліваўся пад вартай у парадку меры стрымання або затрымання;

7) рашэнне аб меры стрымання ў адносінах да падсуднага да ўваходжання прыгавору ў законную сілу.

Калі падсуднаму прад'яўлена абвінавачанне па некалькіх артыкулах крымінальнага закону, то ў рэзалютыўнай частцы прыгавору павінна быць дакладна ўказана, па якіх з іх падсудны апраўдан і па якіх асуджан.

У выпадку вызвалення падсуднага ад адбыцця пакарання або вынясення абвінаваўчага прыгавору без назначэння пакарання аб гэтым указваецца ў рэзалютыўнай частцы.

Пакаранне ва ўсіх выпадках павінна быць абазначана такім чынам, каб не ўзнікла пры выкананні прыгавору ніякіх сумненняў адносна віду і размеру пакарання, назначанага судом.

У выпадках, прадугледжаных артыкулам 35 Крымінальнага кодэкса Беларускай ССР, у рэзалютыўнай частцы прыгавору выкладаецца рашэнне суда ўвайсці пасля ўваходжання прыгавору ў законную сілу ў адпаведныя дзяржаўныя органы з прадстаўленнем аб пазбаўленні падсуднага ордэна, медаля альбо ганаровага, воінскага або іншага звання.

### Артыкул 318. **Рэзалютыўная частка апраўдальнага прыгавору**

У рэзалютыўнай частцы апраўдальнага прыгавору павінны быць:

1) прозвішча, імя і імя па бацьку падсуднага;

2) рашэнне аб апраўданні падсуднага;

3) указанне аб адмене меры стрымання, калі яна была абрана;

4) указанне аб адмене мер забеспячэння канфіскацыі маёмасці, калі такія меры былі прыняты.

Артыкул 319. **Іншыя пытанні, якія падлягаюць вырашэнню ў рэзалютыўнай частцы прыгавору**

У рэзалютыўнай частцы як абвінаваўчага, так і апраўдальнага прыгавору, акрамя пытанняў, пералічаных адпаведна ў артыкулах 317, 318 гэтага Кодэкса, павінны быць:

1) рашэнне па прад'яўленаму грамадзянскаму іску або рашэнне аб кампенсацыі страт;

2) вырашэнне пытання аб адабранні ў асуджанага грошай і іншых каштоўнасцей, нажытых злачынным шляхам;

3) вырашэнне пытання аб рэчавых доказах;

4) указанне аб размеркаванні судовых выдаткаў;

5) указанне парадку і тэрміну касацыйнага абскарджання і апратэставання прыгавору.

Артыкул 320. **Прыняцце судом мер апекі дзяцей і да аховы маёмасці асуджанага**

Калі ў асобы, асуджанай да пазбаўлення волі, застаюцца без нагляду непаўналетнія дзеці або без прыгляду маёмасць і жыллё, суд адначасова з пастанаўленнем прыгавору выносіць вызначэнне аб перадачы дзяцей пад апеку сваякоў альбо іншых асоб або ўстаноў і аб прыняцці мер да аховы маёмасці.

Артыкул 321. **Прыватнае вызначэнне суда**

Адначасова з пастанаўленнем прыгавору суд пры наяўнасці да таго падстаў прыватным вызначэннем звяртае ўвагу кіраўнікоў устаноў, прадпрыемстваў, арганізацый і іншых асоб на прычыны і ўмовы, якія садзейнічалі ўчыненню злачынства і патрабуюць прыняцця адпаведных мер.

Копія прыватнага вызначэння накіроўваецца адпаведнай установе, прадпрыемству, арганізацыі, службовай асобе, якія ў месячны тэрмін абавязаны паведаміць суду аб прынятых імі мерах.

Суд мае права прыватным вызначэннем звярнуць увагу адпаведных службовых асоб на парушэнні, дапушчаныя пры правядзенні дазнання або папярэдняга следства.

Суд па матэрыялах судовага разбору мае права прыватным вызначэннем звярнуць увагу грамадскіх арганізацый і

калектываў працоўных на няправільныя паводзіны асобных грамадзян на вытворчасці ці ў быце або на парушэнне імі грамадскага абавязку. У неабходных выпадках копія прыватнага вызначэння можа быць накіравана ў таварыскі суд.

Прыватнае вызначэнне падпісваецца ўсімі суддзямі і можа быць, паводле меркавання суда, абвешчана ў судовым пасяджэнні.

### Артыкул 322. Абвяшчэнне прыгавору

Пасля падпісання прыгавору суд вяртаецца ў залу судовага пасяджэння і старшынствуючы або народны засядацель абвяшчае прыгавор.

Усе прысутныя ў зале судовага пасяджэння, не выключаючы складу суда, выслухоўваюць прыгавор стоячы.

Калі прыгавор напісан на мове, якой падсудны не валодае, то ўслед за абвяшчэннем прыгавору ён павінен быць прачытаны перакладчыкам у перакладзе на родную мову падсуднага або іншую мову, якой ён валодае.

Пасля абвяшчэння прыгавору старшынствуючы растлумачвае асуджанаму або апраўданаму парадак і тэрмін яго абскарджання.

### Артыкул 323. Вызваленне падсуднага з-пад варты

Пры апраўданні падсуднага або вызваленні яго ад пакарання ці ад адбывання пакарання або ў выпадку асуджэння яго да пакарання, не звязанага з пазбаўленнем волі, суд, у выпадку знаходжання падсуднага пад вартай, вызваляе яго неадкладна ў зале судовага пасяджэння.

### Артыкул 324. Уручэнне копіі прыгавору асуджанаму або апраўданаму

Не пазней трох сутак пасля абвяшчэння прыгавору копія яго павінна быць уручана асуджанаму або апраўданаму.

### Артыкул 325. Аплата працы адваката, які выступаў па назначэнню

У тым выпадку, калі адвакат удзельнічаў у справе па назначэнню, суд адначасова з пастанаўленнем прыгавору выносіць вызначэнне аб размеры ўзнагароджання, якое павінна быць выплачана юрыдычнай кансультацыі падсудным.

## ГЛАВА 29

## СУДАВОДСТВА ПА УЖЫВАННЮ ПРЫМУСОВЫХ МЕР МЕДЫЦЫНСКАГА ХАРАКТАРУ

Артыкул 326. **Падставы для ўжывання прымусовых мер медыцынскага характару**

Прымусовыя меры медыцынскага характару, прадугледжаныя артыкулам 55 Крымінальнага кодэкса Беларускай ССР, ужываюцца судом да асоб, якія ўчынілі грамадска небяспечныя дзеянні, прадугледжаныя крымінальным законам, у стане поўнай адсутнасці памяці або захварэлі пасля ўчынення злачынства на псіхічную хваробу, якая пазбаўляе іх магчымасці ўсведамляць свае дзеянні або кіраваць імі, калі гэтыя асобы па характару ўчыненага імі дзеяння і свайму хваравітаму стану з'яўляюцца небяспечнымі для грамадства.

Парадак судаводства па ўжыванню прымусовых мер медыцынскага характару вызначаецца агульнымі правіламі гэтага Кодэкса і, апрача таго, наступнымі артыкуламі.

Артыкул 327. **Падрыхтоўчыя дзеянні да судовага пасяджэння**

Народны суддзя або старшыня суда, атрымаўшы ад пракурора справу, назначае яе да разгляду ў судовым пасяджэнні, паведамляе аб гэтым пракурору, абаронцу і законным прадстаўнікам асобы, якая ўчыніла грамадска небяспечнае дзеянне, і выклікае пацярпеўшых, сведак, а ў неабходных выпадках і экспертаў.

Народны суддзя або старшыня суда мае права зрабіць распараджэнне аб выкліку ў судовае пасяджэнне асобы, аб якой разглядаецца справа, калі гэтаму не перашкаджае характар яе захворвання.

У выпадках, калі народны суддзя або старшыня суда ўбачыць падставы да спынення судаводства па ўжыванню прымусовых мер медыцынскага характару або падставы да вяртання справы для правядзення дадатковага расследавання, ён уносіць справу на разгляд распарадчага пасяджэння суда.

Артыкул 328. **Разгляд справы аб асобе, у якой поўнасцю адсутнічае памяць**

Разгляд справы, якая паступіла ў суд у парадку артыкула 222 гэтага Кодэкса, адбываецца ў судовым пасяджэнні па правілах глаў дваццаць чацвёртай — дваццаць шостай гэ-

тага Кодэкса з абавязковым удзелам пракурора і абаронцы.

У судовым пасяджэнні павінны быць правераны доказы, якія ўстанаўліваюць або абвяргаюць учыненне данай асобай грамадска небяспечнага дзеяння, прадугледжанага крымінальным законам, заслухана заключэнне экспертаў аб псіхічным стане абвінавачваемага і правераны іншыя акалічнасці, якія маюць істотнае значэнне для вырашэння пытання аб ужыванні прымусовых мер медыцынскага характару.

Пасля заканчэння судовага следства суд выслухоўвае пракурора і абаронцу.

Артыкул 329. **Вырашэнне справы судом**

Суд вырашае справу сваім вызначэннем, якое выносіцца ў дарадчым пакоі.

Пры вынясенні вызначэння суд павінен вырашыць наступныя пытанні:

1) ці мела месца грамадска небяспечнае дзеянне, прадугледжанае крымінальным законам;

2) ці зрабіла гэтае дзеянне асоба, аб якой разглядаецца справа;

3) ці зрабіла даная асоба грамадска небяспечнае дзеянне ў стане поўнай адсутнасці памяці;

4) ці захварэла даная асоба пасля ўчынення злачынства на псіхічную хваробу, якая пазбаўляе яе магчымасці ўсведамляць свае дзеянні або кіраваць імі, і ці не з'яўляецца гэтае захворванне часовым расстройствам псіхічнай дзейнасці, якое патрабуе толькі прыпынення судаводства па справе;

5) ці павінна быць ужыта прымусовая мера медыцынскага характару і якая іменна.

Артыкул 330. **Вызначэнне суда**

Прызнаўшы, што асоба ўчыніла грамадска небяспечнае дзеянне, прадугледжанае крымінальным законам, у стане поўнай адсутнасці памяці або што гэтая асоба пасля ўчынення злачынства захварэла на хранічную псіхічную хваробу, якая пазбаўляе яе магчымасці ўсведамляць свае дзеянні або кіраваць імі, суд выносіць вызначэнне ў адпаведнасці з артыкуламі 11 і 55—57 Крымінальнага кодэкса Беларускай ССР аб вызваленні гэтай асобы адпаведна ад крымінальнай адказнасці або пакарання і аб ужыванні да яе прымусовай меры медыцынскага характару з указаннем, якой іменна, або аб спыненні справы і аб неўжыванні такіх мер у выпадках, калі асоба па характару ўчыненага ёю дзеяння і свайму хвараві-

таму стану не з'яўляецца небяспечнай для грамадства і не мае патрэбы ў прымусовым лячэнні. У гэтых выпадках суд паведамляе аб хворым органам аховы здароўя.

Прызнаўшы, што поўная адсутнасць памяці ў асобы, аб якой разглядаецца справа, не ўстаноўлена або што захворванне асобы, якая ўчыніла злачынства, не выключае ўжывання да яе мер пакарання, суд сваім вызначэннем вяртае справу для правядзення дадатковага расследавання і далейшага накіравання справы ў агульным парадку.

У выпадку, калі суд прызнае, што ўдзел гэтай асобы ва ўчыненні грамадска небяспечнага дзеяння не даказан, таксама як і пры ўстанаўленні акалічнасцей, прадугледжаных артыкулам 5 гэтага Кодэкса, суд выносіць вызначэнне аб спыненні справы па ўстаноўленай ім падставе незалежна ад наяўнасці і характару захворвання асобы, паведамляючы аб гэтым органам аховы здароўя.

У вызначэнні суда вырашаюцца пытанні, указаныя ў артыкуле 319 гэтага Кодэкса.

### Артыкул 331. **Абскарджанне і апратэставанне вызначэння суда**

Вызначэнне суда можа быць на працягу сямі сутак абскарджана абаронцам, пацярпеўшым і яго прадстаўніком, блізкім сваяком асобы, аб якой разглядалася справа, і апратэставана пракурорам у вышэйстаячы суд.

### Артыкул 332. **Адмена або змяненне прымусовай меры медыцынскага характару**

Калі ў выніку выздараўлення асобы, прызнанай страціўшай памяць, або змянення стану яе здароўя адпадае неабходнасць у далейшым ужыванні раней прынятай прымусовай меры медыцынскага характару, суд па прадстаўленню адміністрацыі медыцынскай установы, у якой утрымліваецца гэтая асоба, заснаванаму на заключэнні камісіі ўрачоў, разглядае ў парадку, устаноўленым часткамі першай і шостай артыкула 377 гэтага Кодэкса, пытанне аб адмене або змяненні прымусовай меры медыцынскага характару.

Тыя ж правілы ўжываюцца і ў адносінах да асобы, захварэўшай пасля ўчынення злачынства на хранічную псіхічную хваробу, калі гэтая асоба ў выніку наступіўшага змянення ў стане здароўя не мае патрэбы ў далейшым ужыванні прымусовых мер медыцынскага характару, хоць і застаецца псіхічнахворай.

Хадайніцтва аб адмене або змяненні прымусовых мер медыцынскага характару могуць узбуджаць блізкія сваякі асобы, прызнанай страціўшай памяць, і іншыя зацікаўленыя асобы. Суд у гэтых выпадках пасылае запытанне ў адпаведныя органы аховы здароўя аб стане здароўя асобы, аб якой узбуджана хадайніцтва.

Указаныя ў гэтым артыкуле пытанні вырашаюцца судом, які вынес вызначэнне аб ужыванні прымусовай меры медыцынскага характару, або судом па месцы ўжывання такой меры з абавязковым удзелам пракурора.

Артыкул 333. **Аднаўленне справы ў адносінах да асобы, да якой ужыта прымусовая мера медыцынскага характару**

Калі асоба, да якой з прычыны яе захворвання на псіхічную хваробу, што наступіла пасля ўчынення злачынства, была ўжыта прымусовая мера медыцынскага характару, будзе прызнана ўрачэбнай камісіяй выздаравеўшай, то суд на падставе заключэння медыцынскай установы выносіць па правілах артыкула 377 гэтага Кодэкса вызначэнне аб адмене прынятай прымусовай меры медыцынскага характару і вырашае пытанне аб накіраванні справы для правядзення дазнання або папярэдняга следства, прыцягнення гэтай асобы ў якасці абвінавачваемай і перадачы справы ў суд у агульным парадку.

Час, праведзены ў медыцынскай установе, уключаецца ў тэрмін утрымання пад вартай.

## РАЗДЗЕЛ ПЯТЫ

## СУДАВОДСТВА Ў КАСАЦЫЙНАЙ ІНСТАНЦЫІ

### ГЛАВА 30

### АБСКАРДЖАННЕ І АПРАТЭСТАВАННЕ СУДОВЫХ ПРЫГАВОРАЎ, ВЫЗНАЧЭННЯЎ І ПАСТАНОЎ, ЯКІЯ НЕ ЎВАЙШЛІ Ў ЗАКОННУЮ СІЛУ

Артыкул 334. **Права касацыйнага абскарджання і апратэставання прыгавору**

Падсудны, яго абаронца і законны прадстаўнік, а таксама пацярпеўшы і яго прадстаўнік маюць права абскардзіць у касацыйным парадку прыгавор суда.

Пракурор абавязан апратэставаць у касацыйным парадку кожны незаконны або неабгрунтаваны прыгавор.

Грамадзянскі істец, грамадзянскі адказчык і іх прадстаўнікі маюць права абскардзіць прыгавор у частцы, якая адносіцца да грамадзянскага іску.

Асоба, апраўданая па суду, мае права абскардзіць у касацыйным парадку апраўдальны прыгавор у частцы матываў і падстаў апраўдання.

Прыгаворы Вярхоўнага Суда Беларускай ССР абскарджанню і апратэставанню ў касацыйным парадку не падлягаюць.

Артыкул 335. **Парадак касацыйнага абскарджання і апратэставання прыгавору**

Прыгаворы, якія не ўвайшлі ў законную сілу, могуць быць абскарджаны і апратэставаны ў касацыйным парадку:

1) прыгаворы раённых (гарадскіх) народных судоў — у абласны суд;

2) прыгаворы абласных судоў — у Вярхоўны Суд Беларускай ССР;

3) прыгаворы ваенных трыбуналаў — у парадку, устаноўленым артыкуламі 20 і 21 Палажэння аб ваенных трыбуналах.

Касацыйныя скаргі і пратэсты падаюцца праз суд, які вынес прыгавор, аднак падача скаргі або пратэсту непасрэдна ў касацыйную інстанцыю не з'яўляецца перашкодай для разгляду скаргі або пратэсту.

Прыгавор, вынесены пры паўторным разглядзе справы, можа быць абскарджаны або апратэставаны ў агульным парадку.

Артыкул 336. **Паведамленне аб пададзеных пратэстах і скаргах**

Аб падачы пратэсту або скаргі суд першай інстанцыі паведамляе асуджанаму, апраўданаму і іншым удзельнікам працэсу, інтарэсаў якіх датычыць скарга або пратэст.

Асуджаны, апраўданы і іншыя ўдзельнікі працэсу маюць права знаёміцца з паступіўшымі ў суд пратэстамі і скаргамі і падаць на іх свае пярэчанні.

Асуджанаму або апраўданаму па іх аб тым просьбе ўручаецца копія пратэсту або скаргі пацярпеўшага.

Пярэчанні, паступіўшыя на скаргу або пратэст, далучаюцца да справы або накіроўваюцца ў дадатак да яго на працягу сутак.

### Артыкул 337. Тэрміны касацыйнага абскарджання і апратэставання прыгавору

Касацыйныя скаргі і пратэсты на прыгавор суда першай інстанцыі могуць быць пададзены на працягу сямі сутак з дня абвяшчэння прыгавору, а асуджаным, якія ўтрымліваюцца пад вартай,— у той жа тэрмін з дня ўручэння яму копіі прыгавору.

На працягу тэрміну, устаноўленага для абскарджання прыгавору, справа не можа быць выпатрабавана з суда. Пракурор, а таксама асуджаны, апраўданы, іх абаронцы і законныя прадстаўнікі, пацярпеўшы, грамадзянскі ісцец, грамадзянскі адказчык і іх прадстаўнікі маюць права азнаёміцца ў судзе з судаводствам па справе і з паступіўшымі скаргамі або пратэстам.

Касацыйная скарга або пратэст, пададзеныя з пропускам тэрміну, вяртаюцца асобе, якая падала скаргу або пратэст.

Дадатковыя касацыйныя скаргі і пратэсты і пісьмовыя пярэчанні на іх могуць быць пададзены ў касацыйную інстанцыю да пачатку разгляду справы.

### Артыкул 338. Аднаўленне тэрміну на касацыйнае абскарджанне або апратэставанне

У выпадку пропуску тэрміну на абскарджанне або апратэставанне прыгавору па ўважлівых прычынах асобы, якія маюць права на падачу касацыйнай скаргі або пратэсту, могуць хадайнічаць перад судом, які пастанавіў прыгавор, аб аднаўленні прапушчанага тэрміну. Пытанне аб аднаўленні тэрміну вырашаецца ў распарадчым пасяджэнні суда, які мае права выклікаць асобу, што ўзбудзіла хадайніцтва, для дачы тлумачэнняў.

Вызначэнне суда аб адмове ў аднаўленні прапушчанага тэрміну можа быць абскарджана або апратэставана ў агульным парадку ў вышэйстаячы суд, які мае права аднавіць прапушчаны тэрмін і разгледзець справу па скарзе або пратэсту па сутнасці.

### Артыкул 339. Вынікі падачы касацыйнай скаргі або пратэсту

Падача касацыйнай скаргі або пратэсту на прыгавор прыпыняе прывядзенне прыгавору ў выкананне.

Пасля сканчэння тэрміну, устаноўленага для абскар-

джання або апратэставання, суд, які пастанавіў прыгавор, накіроўвае справу з паступіўшымі скаргамі і пратэстам у касацыйную інстанцыю і паведамляе зацікаўленым асобам аб дні разгляду справы ў касацыйнай інстанцыі.

### Артыкул 340. Абскарджанне і апратэставанне вызначэння суда першай інстанцыі і пастановы суддзі

На вызначэнне суда першай інстанцыі і пастанову суддзі па крымінальнай справе можа быць пададзена прыватная скарга або прыватны пратэст асобамі, указанымі ў артыкуле 334 гэтага Кодэкса, за наступнымі выключэннямі:

1) вызначэнні суда аб накладанні грашовага спагнання або штрафу ў выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам, аб узбуджэнні крымінальнай справы ў парадку артыкулаў 255, часткі першай і 256 гэтага Кодэкса могуць быць абскарджаны асобамі, адносна да якіх яны вынесены, або апратэставаны пракурорам. Пастанова суддзі аб адмове ва ўзбуджэнні справы можа быць абскарджана пацярпеўшым або апратэставана пракурорам;

2) вызначэнні суда і пастановы суддзі, вынесеныя ў выпадках, прадугледжаных артыкуламі 229, 232, 234, 255, часткай другой, 258, 310, часткай другой, 321 гэтага Кодэкса, абскарджанню не падлягаюць, але могуць быць апратэставаны пракурорам;

3) вызначэнні суда і пастановы суддзі, вынесеныя ў выпадках, прадугледжаных артыкуламі 38, 39, 225, 233, 246, 249, 257, 260, 263 (апрача вызначэнняў аб накладанні штрафу), 266, 277, 278, 280, 281, 282, часткай пятай, 288, 291, 310, часткай першай, 369—373, 375, 378 і 379 гэтага Кодэкса, абскарджанню і апратэставанню не падлягаюць.

У выпадках абскарджання або апратэставання вызначэння, вынесенага ў час судовага разбору справы, якая закончылася пастанаўленнем прыгавору, справа накіроўваецца ў касацыйную інстанцыю толькі пасля заканчэння тэрміну, устаноўленага для абскарджання прыгавору.

Правілы, устаноўленыя главамі трыццатай і трыццаць першай гэтага Кодэкса адносна тэрмінаў, парадку падачы і разгляду касацыйных скаргаў і пратэстаў, пашыраюцца на тэрміны, парадак падачы і разгляд прыватных скарг і прыватных пратэстаў.

## ГЛАВА 31

## РАЗГЛЯД СПРАЎ ПА КАСАЦЫЙНАЙ СКАРЗЕ І ПРАТЭСТУ

Артыкул 341. **Праверка законнасці і абгрунтаванасці прыгавору**

Пры разглядзе справы ў касацыйным парадку суд правярае законнасць і абгрунтаванасць прыгавору па наяўных у справе і дадаткова прадстаўленых матэрыялах. Суд не звязан довадамі касацыйнай скаргі або пратэсту і правярае справу ў поўным аб'ёме адносна ўсіх асуджаных, у тым ліку і тых, якія скаргаў не падалі і адносна якіх не пададзен касацыйны пратэст.

У выпадку выяўлення парушэнняў закону, якія выклікаюць адмену або змяненне прыгавору, суд кіруецца правіламі артыкулаў 347—350 гэтага Кодэкса.

Артыкул 342. **Тэрміны разгляду справы ў касацыйнай інстанцыі**

Абласны суд і ваенны трыбунал павінны разгледзець справу, якая паступіла па касацыйнай скарзе або пратэсту, у дзень, назначаны судом першай інстанцыі, але не пазней дзесяці сутак, а Вярхоўны Суд Беларускай ССР — не пазней дваццаці сутак пасля паступлення справы. Не пазней чым за трое сутак да разгляду справы ў памяшканні суда касацыйнай інстанцыі павінна быць вывешана аб'ява аб часе яе разгляду.

Артыкул 343. **Адкрыты разгляд спраў у касацыйнай інстанцыі**

Касацыйная інстанцыя разглядае справы ў адкрытым судовым пасяджэнні, за выключэннем выпадкаў, указаных у артыкуле 13 гэтага Кодэкса.

Артыкул 344. **Асобы, якія ўдзельнічаюць у разглядзе справы ў касацыйным парадку**

Пры разглядзе справы ў касацыйным парадку пракурор дае заключэнне аб законнасці і абгрунтаванасці прыгавору. У пасяджэнні суда, які разглядае справу ў касацыйным парадку, могуць удзельнічаць абаронца, а таксама грамадзянскі ісцец, грамадзянскі адказчык, пацярпеўшы і іх прадстаўнікі.

Пытанне аб удзеле асуджанага ў пасяджэнні суда, які разглядае справу ў касацыйным парадку, вырашаецца гэтым судом. Асуджаны або апраўданы, які з'явіўся ў судовае пася-

джэнне, ва ўсіх выпадках дапускаецца да дачы тлумачэнняў.

Няяўка асоб, якім своечасова паведамлена аб дні разгляду справы, не перашкаджае яе разгляду.

Артыкул 345. **Прадстаўленне новых матэрыялаў у касацыйную інстанцыю**

У пацвярджэнне або абвяржэнне довадаў, прыведзеных у скарзе або пратэсце, асобы, указаныя ў артыкуле 334 гэтага Кодэкса, маюць права прадставіць у касацыйную інстанцыю дадатковыя матэрыялы як да, так і ў час разгляду справы, але да дачы заключэння пракурорам.

Артыкул 346. **Парадак разгляду справы ў касацыйнай інстанцыі**

Старшынствуючы адкрывае судовае пасяджэнне і аб'яўляе, якая справа павінна быць разгледжана. Затым старшынствуючы ўпэўніваецца, хто з'явіўся па справе, пасля чаго суд вырашае пытанне аб магчымасці разгляду справы. Пасля гэтага старшынствуючы аб'яўляе склад суда, прозвішчы пракурора і перакладчыка і апытвае асоб, што з'явіліся па справе, ці ёсць у іх заявы аб адводзе.

Старшынствуючы пытаецца ў асоб, што з'явіліся па справе, аб наяўных у іх хадайніцтвах. Па заяўленых хадайніцтвах суд выносіць вызначэнне.

Разгляд справы пачынаецца дакладам аднаго з членаў суда, які выкладае сутнасць справы і довады скаргі або пратэсту. Калі справа разглядаецца па пратэсту, то пасля даклада члена суда пракурор абгрунтоўвае пратэст. У выпадку прадстаўлення дадатковых матэрыялаў старшынствуючы або член суда знаёміць з імі пракурора і асоб, указаных у артыкуле 344 гэтага Кодэкса, калі яны ўдзельнічаюць у пасяджэнні.

Затым асуджаны або апраўданы, іх абаронцы і законныя прадстаўнікі, пацярпеўшы, грамадзянскі ісцец і грамадзянскі адказчык або іх прадстаўнікі, калі яны ўдзельнічаюць у пасяджэнні, даюць тлумачэнні. Пасля дачы тлумачэнняў суд выслухоўвае заключэнне пракурора і ідзе ў дарадчы пакой для вынясення вызначэння.

Распарадак судовага пасяджэння і меры, што прымаюцца ў адносінах да парушальнікаў, вызначаюцца правіламі артыкулаў 262 і 263 гэтага Кодэкса.

Да пачатку судовага пасяджэння асоба, якая абскардзіла або апратэставала прыгавор, мае права адклікаць сваю скаргу

або пратэст. Вышэйстаячы пракурор мае права адклікаць пратэст, прынесены ніжэйстаячым пракурорам.

Артыкул 347. **Вынясенне вызначэння**

У выніку разгляду справы ў касацыйным парадку суд прымае адно з наступных рашэнняў:

1) пакідае прыгавор без змянення, а скаргі або пратэст — без задавальнення;

2) адмяняе прыгавор і накіроўвае справу на новае расследаванне або новы судовы разгляд;

3) адмяняе прыгавор і спыняе справу;

4) змяняе прыгавор.

Пры вынясенні вызначэння суд кіруецца патрабаваннямі артыкулаў 308, 309 і 314 гэтага Кодэкса. Вынесенае вызначэнне неадкладна абвяшчаецца ў зале судовага пасяджэння старшынствуючым або членам суда.

Артыкул 348. **Недапушчальнасць узмацнення пакарання асуджанаму або прымянення да яго закону аб больш цяжкім злачынстве**

Суд пры разглядзе справы ў касацыйным парадку можа змякчыць назначанае судом першай інстанцыі пакаранне або прымяніць закон аб менш цяжкім злачынстве, але не мае права ўзмацніць пакаранне, а таксама прымяніць закон аб больш цяжкім злачынстве.

Прыгавор можа быць адменены ў сувязі з неабходнасцю прымянення закону аб больш цяжкім злачынстве або за мяккасцю пакарання толькі ў выпадках, калі па гэтых падставах пададзен пратэст пракурорам або пададзена скарга пацярпеўшым ці яго прадстаўніком.

Артыкул 349. **Адмена апраўдальнага прыгавору**

Апраўдальны прыгавор можа быць адменены ў касацыйным парадку не інакш як па пратэсту пракурора, або па скарзе пацярпеўшага ці яго прадстаўніка, або па скарзе асобы, апраўданай па суду.

Артыкул 350. **Падставы да адмены або змянення прыгавору**

Падставамі да адмены або змянення прыгавору пры разглядзе справы ў касацыйным парадку з'яўляюцца:

1) аднабаковасць або непаўната дазнання, папярэдняга або судовага следства;

2) неадпаведнасць вывадаў суда, выкладзеных у прыгаворы, фактычным акалічнасцям справы;

3) істотнае парушэнне крымінальна-працэсуальнага закону;

4) няправільнае прымяненне крымінальнага закону;

5) неадпаведнасць назначанага судом пакарання цяжкасці злачынства і асобе асуджанага.

Артыкул 351. **Аднабаковасць або непаўната дазнання папярэдняга або судовага следства**

Аднабаковым або няпоўна праведзеным прызнаецца дазнанне, папярэдняе або судовае следства, якія пакінулі нявысветленымі такія акалічнасці, устанаўленне якіх магло мець істотнае значэнне пры пастанаўленні прыгавору.

Дазнанне, папярэдняе або судовае следства ва ўсякім выпадку прызнаецца аднабаковым або няпоўным, калі па справе:

1) не былі дапытаны асобы, чые паказанні маюць істотнае значэнне для справы, або не была праведзена экспертыза, калі яе правядзенне па закону з'яўляецца абавязковым, а таксама не былі выпатрабаваны дакументы або рэчавыя доказы, якія маюць істотнае значэнне;

2) не былі даследаваны акалічнасці, указаныя ў вызначэнні суда, які перадаў справу для правядзення дадатковага расследавання або на новы судовы разгляд;

3) не ўстаноўлены з дастатковай паўнатой даныя аб асобе абвінавачваемага.

Артыкул 352. **Неадпаведнасць вывадаў суда, выкладзеных у прыгаворы, фактычным акалічнасцям справы**

Прыгавор прызнаецца неадпаведным фактычным акалічнасцям справы, калі:

1) вывады суда не пацвярджаюцца доказамі, разгледжанымі ў судовым пасяджэнні;

2) суд не ўлічыў акалічнасцей, якія маглі зрабіць істотны ўплыў на вывады суда;

3) пры наяўнасці супярэчлівых доказаў, якія маюць істотнае значэнне для вывадаў суда, у прыгаворы не ўказана, па якіх падставах суд прыняў адзін з гэтых доказаў і адхіліў іншыя;

4) вывады суда, выкладзеныя ў прыгаворы, маюць істотныя супярэчнасці, якія зрабілі або маглі зрабіць уплыў на вы-

рашэнне пытання аб вінаватасці або невінаватасці асуджанага ці апраўданага, на правільнасць прымянення крымінальнага закону ці на вызначэнне меры пакарання.

**Артыкул 353. Істотнае парушэнне крымінальна-працэсуальнага закону**

Істотнымі парушэннямі крымінальна-працэсуальнага закону прызнаюцца такія парушэнні, якія шляхам пазбаўлення або абмежавання гарантаваных законам правоў удзельнікаў працэсу пры разглядзе справы або іншым шляхам перашкодзілі суду ўсебакова разабраць справу і зрабілі або маглі зрабіць уплыў на пастанаўленне законнага і абгрунтаванага прыгавору.

Прыгавор падлягае адмене ва ўсякім выпадку, калі:

1) судом пры наяўнасці падстаў, прадугледжаных артыкулам 259 гэтага Кодэкса, крымінальная справа не была спынена;

2) прыгавор вынесен незаконным складам суда;

3) справа разгледжана ў адсутнасць падсуднага ў тых выпадках, калі па закону яго прысутнасць абавязковая;

4) справа разгледжана без удзелу абаронцы ў тых выпадках, калі па закону яго ўдзел абавязковы;

5) парушана тайна нарады суддзяў пры пастанаўленні прыгавору;

6) прыгавор не падпісан кім-небудзь з суддзяў;

7) у справе няма пратакола судовага пасяджэння.

**Артыкул 354. Няправільнае прымяненне крымінальнага закону**

Няправільным прымяненнем крымінальнага закону з'яўляецца:

1) непрымяненне судом закону, які павінен быў быць прыменены;

2) прымяненне закону, які не павінен быў быць прыменены;

3) няправільнае вытлумачэнне закону, якое супярэчыць яго дакладнаму сэнсу.

**Артыкул 355. Неадпаведнасць назначанага судом пакарання цяжкасці злачынства і асобе асуджанага**

Неадпаведным цяжкасці злачынства і асобе асуджанага прызнаецца пакаранне, калі яно хоць і не выходзіць за межы,

прадугледжаныя адпаведным крымінальным законам, але па свайму размеру з'яўляецца яўна несправядлівым як з-за мяккасці, так і з-за суровасці.

**Артыкул 356. Вынікі адмены прыгавору з накіраваннем справы на новы разгляд**

Адмяняючы прыгавор з накіраваннем справы на новы разгляд, суд указвае ў вызначэнні, ці павінна быць судаводства па справе пачата з дадатковага дазнання ці папярэдняга следства, аддання пад суд ці судовага разбору.

У выпадку адмены прыгавору з прычыны неабходнасці прад'яўлення больш цяжкага абвінавачання або абвінавачання, якое істотна адрозніваецца па фактычных акалічнасцях ад першапачаткова прад'яўленага, справа накіроўваецца адпаведнаму пракурору для дадатковага расследавання.

У выпадку адмены прыгавору з прычыны парушэнняў, дапушчаных пры разглядзе справы ў судзе, справа накіроўваецца для новага разгляду ў суд, які пастанавіў прыгавор, але ў іншым складзе, або ў іншы суд.

**Артыкул 357. Адмена абвінаваўчага прыгавору са спыненнем справы**

Суд пры разглядзе справы ў касацыйным парадку адмяняе абвінаваўчы прыгавор і спыняе справу ў наступных выпадках:

1) пры наяўнасці падстаў, указаных у артыкуле 5 гэтага Кодэкса і артыкулах 13, частцы першай і 14 Крымінальнага кодэкса Беларускай ССР;

2) калі доказамі, разгледжанымі судом першай інстанцыі, прад'яўленае падсуднаму абвінавачанне не пацверджана і няма падстаў для правядзення дадатковага расследавання і новага судовага разгляду.

**Артыкул 358. Змяненне прыгавору**

У выпадку, калі пры разглядзе справы ў касацыйным парадку будзе ўстаноўлена, што судом першай інстанцыі няправільна прыменены крымінальны закон або назначана пакаранне, якое не адпавядае цяжкасці злачынства і асобе асуджанага, касацыйная інстанцыя можа, не перадаючы справу на новы разгляд, унесці неабходныя змяненні ў прыгавор з захаваннем патрабаванняў артыкула 348 гэтага Кодэкса, з тым, аднак, каб пакаранне па змененаму прыгавору не перавышала пер-

шапачаткова назначанага пакарання, а таксама не быў прыменены закон аб больш цяжкім злачынстве.

Касацыйная інстанцыя не мае права ўносіць у прыгавор змяненні, заснаваныя на не ўстаноўленых прыгаворам суда першай інстанцыі акалічнасцях або адхіленых ім доказах.

### Артыкул 359. **Змест касацыйнага вызначэння**

У касацыйным вызначэнні павінна быць указана:

1) час і месца вынясення вызначэння;

2) назва і склад суда, які вынес вызначэнне, пракурор і іншыя асобы, што ўдзельнічалі пры разглядзе справы ў касацыйнай інстанцыі;

3) асоба, падаўшая касацыйную скаргу або пратэст;

4) кароткі змест прыгавору, скаргі або пратэсту, заключэння пракурора, тлумачэнняў асоб, якія ўдзельнічалі ў справе;

5) рашэнне суда другой інстанцыі па скарзе або пратэсту.

Пры пакіданні без задавальнення скаргі або пратэсту ў вызначэнні павінны быць указаны падставы, па якіх довады скаргі або пратэсту прызнаны няправільнымі або неістотнымі.

Пры адмене або змяненні прыгавору ў вызначэнні павінна быць указана, патрабаванні якіх артыкулаў закону парушаны і ў чым заключаюцца парушэнні або ў чым заключаецца неабгрунтаванасць прыгавору.

Пры перадачы справы для правядзення дадатковага расследавання або новага судовага разгляду павінны быць указаны тыя акалічнасці, якія неабходна высветліць.

### Артыкул 360. **Абавязковасць указанняў касацыйнай інстанцыі**

Указанні суда, што разглядае справу ў касацыйным парадку, абавязковыя пры дадатковым расследаванні і пры паўторным разглядзе справы судом.

Суд, які разглядае справу ў касацыйным парадку, не мае права ўстанаўліваць або лічыць даказанымі факты, якія не былі ўстаноўлены ў прыгаворы або адхілены ім, а таксама не мае права прадрашаць пытанні аб даказанасці або недаказанасці абвінавачання, аб дакладнасці або недакладнасці таго ці іншага доказу і аб перавагах адных доказаў перад другімі, аб прымяненні судом першай інстанцыі таго ці іншага крымінальнага закону і аб меры пакарання.

Артыкул 361. **Разгляд справы судом першай інстанцыі пасля адмены першапачатковага прыгавору**

Пасля адмены першапачатковага прыгавору справа павінна быць разгледжана ў агульным парадку.

Узмацненне пакарання або прымяненне закону аб больш цяжкім злачынстве пры новым разглядзе справы судом першай інстанцыі дапускаецца толькі пры ўмове, калі першапачатковы прыгавор быў адменены з-за мяккасці пакарання або ў сувязі з неабходнасцю прымянення закону аб больш цяжкім злачынстве па касацыйнаму пратэсту пракурора або па скарзе пацярпеўшага ці яго прадстаўніка, а таксама калі пры новым расследаванні справы пасля адмены прыгавору будуць устаноўлены акалічнасці, якія сведчаць аб учыненні абвінавачваемым больш цяжкага злачынства.

Артыкул 362. **Зварот да выканання вызначэння касацыйнай інстанцыі**

Вызначэнне касацыйнай інстанцыі з'яўляецца канчатковым і можа быць апратэставана толькі ў парадку судовага нагляду.

Вызначэнне аб пакіданні прыгавору без змянення або аб змяненні прыгавору не пазней пяці сутак пасля яго вынясення накіроўваецца разам са справай, касацыйнай скаргай або пратэстам на прыгавор і дадаткова прадстаўленымі матэрыяламі для выканання суду, які пастанавіў прыгавор.

Вызначэнне аб адмене прыгавору і накіраванні справы на новы разгляд са стадыі папярэдняга следства разам са справай накіроўваецца не пазней трох сутак пракурору, а ў выпадках накіравання справы для разгляду са стадыі аддання пад суд або судовага следства — суду, якому перададзена справа на новы разгляд. Копія вызначэння ў гэтых выпадках накіроўваецца суду, які пастанавіў прыгавор.

Калі на падставе вызначэння касацыйнай інстанцыі асуджаны павінен быць вызвалены з-пад варты, копія гэтага вызначэння накіроўваецца касацыйнай інстанцыяй у сутачны тэрмін непасрэдна адміністрацыі месца зняволення для выканання.

Артыкул 363. **Прыватнае вызначэнне касацыйнай інстанцыі**

Суд, які разглядае справу ў касацыйным парадку, мае права прыватным вызначэннем звярнуць увагу адпаведных служ-

бовых асоб на парушэнні, дапушчаныя пры правядзенні дазнання, папярэдняга следства або пры разглядзе справы судом, а таксама вынесці іншыя прыватныя вызначэнні, прадугледжаныя артыкулам 321 гэтага Кодэкса.

# РАЗДЗЕЛ ШОСТЫ

# ВЫКАНАННЕ ПРЫГАВОРУ

## ГЛАВА 32

## ВЫКАНАННЕ ПРЫГАВОРУ

### Артыкул 364. Уваходжанне прыгавору ў законную сілу і прывядзенне яго ў выкананне

Прыгавор уваходзіць у законную сілу пасля сканчэння тэрміну на касацыйнае абскарджанне і апратэставанне, калі ён не быў абскарджаны або апратэставаны. У выпадку падачы касацыйнай скаргі або касацыйнага пратэсту прыгавор, калі ён не адменен, уваходзіць у законную сілу пасля разгляду справы вышэйстаячым судом.

Прыгавор, які не падлягае касацыйнаму абскарджанню, уваходзіць у сілу з моманту яго абвяшчэння.

Абвінаваўчы прыгавор прыводзіцца ў выкананне пасля ўваходжання яго ў законную сілу.

Апраўдальны прыгавор і прыгавор, які вызваляе падсуднага ад пакарання, прыводзіцца ў выкананне неадкладна пасля абвяшчэння прыгавору.

Нагляд за законнасцю выканання прыгавораў ажыццяўляецца пракурорам.

### Артыкул 365. Уваходжанне вызначэння суда і пастановы суддзі ў законную сілу і прывядзенне іх у выкананне

Вызначэнне суда і пастанова суддзі ўваходзяць у законную сілу і прыводзяцца ў выкананне пасля сканчэння тэрміну на абскарджанне і апратэставанне або, у выпадку падачы прыватнай скаргі ці пратэсту, — пасля разгляду справы вышэйстаячым судом.

Вызначэнне суда і пастанова суддзі, якая не падлягае абскарджанню і апратэставанню, уваходзіць у сілу і прыводзіцца ў выкананне неадкладна пасля яе вынясення.

Пратэст пракурора на вызначэнне суда аб датэрміновым і ўмоўна-датэрміновым вызваленні, замене пакарання больш мяккім і вызваленні ад адбывання пакарання па хваробе прыпыняе выкананне вызначэння.

Артыкул 366. **Абавязковасць прыгавору, вызначэння і пастановы суда**

У адпаведнасці з артыкулам 54 Асноў крымінальнага судаводства Саюза ССР і саюзных рэспублік увайшоўшыя ў законную сілу прыгавор, вызначэнне і пастанова суда абавязковыя для ўсіх дзяржаўных і грамадскіх устаноў, прадпрыемстваў і арганізацый, службовых асоб і грамадзян і падлягаюць выкананню на ўсёй тэрыторыі СССР.

Артыкул 367. **Парадак накіравання да выканання прыгавору, вызначэння і пастановы суда**

Накіраванне да выканання прыгавору, вызначэння і пастановы суда ўскладаецца на суд, які пастанавіў прыгавор. Распараджэнне аб выкананні прыгавору пасылаецца суддзёй або старшынёй суда разам з копіяй прыгавору таму органу, на які ўскладзен абавязак прывядзення прыгавору ў выкананне. У выпадку змянення прыгавору пры разглядзе справы ў касацыйным ці наглядным парадку да копіі прыгавору прыкладаюцца копіі вызначэння або пастановы касацыйнай ці нагляднай інстанцыі.

Органы, што прыводзяць прыгавор у выкананне, неадкладна паведамляюць суду, які пастанавіў прыгавор, аб прывядзенні яго ў выкананне. Адміністрацыя месца пазбаўлення волі павінна паведамляць суду, які вынес прыгавор, аб месцы адбывання пакарання асуджаным, а таксама аб яго вызваленні.

Суд, які вынес прыгавор, абавязан сачыць за тым, каб прыгавор, вызначэнні і пастановы былі прыведзены ў выкананне.

У выпадках, прадугледжаных артыкулам 305 гэтага Кодэкса, суд, які перадаў умоўна асуджанага на выпраўленне і перавыхаванне грамадскай арганізацыі або калектыву пра-

цоўных, абавязан накіраваць ім копію прыгавору і ажыццяўляць кантроль за выкананнем прыгавору.

З мэтай павышэння выхаваўчага ўздзеяння прыгавору копія прыгавору пасля ўваходжання яго ў законную сілу накіроўваецца ў неабходных выпадках судом, які вынес прыгавор, па месцы работы, вучобы або пражывання асуджанага.

Прыгавор, якім аб'яўлена грамадскае ганьбаванне, пасля ўваходжання ў законную сілу ў неабходных выпадках даводзіцца да ведама грамадскасці праз друк або іншым спосабам.

### Артыкул 368. **Прадастаўленне сваякам спаткання з асуджаным і паведамленне ім аб накіраванні прыгавору да выканання**

Да накіравання прыгавору да выканання народны суддзя або старшыня суда абавязан прадаставіць блізкім сваякам асуджанага, які ўтрымліваецца пад вартай, па іх просьбе магчымасць спаткання з ім.

Пасля ўваходжання ў законную сілу прыгавору, якім асуджаны, што знаходзіцца пад вартай, прыгаворан да пазбаўлення волі або ссылкі, адміністрацыя месца зняволення абавязана паведаміць сям'і асуджанага аб тым, куды ён накіроўваецца для адбыцця пакарання.

### Артыкул 369. **Адтэрміноўка выканання прыгавору**

Выкананне прыгавору аб асуджэнні асобы да пазбаўлення волі, ссылкі, высылкі або папраўчых работ без пазбаўлення волі можа быць адтэрмінавана пры наяўнасці адной з наступных падстаў:

1) цяжкай хваробы асуджанага, якая перашкаджае адбыванню пакарання, — да яго выздараўлення;

2) цяжарнасці асуджанай — на тэрмін не больш аднаго года пасля родаў;

3) калі неадкладнае адбыванне пакарання можа выклікаць асабліва цяжкія вынікі для асуджанага або яго сям'і з прычыны пажару ці іншых стыхійных бедстваў, цяжкай хваробы ці смерці адзінага працаздольнага члена сям'і або іншых выключных акалічнасцей — на тэрмін, устаноўлены судом, але не больш трох месяцаў.

Уплата штрафу можа быць адтэрмінавана або растэрмінавана на тэрмін да шасці месяцаў, калі неадкладная ўплата штрафу з'яўляецца немагчымай для асуджанага.

Артыкул 370. **Вызваленне ад адбывання пакарання па хваробе**

У выпадку, калі асоба, асуджаная да пазбаўлення волі, у час адбывання пакарання захварэла хранічнай псіхічнай або іншай цяжкай хваробай, якая перашкаджае адбыванню пакарання, суд па прадстаўленню адміністрацыі папраўча-працоўнай установы на падставе заключэння ўрачэбнай камісіі мае права вынесці вызначэнне аб яе вызваленні ад далейшага адбывання пакарання.

Пры вызваленні ад далейшага адбывання пакарання асуджанага, захварэўшага хранічнай псіхічнай хваробай, суд мае права ўжыць прымусовыя меры медыцынскага характару або перадаць яго на апекаванне органаў аховы здароўя.

Пры вырашэнні пытання аб вызваленні ад далейшага адбывання пакарання асоб, захварэўшых цяжкай хваробай, апрача асоб, захварэўшых псіхічнай хваробай, суд улічвае цяжкасць зробленага злачынства, асобу асуджанага і іншыя акалічнасці.

Артыкул 371. **Датэрміновае і ўмоўна-датэрміновае вызваленне ад пакарання і замена пакарання больш мяккім**

Датэрміновае і ўмоўна-датэрміновае вызваленне асуджанага, а таксама замена неадбытай часткі пакарання больш мяккім пакараннем у выпадках, прадугледжаных артыкуламі 51 і 52 Крымінальнага кодэкса Беларускай ССР, праводзіцца судом па прадстаўленню Наглядальнай камісіі пры выканаўчым камітэце раённага, гарадскога Савета дэпутатаў працоўных па месцу адбывання пакарання, або па прадстаўленню адміністрацыі папраўча-працоўнай установы, узгодненаму з Наглядальнай камісіяй, або органа, на які ўскладзена выкананне прыгавору аб ссылцы і высылцы, а ў адносінах да непаўналетніх і па хадайніцтву Камісіі па справах непаўналетніх.

Вызваленне ад пакарання ў выглядзе пазбаўлення права займаць пэўныя пасады або займацца пэўнай дзейнасцю праводзіцца судом па хадайніцтву грамадскай арганізацыі, калектыву працоўных або асуджанага.

У выпадку адмовы суда ў датэрміновым або ўмоўна-датэрміновым вызваленні ад пакарання або замены неадбытай часткі пакарання больш мяккім пакараннем паўторны разгляд прадстаўленняў па гэтых пытаннях можа мець месца не раней

чым пасля сканчэння шасці месяцаў з дня вынясення вызначэння аб адмове.

**Артыкул 372. Замена турэмнага зняволення адбываннем пакарання ў калоніі і адбывання пакарання ў калоніі турэмным зняволеннем**

Замена турэмнага зняволення адбываннем пакарання ў папраўча-працоўнай калоніі, а таксама замена адбывання пакарання ў калоніі турэмным зняволеннем у выпадках, указаных у артыкуле 23 Крымінальнага кодэкса Беларускай ССР, праводзіцца судом па прадстаўленню Наглядальнай камісіі пры выканаўчым камітэце раённага, гарадскога Савета дэпутатаў працоўных або па прадстаўленню адміністрацыі папраўча-працоўнай установы, узгодненаму з Наглядальнай камісіяй.

У выпадку адмовы суда ў замене турэмнага зняволення пазбаўленнем волі ў папраўча-працоўнай калоніі паўторны разгляд прадстаўлення па гэтаму пытанню можа мець месца не раней чым пасля сканчэння шасці месяцаў з дня вынясення вызначэння аб адмове.

**Артыкул 373. Замена папраўчых работ і штрафу іншымі мерамі пакарання**

Замена папраўчых работ штрафам або грамадскім ганьбаваннем у адносінах да асоб, прызнаных непрацаздольнымі, а таксама замена папраўчых работ па месцы работы папраўчымі работамі, адбываемымі ў іншых месцах, у раёне пражывання асуджанага або замена папраўчых работ пазбаўленнем волі, у адпаведнасці з артыкулам 28 Крымінальнага кодэкса Беларускай ССР, праводзіцца судом па прадстаўленню органа, які ведае папраўчымі работамі.

Замена штрафу папраўчымі работамі праводзіцца судом у адпаведнасці з артыкулам 30 Крымінальнага кодэкса Беларускай ССР.

**Артыкул 374. Залік часу знаходжання ў лячэбнай установе ў тэрмін адбывання пакарання**

Калі асоба, адбываючая пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі, была змешчана ў лячэбную ўстанову, то час знаходжання ў ёй асуджанага залічваецца ў тэрмін адбывання пакарання.

Артыкул 375. **Выкананне прыгавору пры наяўнасці іншых нявыкананых прыгавораў**

У выпадку, калі ў адносінах да асуджанага ёсць некалькі не прыведзеных у выкананне прыгавораў, аб чым не было вядома суду, які пастанавіў апошні па часе прыгавор, гэты суд або аднайменны суд па месцы выканання прыгавору абавязан вынесці вызначэнне аб прымяненні да асуджанага пакарання па ўсіх указаных прыгаворах, кіруючыся артыкуламі 39 і 40 Крымінальнага кодэкса Беларускай ССР.

Артыкул 376. **Суды, якія вырашаюць пытанні, звязаныя з прывядзеннем прыгавору ў выкананне**

Пытанні аб адтэрміноўцы выканання прыгавору, аб непрывядзенні ў выкананне прыгавору, у адпаведнасці з артыкулам 47 Крымінальнага кодэкса Беларускай ССР, аб замене штрафу і папраўчых работ без пазбаўлення волі іншымі мерамі пакарання ў выпадках, прадугледжаных артыкулам 373 гэтага Кодэкса, аб скарачэнні выпрабавальнага тэрміну пры ўмоўным асуджэнні, у адпаведнасці з артыкулам 43 Крымінальнага кодэкса Беларускай ССР, аб змяненні або спыненні ўжывання да псіхічнахворых прымусовых мер медыцынскага характару, у адпаведнасці з артыкулам 57 Крымінальнага кодэкса Беларускай ССР, аб прадоўжанні або спыненні прымусовага лячэння ў адносінах да алкаголікаў і наркаманаў, у адпаведнасці з артыкулам 59 Крымінальнага кодэкса Беларускай ССР, а таксама ўсякія сумненні і няяснасці, узнікаючыя пры прывядзенні прыгавору ў выкананне, вырашаюцца судом, які пастанавіў прыгавор.

Калі прыгавор прыводзіцца ў выкананне па-за раёнам дзейнасці суда, які пастанавіў прыгавор, гэтыя пытанні вырашаюцца аднайменным судом, а пры адсутнасці ў раёне выканання прыгавору аднайменнага суда — вышэйстаячым судом. У гэтым выпадку копія вызначэння накіроўваецца суду, які пастанавіў прыгавор.

Пытанні аб вызваленні ад адбывання пакарання па хваробе, аб умоўна-датэрміновым або датэрміновым вызваленні ад пакарання, аб замене неадбытай часткі пакарання больш мяккім пакараннем, аб замене турэмнага зняволення адбываннем пакарання ў папраўча-працоўнай калоніі і адбывання пакарання ў папраўча-працоўнай калоніі турэмным зняволеннем вырашаюцца вызначэннем раённага (гарадскога) народнага суда па месцу адбывання пакарання, незалежна ад таго, якім судом быў вынесены прыгавор.

Артыкул 377. **Парадак вырашэння пытанняў, звязаных з выкананнем прыгавору**

Пытанні, звязаныя з выкананнем прыгавору, вырашаюцца судом у судовым пасяджэнні з удзелам пракурора.

У пасяджэнне, як правіла, выклікаецца асуджаны. Калі пытанне датычыць выканання прыгавору ў частцы грамадзянскага іску, выклікаецца таксама грамадзянскіісцец. Няяўка асуджанага або грамадзянскага істца не спыняе разгляду справы.

Пры вырашэнні судом пытання аб вызваленні асуджанага па хваробе або змяшчэнні яго ў бальніцу абавязкова прысутнасць прадстаўніка ўрачэбнай камісіі, якая дала заключэнне.

Пры разглядзе судом пытання аб умоўна-датэрміновым або датэрміновым вызваленні ад пакарання, аб замене неадбытай часткі пакарання больш мяккім, а таксама аб замене турэмнага зняволення адбываннем пакарання ў папраўча-працоўнай калоніі і адбывання пакарання ў папраўча-працоўнай калоніі турэмным зняволеннем выклікаецца прадстаўнік установы, на якую ўскладзена выкананне прыгавору, а таксама запрашаецца прадстаўнік Наглядальнай камісіі пры выканаўчым камітэце раённага, гарадскога Савета дэпутатаў працоўных.

У тых выпадках, калі справа разглядаецца судом па прадстаўленню Камісіі па справах непаўналетніх, суд паведамляе гэтай камісіі аб часе і месцы разгляду хадайніцтва.

Разгляд справы пачынаецца дакладам старшынствуючага, пасля чаго суд заслухоўвае асоб, якія з'явіліся ў пасяджэнне, і заключэнне пракурора. Затым суд ідзе на нараду для вынясення вызначэння.

Артыкул 378. **Разгляд судамі хадайніцтваў аб зняцці судзімасці**

Хадайніцтвы аб зняцці судзімасці, у адпаведнасці з артыкулам 54 Крымінальнага кодэкса Беларускай ССР, разглядаюцца раённымі (гарадскімі) народнымі судамі па месцы пражывання асоб, адбыўшых пакаранне.

Суды разглядаюць пытанне аб зняцці судзімасці ў адносінах да асоб, асуджаных да пазбаўлення волі на тэрмін звыш дзесяці год, па хадайніцтву асобы, якая адбыла пакаранне, або па хадайніцтву грамадскіх арганізацый, а аб датэрміно-

вым зняцці судзімасці — па хадайніцтву грамадскіх арганізацый.

Хадайніцтвы разглядаюцца судом у адкрытым судовым пасяджэнні без выпатрабавання судовай справы, з выклікам асуджанага, з удзелам пракурора і, у неабходных выпадках, прадстаўніка грамадскай арганізацыі, якая ўзбудзіла хадайніцтва.

Разгляд хадайніцтваў аб зняцці судзімасці пачынаецца дакладам старшынствуючага, пасля чаго суд разглядае наяўныя дакументы, заслухоўвае выкліканых асоб і заключэнне пракурора.

Паўторнае хадайніцтва аб зняцці судзімасці можа быць узбуджана не раней як праз год з дня вынясення вызначэння аб адмове.

Артыкул 379. **Разгляд хадайніцтваў аб уключэнні часу адбывання папраўчых работ у працоўны стаж**

Хадайніцтвы аб уключэнні часу адбывання папраўчых работ у працоўны стаж, у адпаведнасці з артыкулам 27 Крымінальнага кодэкса Беларускай ССР, разглядаюцца судом, які пастанавіў прыгавор, па правілах, выкладзеных у артыкуле 378 гэтага Кодэкса.

Хадайніцтвы аб уключэнні часу адбывання папраўчых работ у працоўны стаж могуць быць заяўлены на працягу года пасля адбывання папраўчых работ.

# РАЗДЗЕЛ СЁМЫ

# ПЕРАГЛЯД ПРЫГАВОРАЎ, ВЫЗНАЧЭННЯЎ І ПАСТАНОЎ, ШТО ЎВАЙШЛІ Ў ЗАКОННУЮ СІЛУ

## ГЛАВА 33

## ПЕРАГЛЯД СПРАВЫ Ў ПАРАДКУ СУДОВАГА НАГЛЯДУ

Артыкул 380. **Перагляд у парадку судовага нагляду ўвайшоўшых у законную сілу прыгавору, вызначэння і пастановы суда**

Перагляд у парадку судовага нагляду ўвайшоўшых у законную сілу прыгавору, вызначэння і пастановы суда дапус-

каецца толькі па пратэсту пракурора, старшыні суда і іх намеснікаў, пералічаных у гэтым артыкуле.

Пратэсты падаюць:

1) Генеральны Пракурор СССР—на прыгаворы, вызначэнні і пастановы любога суда Беларускай ССР;

2) Старшыня Вярхоўнага Суда СССР—на пастановы Пленума, а таксама на прыгаворы судовай калегіі па крымінальных справах Вярхоўнага Суда Беларускай ССР;

3) Намеснікі Генеральнага Пракурора СССР — на прыгаворы, вызначэнні і пастановы любога суда Беларускай ССР, за выключэннем пастаноў Пленума Вярхоўнага Суда Беларускай ССР;

4) Намеснікі Старшыні Вярхоўнага Суда СССР — на прыгаворы судовай калегіі па крымінальных справах Вярхоўнага Суда Беларускай ССР;

5) Пракурор Беларускай ССР, Старшыня Вярхоўнага Суда Беларускай ССР і іх намеснікі — на прыгаворы, вызначэнні і пастановы любога суда Беларускай ССР, за выключэннем пастаноў Пленума Вярхоўнага Суда Беларускай ССР;

6) Старшыня абласнога суда, пракурор вобласці — на прыгаворы і вызначэнні раённага (гарадскога) народнага суда і вызначэнні судовай калегіі па крымінальных справах абласнога суда, які разглядаў справу ў касацыйным парадку.

Пратэсты на прыгаворы ваенных трыбуналаў падаюцца ў парадку, устаноўленым артыкуламі 20 і 21 Палажэння аб ваенных трыбуналах.

Асоба, якая падала пратэст, мае права яго адклікаць. Пратэст, пададзены пракурорам, можа быць адкліканы вышэйстаячым пракурорам. Адкліканне пратэсту дапускаецца толькі да пачатку яго разгляду ў судовым пасяджэнні.

### Артыкул 381. **Прыпыненне выканання прыгавору, вызначэння, пастановы суда**

У адпаведнасці з артыкулам 48 Асноў крымінальнага судаводства Саюза ССР і саюзных рэспублік, Генеральны Пракурор СССР, Старшыня Вярхоўнага Суда СССР, іх намеснікі, Галоўны ваенны пракурор і Старшыня Ваеннай калегіі Вярхоўнага Суда СССР, у адпаведнасці з іх кампетэнцыяй, маюць права прыпыніць да вырашэння справы ў парадку судовага нагляду выкананне апратэставанага прыгавору, вызначэння і пастановы суда.

Пракурор Беларускай ССР і Старшыня Вярхоўнага Суда Беларускай ССР маюць права прыпыніць да вырашэння

справы ў парадку судовага нагляду выкананне апратэставанага прыгавору, вызначэння і пастановы любога суда Беларускай ССР, апрача пастановы Пленума Вярхоўнага Суда Беларускай ССР.

**Артыкул 382. Пратэст у парадку судовага нагляду на мяккасць пакарання, спыненне справы або апраўдальны прыгавор**

Перагляд у парадку судовага нагляду абвінаваўчага прыгавору, вызначэння і пастановы суда па матывах мяккасці пакарання або неабходнасці прымянення да асуджанага закону аб больш цяжкім злачынстве, а таксама апраўдальнага прыгавору або вызначэння ці пастановы суда аб спыненні справы дапускаецца толькі на працягу года пасля ўваходжання іх у законную сілу.

**Артыкул 383. Суды, якія разглядаюць справы па пратэстах у парадку нагляду**

Прэзідыум абласнога суда разглядае справы па пратэстах на касацыйныя вызначэнні гэтага суда і на ўвайшоўшыя ў законную сілу прыгаворы раённых (гарадскіх) народных судоў.

Судовая калегія па крымінальных справах Вярхоўнага Суда Беларускай ССР разглядае справы па пратэстах на пастановы прэзідыумаў абласных судоў, а таксама прыгаворы і вызначэнні абласных судоў, калі яны не былі прадметам касацыйнага разгляду ў Вярхоўным Судзе Беларускай ССР.

Пленум Вярхоўнага Суда Беларускай ССР разглядае справы па пратэстах на прыгаворы і вызначэнні судовай калегіі па крымінальных справах Вярхоўнага Суда Беларускай ССР.

Апрача таго, прэзідыум абласнога суда разглядае пратэсты на вызначэнні раённых (гарадскіх) народных судоў і пастановы суддзяў гэтых судоў, якія ўвайшлі ў законную сілу.

Калі ў разглядзе данай справы ў судзе першай інстанцыі або ў касацыйнай інстанцыі прымала ўдзел большасць членаў прэзідыума абласнога суда, старшыня абласнога суда або пракурор вобласці, якія падалі пратэст, накіроўваюць справу адпаведна Старшыні Вярхоўнага Суда Беларускай ССР або Пракурору Беларускай ССР для абмеркавання пытання аб падачы пратэсту ў парадку судовага нагляду ў судовую калегію па крымінальных справах Вярхоўнага Суда Беларускай ССР.

У тых жа выпадках, калі такая справа павінна была быць разгледжана ў прэзідыуме абласнога суда па пратэсту Генеральнага Пракурора СССР, Старшыні Вярхоўнага Суда Беларускай ССР, Пракурора Беларускай ССР або іх намеснікаў, яна перадаецца на разгляд у парадку судовага нагляду ў судовую калегію па крымінальных справах Вярхоўнага Суда Беларускай ССР.

Артыкул 384. **Выпатрабаванне справы**

Асобы, указаныя ў артыкуле 380 гэтага Кодэкса, маюць права выпатрабаваць у межах сваёй кампетэнцыі любую крымінальную справу для вырашэння пытання аб прынясенні пратэсту на ўвайшоўшыя ў законную сілу прыгавор, вызначэнне або пастанову суда.

Права выпатрабавання справы з раённых (гарадскіх) народных судоў належыць таксама пракурорам раёнаў (гарадоў), якія ў неабходных выпадках уносяць вышэйстаячаму пракурору прадстаўленне аб падачы пратэсту ў парадку судовага нагляду.

Артыкул 385. **Прыняцце рашэння па выпатрабаванай справе**

Убачыўшы, што прыгавор, вызначэнне або пастанова суда па выпатрабаванай справе з'яўляецца незаконнай або неабгрунтаванай, асоба, указаная ў артыкуле 380 гэтага Кодэкса, падае пратэст і накіроўвае справу з пратэстам у адпаведную наглядную інстанцыю.

У выпадку, калі асоба, якая выпатрабавала справу, не выявіла ў ёй падстаў для падачы пратэсту, яна паведамляе аб гэтым асобе, установе або арганізацыі, па хадайніцтву якіх справа была выпатрабавана для праверкі, з указаннем матываў адмовы. Справа вяртаецца ў суд, з якога яна была выпатрабавана.

Артыкул 386. **Парадак разгляду справы па пратэсту**

Справа па пратэсту на ўвайшоўшыя ў законную сілу прыгавор, вызначэнне або пастанову разглядаецца нагляднай інстанцыяй у судовым пасяджэнні не пазней пятнаццаці сутак, а Пленумам Вярхоўнага Суда Беларускай ССР — не пазней месячнага тэрміну з моманту паступлення справы з пратэстам.

У разглядзе справы ў парадку судовага нагляду прымае ўдзел:

1) у прэзідыуме абласнога суда — пракурор вобласці;

2) у судовай калегіі па крымінальных справах Вярхоўнага Суда Беларускай ССР — пракурор, упаўнаважаны Пракурорам Беларускай ССР;

3) у Пленуме Вярхоўнага Суда Беларускай ССР — Пракурор Беларускай ССР або яго намеснік.

Суд, які разглядае справу ў парадку судовага нагляду, у неабходных выпадках мае права выклікаць у судовае пасяджэнне асуджанага.

Справа дакладваецца старшынёй суда або па яго назначэнню членам прэзідыума ці членам суда, які раней не ўдзельнічаў у разглядзе справы. Дакладчык выкладае акалічнасці справы, змест прыгавору, вызначэння і пастановы, змест пратэсту. Дакладчыку могуць быць зададзены пытанні. Калі ў судовым пасяджэнні ўдзельнічае асуджаны, то ён мае права пасля даклада суддзі даваць свае вусныя тлумачэнні.

Затым даецца слова пракурору для падтрымання пададзенага ім пратэсту або для дачы заключэння па пратэсту старшыні суда або яго намесніка, пасля чаго прэзідыум абласнога суда або Пленум Вярхоўнага Суда Беларускай ССР выносяць пастанову, а судовая калегія па крымінальных справах — вызначэнне, якія прымаюцца большасцю галасоў. Вызначэнне судовай калегіі па крымінальных справах складаецца ў дарадчым пакоі. Пры роўнасці галасоў пратэст, разгледжаны ў прэзідыуме абласнога суда або ў Пленуме Вярхоўнага Суда Беларускай ССР, лічыцца адхіленым.

Артыкул 387. **Вызначэнні і пастановы суда, які разглядае пратэст**

У выніку разгляду справы ў парадку нагляду суд можа:

1) пакінуць пратэст без задавальнення;

2) адмяніць прыгавор і ўсе наступныя судовыя вызначэнні і пастановы і спыніць справу судаводствам або перадаць яе на новае расследаванне ці новы судовы разгляд;

3) адмяніць касацыйнае вызначэнне, а таксама наступныя судовыя вызначэнні і пастановы, калі яны былі вынесены, і перадаць справу на новы касацыйны разгляд;

4) адмяніць вызначэнні і пастановы, вынесеныя ў парадку судовага нагляду, і пакінуць у сіле, са змяненнем або без змянення, прыгавор суда і касацыйнае вызначэнне;

5) унесці змяненні ў прыгавор, вызначэнне або пастанову суда.

Артыкул 388. **Падставы да адмены або змянення ўвайшоўшых у законную сілу прыгавору, вызначэння і пастановы суда**

Падставамі да адмены або змянення прыгавору пры разглядзе справы ў парадку судовага нагляду з'яўляюцца акалічнасці, указаныя ў артыкуле 350 гэтага Кодэкса.

Вызначэнні суда першай інстанцыі, пастановы суддзі, вызначэнні касацыйнай інстанцыі, вызначэнні і пастановы нагляднай інстанцыі павінны быць адменены або зменены, калі суд, які разглядае пратэст, прызнае, што гэтым вызначэннем або пастановай вынесена незаконнае або неабгрунтаванае рашэнне судом першай інстанцыі, беспадстаўна пакінуты без змянення, адменены або зменены вышэйстаячым судом ранейшыя вызначэнні, пастановы або прыгавор па справе, або калі пры разглядзе справы ў вышэйстаячым судзе былі дапушчаны парушэнні закону, якія зрабілі або маглі зрабіць уплыў на правільнасць вынесенага ім вызначэння ці пастановы.

Артыкул 389. **Межы правоў нагляднай інстанцыі**

Пры разглядзе пратэсту ў парадку судовага нагляду суд не звязан довадамі пратэсту і абавязан праверыць усё судаводства па справе ў поўным аб'ёме. Калі па справе асуджана некалькі асоб, а пратэст пададзен у адносінах да аднаго або часткі асуджаных, суд абавязан праверыць справу ў адносінах да ўсіх асуджаных.

Суд пры разглядзе справы ў парадку судовага нагляду можа змякчыць назначанае асуджанаму пакаранне або прымяніць закон аб менш цяжкім злачынстве, але не мае права ўзмацніць пакаранне, а таксама прымяніць закон аб больш цяжкім злачынстве.

Прызнаўшы няправільным апраўданне падсуднага або спыненне справы ў судзе першай ці касацыйнай інстанцыі, таксама як назначэнне асуджанаму пакарання, якое па сваёй мяккасці не адпавядае ўчыненаму, суд нагляднай інстанцыі мае права з захаваннем умоў, устаноўленых у артыкуле 382 гэтага Кодэкса, адмяніць прыгавор або вызначэнне і накіраваць справу для новага разгляду адпаведна ў суд першай ці касацыйнай інстанцыі.

Пры гэтым, вяртаючы справу ў суд першай інстанцыі, суд нагляднай інстанцыі павінен указаць стадыю, з якой справа вяртаецца на новы разгляд.

Калі неабгрунтаванае спыненне справы або незаконнае змякчэнне пакарання асуджанаму было дапушчана пры разглядзе справы ў парадку нагляду, вышэйстаячая наглядная інстанцыя мае права адмяніць вызначэнне або пастанову ніжэйстаячай нагляднай інстанцыі і пакінуць без змен прыгавор суда першай інстанцыі або вызначэнне касацыйнай інстанцыі.

У выпадку, калі па справе асуджана або апраўдана некалькі падсудных, суд не мае права адмяніць прыгавор, вызначэнне або пастанову ў частцы тых апраўданых або асуджаных, адносна якіх пратэст не ўносіцца, калі адмена прыгавору, вызначэння або пастановы пагаршае іх становішча.

Артыкул 390. **Абавязковасць указанняў суда, які разглядае справу ў парадку нагляду**

Указанні суда, які разглядае справу ў парадку судовага нагляду, абавязковыя пры дадатковым расследаванні і пры паўторным разглядзе справы судом.

Суд, які разглядае справу ў парадку судовага нагляду, не мае права ўстанаўліваць або лічыць даказанымі факты, якія не былі ўстаноўлены ў прыгаворы або адхілены ім, а таксама не мае права прадрашаць пытанні аб даказанасці або недаказанасці абвінавачання, аб дакладнасці або недакладнасці таго ці іншага доказу і аб перавагах адных доказаў перад іншымі, аб прымяненні судом першай інстанцыі таго ці іншага крымінальнага закону і аб меры пакарання.

Гэтак жа сама суд пры разглядзе справы ў парадку судовага нагляду, адмяняючы касацыйнае вызначэнне, не мае права прадрашаць вывады, якія могуць быць зроблены касацыйнай інстанцыяй пры паўторным разглядзе справы.

Артыкул 391. **Змест вызначэння або пастановы**

Пастанова, вынесеная пры разглядзе справы прэзідыумам абласнога суда, або вызначэнне судовай калегіі па крымінальных справах Вярхоўнага Суда Беларускай ССР у парадку судовага нагляду павінна адпавядаць патрабаванням артыкула 359 гэтага Кодэкса.

Вызначэнне падпісваецца ўсім складам суда, а пастанова — старшынствуючым у пасяджэнні прэзідыума.

Вызначэнне або пастанова суда далучаецца да справы разам з пратэстам.

Артыкул 392. **Разгляд справы пасля адмены першапачатковага прыгавору**

Пасля адмены першапачатковага прыгавору справа павінна быць разгледжана ў агульным парадку.

Узмацненне пакарання або прымяненне закону аб больш цяжкім злачынстве пры новым разглядзе справы судом першай інстанцыі дапускаецца толькі пры ўмове, калі першапачатковы прыгавор быў адменены ў парадку нагляду з-за мяккасці пакарання або ў сувязі з неабходнасцю прымянення закону аб больш цяжкім злачынстве, а таксама калі пры новым расследаванні справы пасля адмены прыгавору будуць устаноўлены акалічнасці, якія сведчаць аб учыненні абвінавачваемым больш цяжкага злачынства.

ГЛАВА 34

## АДНАЎЛЕННЕ СПРАЎ ПА НОВААДКРЫТЫХ АКАЛІЧНАСЦЯХ

Артыкул 393. **Падставы аднаўлення спраў па новаадкрытых акалічнасцях**

Увайшоўшыя ў законную сілу прыгавор, вызначэнне і пастанова суда могуць быць адменены па новаадкрытых акалічнасцях.

Падставамі для аднаўлення крымінальнай справы па новаадкрытых акалічнасцях з'яўляюцца:

1) устаноўленая ўвайшоўшым у законную сілу прыгаворам суда заведамая ілжывасць паказанняў сведкі або заключэння эксперта, а таксама падложнасць рэчавых доказаў, пратаколаў следчых і судовых дзеянняў і іншых дакументаў або заведамая ілжывасць перакладу, якія выклікалі пастанаўленне неабгрунтаванага або незаконнага прыгавору;

2) устаноўленыя ўвайшоўшым у законную сілу прыгаворам суда злачынныя злоўжыванні суддзяў, дапушчаныя імі пры разглядзе данай справы;

3) устаноўленыя ўвайшоўшым у законную сілу прыгаворам суда злачынныя злоўжыванні асоб, якія праводзілі расследаванне па справе, выклікаўшыя пастанаўленне неабгрунтаванага і незаконнага прыгавору або вызначэння суда аб спыненні справы;

4) іншыя акалічнасці, невядомыя суду пры пастанаўленні

прыгавору або вызначэння, якія самі па сабе або разам з акалічнасцямі, раней устаноўленымі, даказваюць невінаватасць асуджанага або ўчыненне ім менш цяжкага ці больш цяжкага злачынства, чым тое, за якое ён асуджан, а таксама даказваюць вінаватасць апраўданага або асобы, адносна якой справа была спынена.

Пры немагчымасці вынесці прыгавор з-за сканчэння тэрмінаў даўнасці, выдання акта амністыі або з прычыны памілавання паасобных людзей, а таксама з прычыны смерці абвінавачваемага новаадкрытыя акалічнасці, указаныя ў пунктах 1—3 гэтага артыкула, устанаўліваюцца расследаваннем, якое праводзіцца ў парадку, прадугледжаным артыкулам 396 гэтага Кодэкса.

### Артыкул 394. **Тэрміны аднаўлення спраў па новаадкрытых акалічнасцях**

Перагляд апраўдальнага прыгавору, вызначэння і пастановы суда аб спыненні справы, а таксама перагляд абвінаваўчага прыгавору, вызначэння і пастановы суда па матывах мяккасці пакарання або неабходнасці прымянення да асуджанага закону аб больш цяжкім злачынстве дапускаецца толькі на працягу тэрмінаў даўнасці прыцягнення да крымінальнай адказнасці, устаноўленых артыкулам 46 Крымінальнага кодэкса Беларускай ССР, і не пазней аднаго года з дня адкрыцця новых акалічнасцей.

Перагляд абвінаваўчага прыгавору па новаадкрытых акалічнасцях у карысць асуджанага тэрмінамі не абмежаван.

Смерць асуджанага не перашкаджае аднаўленню аб ім справы па новаадкрытых акалічнасцях з мэтай рэабілітацыі гэтага асуджанага.

### Артыкул 395. **Узбуджэнне судаводства па новаадкрытых акалічнасцях**

Заявы грамадзян, паведамленні ўстаноў, прадпрыемстваў, арганізацый і службовых асоб аб новаадкрытых акалічнасцях накіроўваюцца пракурору.

Пры наяўнасці адной з падстаў, прадугледжаных артыкулам 393 гэтага Кодэкса, пракурор у межах сваёй кампетэнцыі выносіць пастанову аб узбуджэнні судаводства па новаадкрытых акалічнасцях і праводзіць расследаванне гэтых акалічнасцей або дае аб гэтым даручэнне следчаму. Пры расследа-

ванні новаадкрытых акалічнасцей могуць праводзіцца з захаваннем правіл гэтага Кодэкса допыты, агляды, экспертызы, выняцці і іншыя неабходныя следчыя дзеянні.

Калі пракурор не бачыць падстаў для ўзбуджэння судаводства па новаадкрытых акалічнасцях, ён адмаўляе ў гэтым сваёй матываванай пастановай. Пастанова пракурора павінна быць даведзена да ведама зацікаўленых асоб, устаноў, прадпрыемстваў або арганізацый, якія могуць абскардзіць яе вышэйстаячаму пракурору.

Артыкул 396. **Дзеянні пракурора пасля заканчэння расследавання новаадкрытых акалічнасцей**

Пасля заканчэння расследавання новаадкрытых акалічнасцей пры наяўнасці падстаў для аднаўлення справы пракурор накіроўвае справу з матэрыяламі расследавання і сваім заключэннем праз адпаведнага вышэйстаячага пракурора ў суд, кіруючыся пры гэтым правіламі артыкула 397 гэтага Кодэкса.

Пры адсутнасці падстаў да аднаўлення справы пракурор сваёй матываванай пастановай спыняе судаводства. Гэтая пастанова павінна быць даведзена да ведама зацікаўленых асоб, устаноў, прадпрыемстваў або арганізацый, якія могуць яе абскардзіць вышэйстаячаму пракурору.

Артыкул 397. **Вырашэнне судом пытання аб аднаўленні справы па новаадкрытых акалічнасцях**

Справы па новаадкрытых акалічнасцях аднаўляюцца:

1) у адносінах да прыгавораў і вызначэнняў раённых (гарадскіх) народных судоў—прэзідыумам абласнога суда;

2) у адносінах да прыгавораў, вызначэнняў і пастаноў абласных судоў — судовай калегіяй па крымінальных справах Вярхоўнага Суда Беларускай ССР;

